## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.**

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

***Заставайцеся з намі!***



WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ВЕРАСНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 186
(26794)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


Пытальнік

## ДЗЕ ВЯСКОЎЦУ ЗНАЙСЦІ ВЕТУРАЧА ДЛЯ КАРОВЫ-КАРМІЦЕЛЬКІ?

***Паважаная рэдакцыя газеты «Звязда»! Я з'яўляюся даўняй падпісчыцай, магчыма, ужо гадоў 20. У мяне вельмі важнае пытанне, на якое ў вас ёсць магчымасць кампетэнтна адказаць. Я ўдава, жыву ў вёсцы, трымаю карову. Праўда, яна не маладая ўжо, аднак купіць іншую не маю сродкаў, бо каштуе карміцелька сёння 2-2,5 мільёна рублёў. А здаць сваю вельмі шкадую, можа, гады са два патрымаю яшчэ, калі будуць сілы, бо на сёмы дзясятак пайшло. Справа ў тым, што ўжо два гады карова вельмі хварэе... Але гэтая праблема не толькі ў мяне — сёлета шмат у каго ў вёсцы такая бяда. Штосьці ў арганізме ў каровак адбываецца не тое. Я прыгадваю, калі мае бацькі трымалі кароўку, дык такога не было. Парайце, калі ласка: можа перад ацёлам патрэбна ўводзіць якія лекі? Бо цяпер у вёсцы няма ветурача. Людзі будуць удзячныя за гэта, яны ж выпісваюць газету.***

**(Па просьбе заяўніцы прозвішча не называем),** *Мазырскі раён.*

Шаноўная чытачка, напэўна, пагодзіцца з намі, што даваць ветэрынарныя парады завочна, не ведаючы дакладнага дыягназу, — справа няўдзячная. Ды і няма ў журналістаў адпаведных ведаў, калі на тое пайшло. Гэтым павінны займацца прафесіяналы — тыя ж ветурачы, прычым, зноў жа — не паводле зместу ліста вясковай жанчыны, а пасля агляду яе каровы-карміцелькі. І газета тут можа дапамагчы хіба толькі тым, што паспрабуе знайсці патрэбных спецыялістаў. А зрабіць гэта аказалася і сапраўды не так проста — як і згадвала заяўніца. Не тое, каб такіх спецыялістаў не было ўвогуле, але на справе, як высветлілася, простаму чалавеку было над чым паламаць галаву ў выпадку неабходнасці... Ускладняла сітуацыю і забарона чытачкі называць яе прозвішча. Мы ўжо неаднойчы пісалі, што гэта не прымахаць рэдакцыі, а неабходнасць — так пошукі інфармацыі і вырашэнне клопатаў заяўнікаў ідуць хутчэй...

— Мы абслугоўваем грамадскі сектар, прыватнікі ў выпадку неабходнасці могуць звяртацца да ветурачоў сваіх гаспадарак. Бывае, праўда, што такога спецыяліста ў гаспадарцы няма, тады туды выязджаюць нашы работнікі. Жанчына можа звярнуцца на бліжэйшую да яе вёскі ферму «Белае», — некалькі дзівілася нашаму пытанню **загадчык лабараторыі ўстановы «Мазырская раённая ветэрынарная станцыя» Святлана КІЛБАС**.

Як мы потым дамовіліся са Святланай Паўлаўнай, калі нашай заяўніцы па якой-небудзь прычыне не пашчасціць знайсці патрэбнага спецыяліста бліжэй да дому, жанчына можа звярнуцца ў ветстанцыю. Паслугу ёй акажуць бясплатна.

— Ну што ж, калі трэба — знойдзем магчымасць, пад'едзем да вашай чытачкі, — таксама не адмовіў у просьбе **галоўны ветэрынарны ўрач рэспубліканскага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Эксперыментальная база «Крынічка» Уладзімір КУПРЭЁЎ**. — Хоць гэта не так і проста, бо клопатаў у нашых урачоў хапае. Ды і ехаць да той вёскі кіламетраў 15, значыць, патрэбен транспарт. На агляд каровы дзве-тры гадзіны спецыялісту спатрэбіцца. Два гады, кажаце, карова хварэе?.. Нейкі дзіўнаваты тэрмін. Трэба разабрацца. Знойдзем час, няхай звяртаецца: можаце даць жанчыне нумар майго тэлефона. І грошы за паслугу браць не будзем.

— З аднаго боку, за апошні час мы адчулі, наколькі ветслужба павярнулася да тых, хто трымае ў гаспадарцы карову: двойчы за год — увесну і ўвосень — праводзяцца плануемыя агляды жывёлы. Даецца аб'ява, што ў такім населеным пункце будуць працаваць ветурачы, уводзіць лекі, — патлумачылі нам у **Скрыгалаўскім сельскім Савеце**. — Аднак справа гэтая добраахвотная, таму ці вадзіла на такі агляд ваша заяўніца сваю рагулю — невядома. Як вы кажаце, жанчына прасіла не называць сваё прозвішча.

Як расказалі нам далей, пэўная праблема з ветабслугоўваннем усё ж ёсць. Паколькі прыватнікі павінны здаваць малако ў гаспадаркі, апошнія апроч іншага — ёсць такі пункт у паперах — павінны браць на сябе абавязкі па аказанні насельніцтву бясплатнай ветэрынарнай дапамогі. На справе ж часам выходзіць некалькі інакш. Як мы напісалі вышэй, і спецыялісты быццам ёсць, але і ў іх клопатаў дастаткова. Як людзі вырашаюць надзённую праблему? Ды проста. Спецыялісты, што некалі працавалі ў калгасах, засталіся, толькі зараз працуюць у іншых месцах. Вось да іх у прыватным парадку і звяртаюцца.

— Раней такіх праблем, калі быў свой калгас, не было. А потым правялі рэарганізацыю, аб'яднанне дзвюх гаспадарак у адну, потым ужо яе далучылі яшчэ да іншай. А каго далучаюць, да таго, напэўна, і ўвагі часам менш...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХОЙНІЦКІЯ СУВЯЗНЫЯ

Фота Анатоля КІПІШУКА.

Электраманцёр Хойніцкага прадпрыемства «Белтэлекам» Дзмітрый ЛІТОЎЧАНКА ліквідуе лінейныя пашкоджанні гарадской тэлефоннай сувязі. За ягонай працай сочыць колішні хойніцкі сувязіст Станіслаў ХАМУТОЎСКІ, які аддаў гэтай працы амаль чатыры дзясяткі гадоў.


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

**WWW.RLT.BY**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению ЧПТУП «Несвиж коопзаготпром» (продавец)**
проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: **г. Несвиж, ул. Ленинская, 126,** в составе: здание свинарника, об. пл. 1028,7 кв.м; зданий летнего лагеря для свиней, об. пл. 720,6 кв.м; об. пл. 254,8 кв.м.

**Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 222 359 400 бел. руб.**

Площадь земельного участка **1,6667 га.**

**Задаток 10 % от начальной цены.**

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2009.

Аукцион состоится **30.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 29.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**


## МАХЛЯР ПАДМАНВАЎ І ФУТБАЛІСТАЎ

**Адразу трыццаць крымінальных спраў узбуджана ў адносінах да 32-гадовага жыхара Полацка, які прадстаўляўся дырэктарам прыватнай фірмы, што займаецца дастаўкай аўто з-за мяжы і дапамагае суграмадзянам знайсці працу за мяжой. Сярод падманутых ёсць жыхары Віцебскай вобласці, а таксама Мінска і Мінскага раёна, а яшчэ грамадзянін Расіі.**

Як паведаміў «Звяздзе» Георгій Грынкевіч, начальнік аддзела па наглядзе за следствам у органах унутраных спраў пракуратуры Віцебскай вобласці, цікава тое, што махляр нават «займаўся» арганізацыяй праглядаў футбалістаў у футбольных клубах Германіі. Маўляў, там з імі потым змогуць заключыць вельмі выгодныя кантракты... Адпаведныя аб'явы размяшчаў у сеціве на адным з вядомых і папулярных рэкламных сайтаў.

Усяго падмануў каля сарака чалавек. І ніводнага са сваіх абяцанняў так і не выканаў. Даверлівыя кліенты за паслугі «бізнэсмену» разам заплацілі больш за 302 мільёны рублёў.

Злодзея затрымалі. Падчас папярэдняга расследавання ён часткова кампенсаваў страты — на суму звыш 28,5 мільёна рублёў. Накладзены арышт на яго маёмасць на суму больш за 125 мільёнаў рублёў.

Што яшчэ цікава, хітры чалавек заняўся падманам людзей адразу ж пасля таго, як у чарговы раз вызваліўся з-за дроту. Раней ён ужо чатыры разы адбываў пакаранне таксама за махлярства.


**ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ**

**КУПП «Витпекс»**

**(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м)**
**в г. Витебске**
**по ул. Володарского, 100.**

**ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.**

Информация на сайте:
**www.vitinvest.biz.**
**Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.**

УНП 300149863


Прамая лінія

## ЯК ЗМАГАЦЦА З «НЯПРАВІЛЬНЫМ» ЦІСКАМ?

На гэтае і іншыя пытанні адкажа падчас нашай чарговай «прамой лініі» **кандыдат медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Марыя Міхайлаўна ЛІВЕНЦАВА**.

«Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **24 верасня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

## Ацэнка насельніцтвам дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі

**Згодна з вынікамі апытання, праведзенага ў ліпені—жніўні 2010 г. Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, большасць грамадзян краіны (77,5%) лічыць, што пад кіраўніцтвам А.Р. Лукашэнкі Беларусь у цэлым развіваецца ў правільным кірунку (у кастрычніку 2009 г. так сцвярджалі 74%).**

Мяркуюць, што рэспубліка развіваецца ў няправільным кірунку, 14% апытаных (у 2009 годзе такіх было 17%).

Пераважная частка рэспандэнтаў (75%) сцвярджаюць, што дзейнасць цяперашняга Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адпавядае інтарэсам такіх людзей, як яны (у 2009 годзе гэта адзначалі 74%).

Пра тое, што дзейнасць кіраўніка дзяржавы не адпавядае інтарэсам такіх людзей, як яны, заявілі 18,5% удзельнікаў апытання (у кастрычніку 2009 г. столькі ж — 18,5%).

Найбольш удалай, на погляд рэспандэнтаў, была дзейнасць кіраўніка дзяржавы па такіх кірунках, як:

развіццё фізічнай культуры і спорту, прапаганда здаровага ладу жыцця — 92%;

навядзенне парадку ў краіне, забеспячэнне стабільнасці яе развіцця, умацаванне абароназдольнасці рэспублікі, будаўніцтва незалежнай беларускай дзяржавы і барацьба са злачыннасцю — больш за 70%;

сацыяльная абарона грамадзян, эканамічнае развіццё рэспублікі, супрацоўніцтва з іншымі краінамі СНД, павышэнне жыццёвага ўзроўню грамадзян — больш за 60%.

Рэспандэнты сцвярджаюць, што ў дзейнага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пераважаюць такія станоўчыя якасці, як:

актыўнасць — 43%;

блізкасць да народа, уменне разумець яго патрэбы — 41%;

уменне адстойваць інтарэсы краіны, розум, інтэлект — у сярэднім па 33%;

прафесіяналізм, рашучасць і смеласць, сумленнасць — у сярэднім па 26%.

Большасць грамадзян краіны (84%) упэўнена, што на выбарах, якія маюць адбыцца, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь будзе абраны А.Р. Лукашэнка.

## ДАВЕР НАСЕЛЬНІЦТВА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ САЦЫЯЛЬНЫМ ІНСТЫТУТАМ

**Сацыялагічнай службай Мінскай вобласці ў верасні 2010 г. было праведзена сацапытанне жыхароў рэгіёна.**

Згодна з атрыманымі звесткамі, найбольшым даверам у насельніцтва Міншчыны карыстаюцца прафсаюзы, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, — ім давяраюць 67,5% рэспандэнтаў. Прыкладна столькі ж апытаных давяраюць царкве — 65%. Самыя нізкія ўзроўні даверу ў апазіцыйных партый і незалежных прафсаюзаў — 5% і 16% адпаведна (*гл. дыяграму*).

Дыяграма

**У ЯКОЙ СТУПЕНІ ВЫ ДАВЯРАЕЦЕ НАСТУПНЫМ САЦЫЯЛЬНЫМ ІНСТЫТУТАМ?**

*(у % ад колькасці апытаных)*

Сярод апытаных большая частка (71,5%) лічыць, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў рэспубліцы паступова паляпшаецца або стабільная. І толькі 12% рэспандэнтаў указваюць на яе пагаршэнне.

Пры адказе на пытанне «Як змянілася Ваша матэрыяльнае становішча за апошні год?» трэць удзельнікаў апытання (31%) палічылі, што іх матэрыяльнае становішча не змянілася, палова (49%) адзначылі яго паляпшэнне. На пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча ўказалі толькі 16% апытаных.

Парламенцкая кухня

Пра палітыку са смакам

# МАМІНЫ СІБІРАКІ

### За лепкай пельменяў з ураджэнцам Расіі, беларускім дэпутатам Ігарам КАРПЕНКАМ, абмяркоўваем стасункі паміж дзвюма дзяржавамі

**У далёкім сібірскім краі, дзе зімы настолькі ж суровыя, наколькі гарачыя «леты», мастацкая «лепка» з цеста і мяса — гэта не проста побытавая неабходнасць, а цэлы рытуал. Добрая сямейная традыцыя. Выдатная магчымасць сабраць усіх сваякоў і прыемна бавіць час разам. За лепкай пельменяў і гутарка атрымліваецца асаблівая — нетаропкая, шчырая, разважлівая. Стараешся як найпрыгажэй аздобіць тыя камячкі, але робіш гэта не штучна, а з нейкім шчырым, непадробным задавальненнем. Так і гутарка цячэ: здаецца, рупліва, ашчадна падбіраеш словы, аднак яны ідуць ад душы.**

Пагадзіўшыся на кулінарныя эксперыменты са «Звяздой», **дэпутат Ігар КАРПЕНКА, другі сакратар ЦК КПБ**, з выбарам стравы доўга не вызначаўся. Сібірак вырашыў зрабіць... маміны пельмені. За іх прыгатаваннем ён назіраў з ранняга дзяцінства. Пакуль і сам не засвоіў смачную «навуку». Маці народнага абранніка ўжо даўно жыве ў Полацку, аднак сібірская традыцыя лепкі пельменяў у беларускай сям'і засталася непахіснай.

Шчаслівыя сужэнцы Ігар і Марыя КАРПЕНКІ не дзеляць абавязкі на жаночыя і мужчынскія. Галава сям'і, напрыклад, — прызнаны віртуоз у прыгатаванні пельменяў ды сібірскіх буракоў.

### Рэцэпт сямейнага шчасця

Для пельменяў строгага рэцэпту ў парламентарыя няма — гэта, на яго думку, і адрознівае мужчынскую «кухню» ад жаночай. «Мы ніколі не вылічваем да грама, усё на смак — пакідаем месца для творчасці». Па тым жа прынцыпе дэпутат не выкарыстоўвае падчас гатавання (сібірскіх буракоў, напрыклад, якія ў яго таксама атрымліваюцца — пальчыкі абліжаш) камбайнаў і іншай дапаможнай тэхнікі. «Так хоць і стругаецца больш аператыўна, але смак не той, — прызнаецца. — Тут усё ж душу ўкладваеш, энергетыку сваю перадаеш». Галоўныя інгрэдыенты — мяса (ялавічына напалам са свінінай), гародніна (цыбуля, часнок), спецыі (молатыя кмен, каляндра, чорны перац) і, натуральна ж, цеста. За яго ў сям'і Карпенкаў адказвае жонка Марыя:

— 2,5 шклянкі мукі прасеяць цераз сіта, зрабіць ямку, туды разбіць два яйкі, дадаць дробку солі і тры чвэрці шклянкі малака. Усё замясіць, накрыць сурвэткай і на паўгадзіны паставіць у халадзільнік.

І аўтамабілем кіруе выключна яна — у галавы сям'і нават пасведчання кіроўцы няма. «А навошта, калі мяне жонка возіць?» — кажа дэпутат. І насамрэч, чым дрэнна — многія мараць! Арыентавацца на мясцовасці ў яго атрымліваецца куды лепш, таму ў сямейным аўто ён штурман. Так што, яны адно без аднаго нікуды!

У астатнім падзелу на мужчынскія і жаночыя абавязкі Карпенкі не прызнаюць. Мо ў гэтым і ёсць сакрэт сямейнай гармоніі?.. Сына Лёшу, які нарадзіўся ў іх падчас вучобы ва ўніверсітэце, таксама гадавалі разам — у перапынках паміж штудзіраваннем падручнікаў. Маладая матуля ў акадэмку не хадзіла (ды і ўвогуле па жыцці кар'ерай не ахвяравала, працуе цяпер у Міністэрстве адукацыі). Толькі падчас дзяржіспытаў малога «здалі» бабулі. У астатнім абыходзіліся без дапамогі. На жыллё зараблялі самі, ледзь не палову сумеснага жыцця пражыўшы ў інтэрнаце. Пакрысе назбіралі на аднапакаёвую маласямейку. З цягам часу разжыліся трохпакаёўкай. Котку завялі. Імя ў дымчатай прыгажуні царскае — Лізавета, парода таксама паважная — брытанская каратакашэрсная. І стаўленне да яе адпаведнае. «Яна ўжо 11 год з намі, мы ўсё ёй дазваляем», — ківаючы ў бок падрапанага крэсла, з даравальнай лёгкасцю і заспакаеннем кажуць Карпенкі...

Так і жывуць душа ў душу ўжо 23 гады. І цудоўна адзін аднаго дапаўняюць. Ён — халерык, для якога няма горшага выпрабавання, чым манатоннасць. Яна — памяркоўная, мяккая. Цікаўлюся тым, што хвалюе мяне саму, — як можна пражыць плячо ў плячо столькі часу і не надакучыць адно аднаму? Увага, рэцэпт сямейнага шчасця ад пары Карпенкаў:

— Не трэба думаць, што, жаніўшыся, ты атрымаў мужа ці жонку ва ўласнасць. Так, мы адна сям'я, аднак дзве розныя асобы, з уласнымі інтарэсамі, захапленнямі, сябрамі і сяброўкамі.

СТАР. 2

## ПАКАРАЛІ НЕЗАКОННА ЗА... БУЛЬБУ

Або без віны вінаватыя

**Пракуратурай Аршанскага раёна падчас правядзення праверак прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу вывучаліся загады наймальнікаў.**

Установлена, што загадам дырэктара РУПС «Эксперыментальная база «Усце» ажно адзінаццаць рабочых паляводчай брыгады прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці: ім зрабілі вымовы, а таксама іх пазбавілі законных даплат на 100 працэнтаў за невыкананне працы па сарціроўцы бульбы ў выхадныя дні.

Як расказала **пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці Вольга ГРЫЦКЕВІЧ**, пры вывучэнні адпаведных артыкулаў Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у пракуратуры зрабілі выснову, што адпаведныя патрабаванні кодэкса ў гэтым выпадку не былі выкананыя поўнасцю. І ў гэтай сувязі на незаконныя загады былі вынесеныя пратэсты. Патрабаванні пракуратуры здаволеныя і незаконныя загады адмененыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Падпіска-2010

## ПРЫЗАВАЯ «ЛІХАМАНКА» ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Чым менш часу застаецца да заканчэння падпісной кампаніі на 4-ы квартал 2010 года, тым часцей газета «Звязда» з'яўляецца на «людзях» з надзвычай важнай місіяй — уручэннем каштоўных прызоў на месцах тым шчасліўчыкам, каму ўсміхнулася ўдача ў апошнім розыгрышы. Акрамя таго, мы стараемся заглянуць, хоць ненадоўга, у самыя аддаленыя куткі нашай краіны, калі маршрут паездкі дазваляе гэта зрабіць.

Адзін з апошніх падпісных «акордаў» ладзіўся адразу ў тры вобласці, што зусім не дзіўна: як-ніяк, а ў аўтамабілі былі два каляровыя тэлевізары «Віцязь», электрапрас і цеплавентылятар. Калі ўлічыць, што да камплекту можна яшчэ далучыць насценныя і настольныя гадзіннікі з фірменным лагатыпам «Звязды», фірмовыя майкі, кепкі, блакноты, календары, то прызавы фонд — неблагі.

Двухдзённы ваяж адкрываўся наведваннем Мар'інай Горкі. Хоць тут афіцыйна прыз, які мы выдаём па накладной, не значыўся, але ж візіт ветлівасці меў на ўвазе кароткую размову з работнікамі ідэалагічнага фронту і пошты. На развітанне — майкі-кепкі, і рухаемся далей. Хоць, шчыра прызнаемся, нават з немалым вопытам ваджэння аўтамабіля і адведным чытаннем дарожным знакаў, заехаць і выехаць у адміністрацыйны цэнтр Пухавіцкага раёна — справа не з лёгкіх. Відавочна, што нашы дарожнікі спецыяльна «ўпрыгожваюць» нашы дарогі так, што блытацца можна даволі доўга, і гэта з раніцы пры поўнай бачнасці.

СТАР. 2


**БЕЛАРУСБАНК**

ОАО «Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк»
**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 7 ОКТЯБРЯ 2010 ГОДА 74-го ТИРАЖА ВЫИГРЫШЕЙ ПО ВЫИГРЫШНЫМ ВКЛАДАМ В БЕЛОРУССКИХ РУБЛЯХ**
в филиале № 529 ОАО «АСБ Беларусбанк»
по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 56 (конференц-зал).
Начало тиража в 11.00.
**Телефон для справок: 8 801 100 54 54 (бесплатный номер).**

**Проценты, выплаченные по различным видам вкладов, депозитов в течение 2009 г., млн. бел. руб.**

| январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 65380,5 | 84821,5 | 99934,1 | 97189,8 | 74575,8 | 104240,6 | 87728,7 | 89863,7 | 93977,5 | 82045,6 | 103608,1 | 183630,6 | 1166996,5 |

Информация о процентах, выплаченным по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам, размещена на информационных стендах в подразделениях банка и на сайте: www.belarusbank.by. Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*



ISSN 1990 - 763X


**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.09.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 023,00 | 1 чэшская крона | 162,80 |
| ▲ 1 еўра | 4 021,80 | 1 польскі злоты | 1017,69 |
| 1 латвійскі лат | 5 657,34 | ▲ 1 расійскі рубель | 97,57 |
| 1 літоўскі літ | 1 162,20 | 1 украінская грыўня | 380,85 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,9826 |
| 10 UAH | 39,0209 |
| 1000 BYR | 10,2219 |
| EUR | 41,2254 |

Агенцтва Уладзіміра Грыцова

## ДЗЕ МЕРЫН?

На гэтае пытанне не можа адказаць рабочы малочнатаварнай фермы КСУП «Новыя Журавічы», які ноччу самавольна ўзяў каня з пашы, каб выканаць пэўныя работы па гаспадарцы. Але ж стан мужчыны пасля ўжывання моцных напояў быў такі, што ён не можа ўспомніць, пры якіх абставінах знікла гаспадарская жывёла.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПРЫЗАВАЯ «ЛІХАМАНКА»...

Праўда, гэтыя няўвязкі з інфармацыйнымі знакамі, якія, на жаль, нас суправаджалі па ўсім маршруце, не сталі перашкодай, каб спазніцца ў Асіповічы. Пад штурманскім кіраваннем кіраўніка ідэалагічнага аддзела райвыканкама Ганны Землянухінай, мы дакладна знайшлі галоўны вузел паштовай сувязі. Яе начальнік Валерыя Матузава з задавальненнем склала кампанію для афіцыйнага фота нашай даўняй падпісчыцы Ганне Бародзіч (справа — на **фота 1**). Адметна, што Ганна Сцяфанаўна ў «Звяздзе» выйгравала ўжо шмат чаго, у тым ліку і тэлевізар. Таму цяперашні «Віцязь» вырашыла падарыць дачцэ Вікторыі. Праўда, мы дапамаглі ёй даставіць каштоўны прыз на месца з умовай, што Вікторыя Сямёнаўна стане новай падпісчыцай старэйшага беларускамоўнага выдання. Спадзяёмся, што так яно і будзе.

У Бабруйску хоць і не было феерверкаў у гонар нашага прыезду — прызы на гэты раз абышлі гэты буйны раённы цэнтр бокам — тым не менш сустрэчы ў гарадскім і раённых выканкамах, пошце аказаліся надзвычай плённымі, пасля чаго засталося адчуванне, што тут з падпіскай на газету будзе ўсё ў парадку.

Аптымізмам была прасякнута і сустрэча на Жлобінскім раённым вузле сувязі з нагоды ўручэння каляровага тэлевізара «Віцязь» жыхарцы вёскі Радуша Алене Арэшка (**фота 2**). Поўнае садзейнічанне ва ўручэнні каштоўнага прыза нашай падпісчыцы, якая зараз адна выхоўвае двух дарослых дзяцей, аказалі намеснік начальніка аддзела ідэалогіі Марына Раманенка і начальнік РВПС Ніна Ражкова, за што ім бязмежнае дзякуй!

Бадай, найбольш ёмкім па часе стаў прыпынак у Гомелі. Задушэўная размова аб справах надзённых, у тым ліку і аб падпісцы на «Звязду», з намеснікам старшыні аблвыканкама Баляславам Піршткуком была працягнута ў кабінеце начальніка абласнога ДАІ, падпалкоўніка міліцыі Ігара Макушэнкі — нядаўна ён быў госцем у спецвыпуску «Радар». Куратар нашага знаходжання ў Гомелі — галоўны спецыяліст упраўлення ідэалогіі аблвыканкама Вольга Рабікава з веданнем справы і экскурсавода, і штурмана ў кароткі тэрмін даставіла нас у кабінет дырэктара «Гомельабласаюздрука» Васіля Кулыбы, якому быў перададзены каштоўны прыз — цеплавентылятар для кіяскёра з Лельчыцаў Вольгі Гаўрылавец. Яна стала ўладальнікам гэтага прыза ў сумесным конкурсе са «Звяздой». Некалькімі хвілінамі пазней мы заглянулі да кіраўніка Гомельскага філіяла «Белпошты» Галіны Цярэшчанкі. На развітанне — візіт да намесніка старшыні адміністрацыі Навабеліцкага раёна г. Гомеля Уладзіміра Прывалава. Ён не так даўно заняў гэтую пасаду, таму сяброўская падтрымка і прыз, насценны гадзіннік, — якраз тое, што трэба.

Апошнім часам эпіцэнтрам звяздоўскіх прызоў стаў Мазыр. Вось і на гэты раз мы паспяшаліся даставіць электрапрас нашай даўняй падпісчыцы Галіне Лісеенка. На жаль, стан здароўя не дазволіў ёй прыбыць на раённы вузел паштовай сувязі. Аднак нас зноў выручыла начальнік РВПС Галіна Рубан. У самы бліжэйшы час, запэўніла Галіна Аляксандраўна, каштоўны прыз, які яна прадэманстравала сваім супрацоўнікам, будзе дастаўлены наваспечанай гаспадыні (**фота 3**).

Другі дзень нашай паездкі паступова набліжаўся да заканчэння. Праўда, часу ўсё ж хапіла, каб засведчыць сваю прысутнасць перад ідэолагамі і паштавікамі ў Калінкавічах, Акцябрскім і Глуску.

З пачуццём задавальнення мы вярталіся дамоў праз Асіповічы. Як і ў пачатку паездкі, зноў прыйшлося гадаць на дарожных знаках, каб правільна выехаць на трасу з Глуска на Асіповічы, а адтуль — на Мінск. Вось ужо гэтыя эканомныя дарожнікі: у адзін бок знакі ўстаноўлены, у другі — ніводнага. Відавочна, што ў хуткім часе мы запросім увайсці ў склад выязных экіпажаў каго-небудзь з адказных асобаў дарожнага ведамства. Усё ж якарысць будзе, ды і, пэўна, што новых падпісчыкаў зможам прыдбаць.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Мінск — Мар'іна Горка — Асіповічы — Бабруйск — Жлобін — Гомель — Мазыр — Калінкавічы — Акцябрскі — Глуск — Мінск.*

## Цана на прыродны газ для Беларусі ў 2011 годзе можа ўзрасці на 10 працэнтаў

**Аб гэтым учора журналістам заявіў пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў, перадае БЕЛТА.**

«Чаго тут прагназаваць, калі падпісаны кантракт паміж «Газпрамам» і «Белтрансгазам» яшчэ ў 2007 годзе на пастаўку газу ў Беларусь да 2011 года ўключна. І там абсалютна вызначаны парадак падыходу да цаны на 2011 год. Кошт у параўнанні з 2010 годам можа змяніцца на 10 працэнтаў у бок павелічэння, — сказаў Аляксандр Сурыкаў. — Я са здзіўленнем гляджу на лічбу 250 долараў, або там невядома колькі долараў». Паводле слоў Аляксандра Сурыкава, цяперашняя цана ў трэцім квартале складае 194 долары за 1 тыс. куб.м. «І калі зыходзіць ад яе, то прыбаўце 10 працэнтаў — вось усё, што можа быць», — адзначыў расійскі пасол. «Такі кантракт існуе. І я так разумею, што бакі пасля нейкіх трэнняў па гэтым пытанні ўсё ж такі прыйшлі да таго, што кантракт павінен няўхільна выконвацца», — дадаў Аляксандр Сурыкаў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРОПА ПРЫМАЕ ЗАКОН ПРА БЯСПЕКУ ПАСТАВАК ГАЗУ

**Еўрапарламент адобрыў праект новага «Закона пра бяспеку паставак газу».**

У законе пералічаны газавыя зоны, якія павінны ўмацаваць «узаемасувязь і ўзаемапранікненне» за кошт стварэння інфраструктуры, якая дазваляе пастаўляць газ у абодвух накірунках. Польшчу, напрыклад, мяркуецца злучыць з краінамі Балтыкі, Ірландыю — з Вялікабрытаніяй, Данію — са Швецыяй, Германію — з Чэхіяй і са Славакіяй. Румынія, Францыя і Польшча ўвайшлі адначасова ў дзве зоны, а Германія і Францыя — адразу ў тры. Гэтыя зоны павінны забяспечыць энергабяспеку краін у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі. У законе такімі названыя: «крытычныя тэмпературы на працягу сямі дзён»; выключна высокі попыт на газ мінімум 30 дзён або парушэнне працы адной з вядучых газавых інфраструктур ЕС пры звычайных зімовых рэжымах (як, напрыклад, гэта адбылося падчас расійска-ўкраінскай газавай вайны напачатку 2009 года).

### У МАСКВЕ БЫЛА ЗАХОПЛЕНАЯ Ў ЗАКЛАДНІЦЫ СУПРАЦОЎНІЦА ДЗІЦЯЧАГА САДА

**У цэнтры Масквы мужчына захапіў у закладніцы працаўніцу дзіцячага садка, падчас спецаперацыі ён быў затрыманы, жанчына не пацярпела.**

Інцыдэнт адбыўся ў ноч на сераду ў дзіцячым садку «Вясёлка» на Фрунзенскай набярэжнай. Падчас спецаперацыі міліцыянеры абясшкодзілі злодзея. Затрыманым аказаўся жыхар Іркуцка, які, па звестках аператыўнікаў, у 21.30 у аўторак здзейсніў разбойны напад на таксіста на Хамаўніцкім Валу, параніўшы яго нажом.

### РАСІЯ ЛІДЗІРУЕ ПА ЗАБОЙСТВАХ СЯРОД МОЛАДЗІ

**Па звестках спецыялістаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), за 2004—2006 гады ў Расіі на кожныя 100 тысяч маладых людзей ва ўзросце ад 10 да 29 гадоў даводзілася 15,85 выпадка гвалтоўнай смерці. Па гэтым паказчыку краіна стала самай неспрыяльнай у Еўропе.**

Самымі спрыяльнымі краінамі з найменшай колькасцю выпадкаў гвалтоўнай смерці сярод моладзі сталі Германія — 0,47 забойства на кожныя 100 тысяч юных жыхароў, Арменія — 0,5 і Аўстрыя — 0,54. Акрамя таго, даследчыкам удалося высветліць, што штогод ахвярамі гвалту ў Еўропе становяцца да 15 тысяч чалавек. Пры гэтым кожны дзень гіне да 40 маладых людзей. Чацвёра з дзесяці чалавек гінуць ад халоднай зброі, а 80% усіх забітых — мужчыны.

### ЗДАЎ ЗБРОЮ — ПАЗБЕГНУЎ АДКАЗНАСЦІ

УУС адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска паведамляе, што на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 8.00 27 верасня да 20.00 1 кастрычніка 2010 года праводзяцца аператыўна-прафілактычныя спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы «Арсенал». Асобы, якія добраахвотна здаюць зброю, боепрыпасы, выбуховыя ўстройствы і выбуховыя рэчывы, вызваляюцца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці. Па пытаннях здачы звяртацца па тэлефонах: 2929058; 2929554; 2920202.

**Старшы інспектар па дазвольнай рабоце Савецкага РУУС г. Мінска маёр міліцыі А.А. СВІДЗІНСКІ.**

# МАМІНЫ СІБІРАКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Захапленняў у дэпутата і сапраўды багата. Большую частку будных вечароў ён як мастацкі кіраўнік прысвячае Народнаму студэнцкаму тэатру БДПУ, дзе іграў яшчэ падчас уласнай вучобы. Бачыце, калі што, пасля дэпутацтва зможа і ў прадзюсары падацца! У самога мастацкага кіраўніка голас пастаўлены. Натуральна, не лішняе гэта майстэрства і ў Авальнай зале... А яшчэ «ў нас з сябрамі ёсць традыцыя, штогод мы...» — пагадзіцеся, так пачынаецца шмат забаўных гісторый — «выпраўляемся ў паход!», — расказвае дэпутат. Традыцыі гэтай ужо гадоў 15. А імпэт, з якім праверваныя таварышы выпраўляюцца ў вандроўку на лодках, роварах ці пешшу, усё той жа. «Калі ты публічны чалавек, пастаянна з людзьмі ды з людзьмі, часам хочацца цішыні і спакою», — прызнаецца палітык. За два тыдні маршрут чыста мужчынскай кампаніі атрымліваецца значны, прафесійны турыст пазайздросціць — дабіраюцца да самых аддаленых куткоў краіны. Жонка Марыя захапленне паходамі не падзяляе. «Ні паходамі, ні палаткамі, ні камарамі», — з усмешкаю дадае яна. А вось на свецкіх раўтах, куды палітыка запрашаюць з жонкай, суправаджае мужа з задавальненнем.

У парламенце дэпутат Карпенка заўжды выступае эмацыйна, са здаровай раздражнёнасцю да апанентаў, за словам у кішэню не лезе. «А дома ён заўжды расслаблены — сіл ужо, відаць, не застаецца», — не без усмешкі дзеліцца з намі Марыя. Аднак у выхаванні сына абыходзіцца без мяккасці:

— Хачу, каб Лёша пайшоў у войска пасля інстытута (дзе вывучае юрыспрудэнцыю. — **Аўт.**), — цвёрда кажа палітык. — Я сам адслужыў два гады. Гэта цудоўная школа самастойнасці. Дома ж мама і прыгатуе, і посуд памые, а там апекі няма. Гэта дысцыплінуе, прывучае рабіць усё ў час, правільна ім распараджацца. Цяпер усе хочуць быць кіраўнікамі, менеджарамі найвышэйшага звяна і паспяховымі бізнэсменамі. А ў першую чаргу трэба навучыцца падпарадкоўваць сябе калектыўным інтарэсам і патрабаванням!

Ніякага фэйс-кантролю кандыдаткі на пост нявесты сына ў дэпутата не праходзяць.

— Жыць яму, і любы яго выбар я прыму. У мяне адзін прынцып: не хачу, каб яны хоць дзень жылі са мной разам — сям'я павінна быць самастойнай ва ўсім, пачынаць з нуля, — кажа палітык, відаць, прыгадваючы ўласны вопыт.

Так па драбніцы і «лепіцца» сям'я... Мы ж пакуль зоймемся лепкай пельменяў. Ці, калі быць дакладнай, закруткай. Бо лянівыя пельмені — гэта не па-карпенкаўску. Стосікам выразаем з цеста круглячкі. Раскатваем іх, кладзём мяса ў цэнтр, згінаем папалам і зашчыпваем. Замінаем па краях. І, нарэшце, самае адказнае — скруціць і звесці канцы, адзін зверху, другі знізу. Спрытнасць рук і ніякага махлярства! Знешні край яшчэ крыху пашчыпваем — для прыгажосці. Атрымліваецца нешта накшталт фігурнага кошычка такога. У Ігара Васільевіча, вядома ж. Мае «рагулінкі» — косенькія, крывенькія, худзенькія — прыкметна выбіваюцца са стройных пельменных шэрагаў. Як ні падглядаю за напарнікам па лепцы, як ні стараюся, высалапіўшы язык, ахайна закручваць — усё адно атрымліваюцца нейкія заморкі. Карацей, яшчэ практыкавацца і практыкавацца! «Галоўнае ж, з якім настроем гатуеш», — суцяшаю сябе. Балазе, навучальны працэс мне вельмі падабаецца: ну чыстая народная забава — праўду кажу. Самі паспрабуйце наляпіць такіх «маміных сібірачкоў»!

Цяпер закручаныя «кошычкі» трэба падмарозіць.

— Некалі іх проста вывешвалі за акно, — прыгадвае сібірак.

Мы ж, зразумелая справа, скарыстаемся больш празаічным спосабам — усё ж восень на дварэ — пакладзём у маразільнік. Халадок, калі казаць мякка, з'явіўся апошнім часам і ў нашых адносінах з самай блізкай суседкай — Расіяй...

### Алей у агонь

— Нам удаецца захоўваць баланс, заяўленую шматвектарнасць. І ў пацвярджэнне таму — раздражненне некаторых суседзяў, якія ўсё прымяраюць на сябе імперскія шапкі. То Польшча нешта заяўляе, то Расія, — кажа, як рэжа, палітык. — Апошняя нас папракае тым, што мы дагэтуль не прызналі Абхазію з Паўднёвай Асеціяй — партнёры, маўляў. Беларусь сябе ў гэтым пытанні вельмі паслядоўна паводзіць: ну я разумею, калі б мы Косава прызналі, а Абхазію з Асеціяй адмовіліся... Да таго ж, калі Расія ўводзіла войскі ў Грузію, хіба з намі тады гэта ўзгаднялася? Не! Беларусь, тым не менш, выступіла ў падтрымку такіх яе дзеянняў. А калі б два прэзідэнты селі за стол перамоў, абгаварылі ўсё, магчыма было б прызнанне адразу Саюзнай дзяржавы. Дык не, нам пастаянна прапануюць: «Рабі, як я», бо я старэйшы, я большы і так далей... А гатова сёння Расія, якая нас усё падштурхоўвае да прызнання Абхазіі і Асеціі, заступіцца за Беларусь на ўсіх узроўнях, дзе на нас аказваецца ціск?! З боку ПАСЕ, АБСЕ, ЗША, ААН? Я ў Расіі нядаўна задаваў гэта пытанне. Мне сказалі: безумоўна! Ну дзе ж безумоўна, калі дэпутат Дзярждумы Сяргей Маркаў на апошняй сесіі ПАСЕ прагаласаваў за рэзалюцыю супраць Беларусі. Мы ж,

**Гэты пас — вырашальны: ад таго, наколькі спрытна вы будзеце «зводзіць канцы з канцамі», залежыць, наколькі смачна будзе «есці» вачыма!**

пры ўсіх нашых спрэчках і рознагалоссі, ніколі ў міждзяржаўных структурах не рабілі заяў супраць Расіі. Дык як нам разумець такія захады суседкі?! Непрыхаваны шантаж, уціск! Мала таго, што мы адчуваем яго з боку еўраструктур, дык яшчэ і найбліжэйшая паплечніца падлівае алею ў агонь.

Аднак намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД прызнае: як бы там ні было, два народы знітаваныя — агульнай гісторыяй, агульным лёсам і... цеснымі сваяцкімі сувязямі. За прыкладамі далёка і хадзіць не трэба. Вось гутарым мы ўдваіх пра беларуска-расійскія адносіны: дэпутат, які нарадзіўся ў Расіі, і журналістка — дачка расіянкі. Маміны сібіракі, карацей! Да таго ж, і айчынная эканоміка вымагае інтэграцыі. А значыць, пацяпленне адносінаў — не за гарамі?..

Самы час кінуць замарожаныя «пелемені» (так нараспеў іх называюць у Сібіры) у ваду, якая закіпае... Пасля ўсплывання варым яшчэ літаральна некалькі хвілін.

**Заўзяты паходнік, дэпутат КАРПЕНКА (справа) з сябрамі падчас чарговага марш-кідка на Віцебшчыне, калі за дзень неўпрыкмет пераадольваецца і 60, і 80 км.**

### У госці — з пачастункам

Адмена ці хоць бы мараторый на выкананне смяротных прысудаў нібыта абяцае «падагрэў» адносінаў і па еўрапейскім кірунку. Аднак беларускія ўлады не спяшаюцца. Вядуць абачлівую (так, гэта, відаць, самае рэлевантнае слова) дыскусію. Пакрысе прасоўваецца ў сваім плане парламенцкая рабочая група па вывучэнні далікатнай праблематыкі, адным з удзельнікаў якой з'яўляецца і наш суразмоўца.

— Калі мы ўзмацняем жорсткасць пакарання, нас абвінавачваюць у парушэнні правоў чалавека. А ў Польшчы, напрыклад, узаконілі прымусовую стэрылізацыю педафілаў, і ніхто не лічыць, што педафілаў абмежавалі ў правах! У Швейцарыі вунь збіраюць подпісы за правядзенне рэферэндуму, каб вярнуць смяротную кару за найбольш цяжкія злачынствы. Таму мяне і раздражняе, калі еўраструктуры пачынаюць крытыкаваць Беларусь: у вас тое парушаецца, гэта парушаецца. Хацелася б, каб яны больш на сябе звярталі ўвагу, займаліся сваімі праблемамі — балазе, іх хапае! Вось ужо 23 верасня спадзяёмся пачуць пра гэта з першых вуснаў — падчас «круглага стала» з удзелам прадстаўнікоў Савета Еўропы. Думаю, дыскусія прынясе плён, бо мова грубага дыктату ў выглядзе рэзалюцый, якія з зайздросным пастаянствам прымае СЕ, яшчэ ні да чаго канструктыўнага не прывяла. Гэта ўсё адно як сказаць свайму суседу па лесвічнай клетцы: я буду з вамі вітацца толькі тады, калі вы сабе дзверы металічныя паставіце. Што яму другі на гэта можа сказаць? «Ну і не вітайцеся сабе на здароўе!». А калі кантактаваць, хадзіць у госці, глядзіш, і пераканае адзін другога ў карысці металічных дзвярэй.

Так бы мовіць, не бізуном, а пачастункам... Сібірскімі «пелеменямі», дарэчы, найсмачней за ўсё часта вацца з маслам, перцам і кропелькай воцату. Дадамо вастрыні! Ужо чаго-чаго, а гэтага ў рабоце народнага абранніка хапае:

— Мне як дэпутату, да якога на прыём прыходзяць выбаршчыкі, нельга схавацца за высокую трыбуну і шырокія спіны еўрапейскіх спонсараў! — з імпэтам кажа палітык. — Я гутару з людзьмі з вока на вока, і за многія рэчы мне даводзіцца адказваць. Ставіцца шмат жорсткіх пытанняў. Наконт адмены льготаў, напрыклад. Я не хаваюся ні за каго і не крычу, што тады мяне не было ў зале. Наадварот, адкрыта абгрунтоўваю сваю пазіцыю. Не імкнуся спадабацца ўсім, ды гэта і немагчыма. Проста раблю сваю работу.

А калі кожны на сваім месцы будзе працаваць з ахвотай, усмак, мо і будзем жыць так добра, як хацелася б...

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ГЕНПРАКУРАТУРА ПРАПАНОЎВАЕ ЎЗМАЦНІЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАГРОЗУ ЗАБОЙСТВАМ

**Гэта толькі адна з прапаноў якая прагучала ўчора на калегіі Генеральнай пракуратуры, прысвечанай прафілактыцы сямейна-бытавых злачынстваў.**

— Як бы рэальна чалавек ні пагражаў забойствам членам сваёй сям'і, дзейснае заканадаўства не дазваляе заключыць яго пад варту, — пракаментаваў прапанову, вынесеную ў загаловак, **намеснік Генеральнага пракурора Аляксандр ЛАШЫН**. — У сувязі з гэтым прапаноўваем разглядзець магчымасць устанаўлення за пагрозу забойствам (поруч з існуючым абмежаваннем волі) пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да трох гадоў.

Акрамя таго, для рашэння праблемы сямейна-бытавых злачынстваў Генпракуратура рэкамендуе стварыць на месцах дадатковыя крызісныя пакоі для кругласутачнага знаходжання тых, хто пацярпеў ад гвалту ў сям'і, а таксама павялічыць колькасць выязных пасяджэнняў судоў па разглядзе крымінальных спраў у сферы сямейна-бытавых канфліктаў і грамадзянскіх спраў аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў.

— Нядрэнна было б стварыць мабільныя групы з работнікаў мясцовых органаў улады, аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, членаў БРСМ, прадстаўнікоў СМІ, якія б праводзілі індывідуальную прафілактыку правапарушэнняў у сферы сямейна-бытавых адносінаў, — працягвае пералічваць прапановы Аляксандр Лашын.

— А таксама арганізаваць для старшыняў саветаў грамадскіх пунктаў аховы парадку семінары для павышэння іх прававой падрыхтоўкі.

— Часта, калі ідзе гаворка аб прафілактыцы, асабліва злачынстваў на глебе сямейна-бытавых канфліктаў, мы ў першую чаргу чамусьці ўзгадваем пра міліцыю, — кажа Аляксандр Лашын. — Пры гэтым забываем, што законам вызначана і каля двух дзясяткаў іншых арганізацый, якія павінны займацца прафілактычнай дзейнасцю. Я цвёрда перакананы, што толькі разам, вырашаючы праблему ў комплексе, мы зможам дасягнуць станоўчых вынікаў.

Паводле статыстыкі, **за 6 месяцаў гэтага года агульная колькасць злачынстваў у краіне знізілася, але колькасць злачынстваў на глебе сямейна-бытавых канфліктаў выраслa на 6, 1 працэнта (у параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года).** Рост адбыўся за кошт павелічэння спраў прэвентыўнай накіраванасці. Дарэчы, да гэтай катэгорыі адносяцца ў тым ліку і справы па пагрозах забойствам.

Паводле слоў Аляксандра Лашына, у шэрагу раёнаў прафілактычная работа мясцовых уладаў носіць фармальны характар: няма канкрэтных мерапрыемстваў, тэрмінаў іх выканання, часта няма нават адказных асоб. У асобных выпадках не наладжана патрэбным чынам работа Саветаў грамадскіх пунктаў аховы парадку. Напрыклад, на пасяджэнні савета грамадскага пункта Новазаранскага сельвыканкама Чашніцкага раёна не разглядзелі супрацьпраўныя паводзіны спадара С. у быце. І што вы думаеце, праз нейкі час мужчына ў аграгарадку Новая Зарэчча забіў спадара В., а затым, каб замесці сляды, падпаліў дом сваёй ахвяры. Гэты факт разгледзелі на савеце толькі праз 26 дзён, прычым абмяркоўваліся пытанні выканання правілаў пажарнай бяспекі, а не прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі здзяйсненню цяжкага злачынства. Такія факты не адзінкавыя і характэрныя таксама для іншых раёнаў рэспублікі.

— Часам прымаюцца і рашэнні аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальных спраў па фактах пабояў ці нанесенні цялесных пашкоджанняў, — адзначыў намеснік Генпракурора. — У выніку нярэдка, як паказвае практыка, чалавек здзяйсняе паўторныя правапарушэнні. Таму не трэба забывацца, што непазбежнасць пакарання — адна з найбольш эфектыўных мераў прафілактыкі.

— Мы пільна сочым за выкананнем пунктаў дзяржпраграмы па пераадоленні п'янства і алкагалізму, у тым ліку і скарачэння аб'ёмаў рэалізацыі спіртнога штогод на 10 працэнтаў (гаворка ідзе аб няякасных танных вінах). У цэлым дзяржаўная праграма па гэтым накірунку выконваецца. Апошнім часам нас трывожыць павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі слабаалкагольных напояў. Безумоўна, будзем надаваць увагу і гэтаму моманту.

**Надзея ДРЫЛА.**

## КДК БЕЛАРУСІ СПЫНІЎ ДЗЕЙНАСЦЬ «ШЭРЫХ» АЎТАПЕРАГОНШЧЫКАЎ

**Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Мінскай вобласці і Мінску ўзбудзіла крымінальную справу адносна двух мінчан (родных братоў), якія займаліся незаконным увозам у краіну аўтамабіляў.**

Такой прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі гэтыя грамадзяне займаліся з 2006 года. Яны набывалі ў Германіі аўтамабілі і потым прадавалі іх у Беларусі. Праверка адносна аўтаперагоншчыкаў праведзена па пастуліўшай аператыўнай інфармацыі. Было ўстаноўлена, што толькі ў 2007 годзе браты ўвезлі з Германіі на тэрыторыю Беларусі і рэалізавалі не менш як 10 аўтамабіляў, якія з мэтай утойвання проціпраўнага характару дзейнасці афармляліся як увезеныя сваякамі і знаёмымі. У выніку браты атрымалі даход на суму звыш Br250 млн. У прэс-службе КДК паведамілі аб расследаванні яшчэ адной падобнай крымінальнай справы, звязанай з незаконным увозам у краіну аўтамабіляў, яе матэрыялы перададзены ўжо ў суд. Крымінальная справа была ўзбуджана ўпраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Мінскай вобласці і Мінску адносна трох сваякоў (двух братоў і іх бацькі). На працягу 2006—2008 гадоў сямейны падрад увёз у Беларусь 60 аўтамабіляў на суму больш як Br1 млрд.

**Мінгандаль:**

## ПАСТАЎКІ СЛАНЕЧНІКАВАГА АЛЕЮ Ў ГАНДЛЁВУЮ СЕТКУ БЕЛАРУСІ ЗАСТАНУЦЦА СТАБІЛЬНЫМІ

«Пытанне пра пастаўкі алею знаходзіцца на пастаянным кантролі ў Мінгандлю. Нядаўна была праведзена нарада з пастаўшчыкамі-імпарцёрамі алею, якія заключылі доўгатэрміновыя кантракты з вытворцамі з Украіны і Расіі. Яны запэўніваюць, што збояў у пастаўках гэтага прадукту ў Беларусь не дапусцяць», — паведамілі ў міністэрстве.

На рынку рэспублікі пераважае імпартны алей. Яго доля складае 70%, удзельная вага айчыннага алею — 30%. У 2010 годзе ў Расіі чакаецца самы нізкі з 2004 года ўраджай сланечніку. Кошт семечак ужо на 75% вышэйшы, чым у верасні мінулага года. Расійскія спецыялісты-эксперты прагназуюць, што ўзрасце і кошт на алей.

У Мінгандлю Беларусі яшчэ раз адзначылі, што сітуацыя на харчовым рынку застаецца стабільнай, усе пастаўкі ажыццяўляюцца ў планавым парадку і пільна кантралююцца. Неабходна ўлічыць, што ажыятажны попыт на той ці іншы прадукт можа быць справакаваны самім насельніцтвам, якое неапраўдана закупляе ў вялікай колькасці той ці іншы тавар.

## Абзац

◢ Сталічныя кухары спяклі шарлотку вагой 60 кг. Дзень яблычных прысмакаў прайшоў у рэстаране «Яблык» у рамках 13-га рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх густаў «Прадукт года-2010». Кухары рэстарана спяклі шарлотку вагой 60 кг, даўжынёй 220 см, шырынёй 141 см і вышынёй 3 см. Па сваіх памерах шарлотка прэтэндуе на права патрапіць у кнігу рэкордаў Расіі, СНД і краін Балтыі «Дзіва».

◢ **Споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння Сяргея Ожагава, расійскага мовазнаўцы, лексікографа, доктара філалагічных навук. Створаны ім «Тлумачальны слоўнік рускай мовы» даўно стаў самым папулярным даведачным выданнем па рускай мове, узорам для стварэння многіх руска-нацыянальных слоўнікаў, у якіх фіксуецца сучасная лексіка. Сам Ожагаў жартаваў, што па колькасці выдадзеных экзэмпляраў яго слоўнік не саступае працам класікаў марксізму-ленінізму. Памёр у 1964 г.**

◢ У аўтобусе магілёўскага «Дняпра» здарыўся пажар. Ноччу каля невялікага 6-кватэрнага дома па вул. Ленінскай у Магілёве нечакана загарэўся камфартабельны аўтобус футбольнага клуба «Днепр». Побач з домам знаходзіцца тэрыторыя спартыўнага комплексу «Цэнтральны». Вартаўнікі комплексу выклікалі выратавальнікаў, якія ліквідавалі загаранне ў лічаныя хвіліны.

◢ **75 кітоў выкінуліся на мелкаводдзе паблізу новазеландскага вострава Паўночны, 25 з іх ужо загінулі, паведамляюць інфармагенцтвы. Кіты-гранда, што напамінаюць дэльфінаў, славяцца сваёй дружалюбнасцю. Яны дасягаюць у даўжыню да 6 м і важаць прыкладна 3 т. Да аперацыі па выратаванні кітоў прыцягнутыя прадстаўнікі прыродаахоўных арганізацый і мясцовыя жыхары.**

## Поўны абзац

◢ Арганізатары музычнага фестывалю Jura Music Festival, які адбудзецца днямі на шатландскім востраве Джура, прыцягнулі да працы на мерапрыемстве 4-гадовага ката па мянушцы Элвіс. Жывёлцы прадстаіць выступіць аўтарам фотасправаздачы з фестывалю. На тулава Элвіса прымацуюць фотакамеру, якая будзе аўтаматычна рабіць здымкі і тут жа адпраўляць іх на афіцыйны сайт музычнай імпрэзы. Кату застанецца толькі прагульвацца па тэрыторыі фестывалю — яму будзе дазволена хадзіць не толькі сярод гледачоў, але і сярод музыкантаў. Элвіс вельмі любіць кантактаваць з людзьмі і слухаць музыку. Jura Music Festival стартуе 24 верасня.

◢ **Бабуля знайшла ва ўнітазе анаконду. 73-гадовая полька пайшла ў туалет у сябе дома і ва ўнітазе ўбачыла анаконду. Напалоханая бабуля тут жа зачыніла накрыўку, выбегла з пакою і выклікала паліцыю. Праваахоўнікі разам з працаўнікамі мясцовага заапарку выцягнулі змяю. Мяркуюць, што ў дом пенсіянеркі яна трапіла праз каналізацыйныя трубы. Бабуля адыходзіць ад стрэсу, анаконда асвойваецца ва ўроцлаўскім заасадзе, паліцыя шукае яе ўладальніка.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Дынамаўцы адолелі ўладальніка Кубка Гагарына

### А на «Мінск-арэне» ўстаноўлены рэкорд наведвальнасці КХЛ



Фота Пятра ФАМІНА.

**Мінскае «Дынама» перайграла казанскі «Ак Барс», а на «Мінск-арэне» ўстаноўлены чарговы рэкорд наведвальнасці ў КХЛ — 15 531. З лікам 5:4 адолены двухразовы ўладальнік Кубка Гагарына, а мінчане працягнулі сваю рэкордную пераможную серыю, якая складае цяпер пяць матчаў.**

Тое, што на «Мінск-арэне» ў матчы з леташнім чэмпіёнам КХЛ будзе аншлаг, гаварылася яшчэ раніцай. Так і атрымалася: удалося больш чым на тры тысячы пабіць рэкорд лютага 2010 года, устаноўлены на матчы піцерскага СКА і рыжскага «Дынама», калі на гульні прысутнічала 12 090 гледачоў. Як ні дзіўна, ніякіх праблем з тым, каб хутка трапіць на арэну, не было: 2 хвіліны ў сярэднім займаў праход праз турнікет, прычым без звыклых ужо абмацванняў і вываротвання кішэняў. Праблемы былі ў балельшчыкаў, якія вырашылі прыехаць на матч на аўто. Было відавочна, што паркоўка «Мінск-арэны» не спраўляецца з патокам машын. На ўезд з вуліцы Нарачанскай утварыўся вялізны затор, які працягнуўся да праспекта Пераможцаў. У рэшце рэшт гэты ўезд быў закрыты ДАІ, і аматараў хакея накіроўвалі на стаянкі ў іншыя месцы. Гэты факт не можа не засмучаць, бо, як вядома, праектавалася «Мінск-арэна» не для пазаўчарашняга матчу з «Ак Барсам», а для фіналу чэмпіянату свету-2014.

«Мінск-арэна» не толькі сабрала поўныя трыбуны, але і паказала выдатны спектакль, які скончыўся ў авертайме, на 30-й секундзе якога была закінутая вырашальная шайба дынамаўцам Сяргеем Дзямагіным. Што адметна, шайба была закінутая, калі нашы хакеісты былі ў меншасці. Яшчэ шэсць шайбаў аказаліся ў варотах, калі супернікі былі ў большасці («Ак Барс» так забіў усе свае галы), і толькі дзве — калі склад каманд быў роўны. Прыемна і тое, што нарэшце праявіла сябе звяно Ёээфа Штумпэла, набытае ў міжсезонне ў «Барыса». Сам капітан меў дачыненне да чатырох закінутых мінчанамі шайбаў і стаў лепшым гульцом матчу. Застаецца падтрымаць нашу каманду: сёння ў матчы з ніжнекамскім «Нафтахімікам», а 25 верасня — у матчы з екацярынбургскім «Аўтамабілістам».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**РАЙЦЕВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**Лот 1** — по продаже земельного участка в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Гроненская обл., Корелический район, Райцевский с/с, д. Ятвезь, У-1, площадь участка — 0,1474 га. Кадастровый номер 423380101010000022. Начальная цена — 59656 белорусских рублей.

Информацию о расходах, связанных с организацией и проведением аукциона, можно получить по телефонам: 8 (01596) 26 1 33, 26 1 89.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляются на р/с 3600518084268 в ЦБУ № 411 филиал 416 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новогрудок, код 698. УНН 500008215. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, составляют 757560 рублей + затраты на объявление в СМИ.

Аукцион состоится **29 октября 2010 года в 15.00** по адресу: Корелический район, д. Райца, ул. Почтовая, д. 5 (здание Райцевского сельисполкома).

Заявление на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения **до 17.00 22 октября 2010 

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 верасня 2010 г. № 32 (226)


МЯСЦОВЫ ЧАС

## Зімаваць лепш удваіх, чым па адным

**Увосень адзінокія пажылыя людзі, што жывуць у вёсках, асабліва турбуюцца, як перажыць чарговую зіму. Трэба зрабіць запас дроў ці брыкету, уцяпліць хату, забяспечыць сябе гароднінай... Не для ўсіх састарэлых гэтыя клопаты вырашальныя. Нямала пажылых людзей, якія не ў сілах абслужыць сябе: насекчы дровы, выпаліць у печы, схадзіць па ваду да калодзежа ці калонкі. Тады ім на дапамогу прыходзіць сацыяльная служба.**

— На Аршаншчыне такіх адзінокіх састарэлых, якім патрэбна дапамога, 364 чалавекі, — расказала начальнік раённага ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне Вера Астапенка. — Менавіта ім сацыяльная служба актыўна прапагандуе дамы сумеснага пражывання. Ужо амаль у кожным сельсавеце ёсць такія дамы, дзе пенсіянеры па сваёй ініцыятыве мінулай зімой аб'ядноўваліся для пражывання. У пасёлку Высокае, напрыклад, у адной хаце зімавалі дзве пенсіянеркі, а другую хату зачынілі. Такім чынам зэканомілі грошы на паліве. У Зубаўскім сельсавеце зімой сумесна вялі гаспадарку пажылыя мужчына і жанчына. Ён дровы калоў і ў печы паліў, яна кухарыла і бялізну мыла. З дзвюх пенсій у складчыну куплялі прадукты, а вясной вызначылі, што пражылі больш эканомна, чым тады, калі па аднаму жылі ў дзвюх хатах.

Дамы сумеснага пражывання эканомяць дзяржаўныя сродкі, і пажылыя людзі адчуваюць сябе там лепш, чым у інтэрнаце. У гэтых дамах пенсіянеры самі распараджаюцца сваёй пенсіяй, аплачваюць камунальныя паслугі, абслугоўваюць сябе, наколькі здольныя. Сумеснае пражыванне двух-трох асобаў стымулюе іх да актыўнага ладу жыцця: трэба абслужыць сябе і дапамагчы слабейшаму, які жыве побач. Работнікі сацыяльнай службы пры такім раскладзе маюць магчымасць абслужыць больш пажылых людзей. Калі звычайна за адным работнікам замацавана 8 пенсіянераў, то ў дамах сумеснага пражывання ён мае магчымасць абслужыць 16. Відавочна, што і дзяржаўныя затраты па доглядзе адзінокіх састарэлых будуць значна меншыя, чым у інтэрнаце.

Што падштурхнула сацыяльную службу да актыўнай прапаганды такіх дамоў?

Два гады таму Вера Астапенка наведала Швецыю з групай прадстаўнікоў сацыяльнай службы нашай краіны, каб пабачыць, як працуюць там з пажылымі людзьмі і інвалідамі. Яна пераканалася падчас паездкі, што інтэрнаты для састарэлых ужо не карыстаюцца попытам: па-першае, патрабуюць вялікіх выдаткаў з бюджэту, а па-другое, для пражывання пажылых там ствараюцца нялепшыя ўмовы. Каб зэканоміць дзяржаўныя сродкі і зрабіць умовы для гэтай катэгорыі людзей прымальнымі, за мяжой практыкуюць дамы сумеснага пражывання. На шведскі ўзор абсталявалі такі дом і на Аршаншчыне.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

Начальнік упраўлення па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Вера АСТАПЕНКА.

«ФОРС-МАЖОР»

## ПРАБЛЕМА «НУМАР АДЗІН»

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Вера ШЛОЙДА (справа) з жыхаркамі Сёмкава Гарадка Наталляй Сцяпанаўнай ПЕТРАШКЕВІЧ і Людмілай Андрэеўнай ГРЫНЦЭВІЧ.

Знос электрасетак у вёсцы даўно перавысіў 100 працэнтаў...

## вёскі Сёмкаў Гарадок

**Вёска Сёмкаў Гарадок Папярнянскага сельсавета месціцца ў 6 кіламетрах ад Мінскай кальцавой аўтамагістралі і налічвае 170 двароў. Здавалася б, уся сацыяльная інфраструктура тут павінна быць на высокім прысталічным узроўні. Аднак на справе атрымліваецца наадварот. Падрабязней пра турботы і клопаты мясцовых жыхароў нашаму журналісту расказала старэйшына вёскі Вера Аляксандраўна ШЛОЙДА.**

— На сёння самая вострая наша праблема, «праблема нумар адзін» — гэта электразабеспячэнне. Мы ёю займаемся ўжо гады тры і ніяк не можам вырашыць. Справа ў тым, што ў вёсцы вельмі старыя электрасеткі. Іх знос даўно перавысіў 100 працэнтаў. Слупы літаральна «вісяць» на правадах. Асвятленне ў памяшканнях такое слабае, што чытаць ужо немагчыма. Як дзецям урокі вечарам рабіць? У службе раённых электрасетак яшчэ летась нам казалі, што адпаведны праект гатовы, што грошы выдаткаваныя, але дагэтуль нічога не змянілася.

У нас нядаўна згарэла хата ў дружнай, працавітай сям'і. Дзеці глядзелі тэлевізар і заснулі, а з-за перападу напружанасці ў сетках загаръўся стабілізатар. Добра, што дома былі бацькі, інакш наступствы маглі б быць яшчэ больш сумнымі. Тым не менш, хата знутры выгарала. Увогуле, у нашай вёсцы з-за перападаў напружання вельмі часта гараць тэлевізары, мікрахвалевыя печкі, пральныя машыны, халадзільнікі. Днямі ў нас завяршыліся работы па падвядзенні газу. Як у такіх умовах запусціць газавыя катлы? Яны проста не «пацягнуць». А старыя свае катлы мы павыкідвалі. Калі ў бліжэйшы час сітуацыя не зменіцца, людзі застануцца без ацяплення. Наш актыў вёскі запісаўся на прыём да старшыні аблвыканкама. Ён — наша апошняя надзея. Спадзяёмся толькі на яго, бо сіл ужо няма. Людзі ледзь не плачуць.

З вадой, па словах Веры Аляксандраўны, у Сёмкавым Гарадку таксама праблема. Тут ёсць старая свідравіна, ад якой па ўсёй вёсцы цягнецца водаправод, але яна — свідравіна — амаль цалкам вычарпана. Вады хапае толькі на дзве блізкэйшыя хаты. Жыхары іншых дамоў вымушаны прывозіць сабе ваду. Тым, хто па слабасці здароўя не можа гэта рабіць сам, — дапамагаюць суседзі. Як патлумачыла старэйшына, у абласным упраўленні ЖКГ пабяцалі, што да 1 кастрычніка будзе зроблены праект на новую свідравіну для вёскі. Але ж з праекта ваду не піць...

— З астатнімі праблемамі разам са старшынёй сельскага Савета пакрысе справімся, — перакананна Вера Аляксандраўна. — Напрыклад, ён паабяцаў упарадкаваць дарогі вуліц нашай вёскі — за сродкі, атрыманыя ад продажу зямлі праз аўкцыёны. Нашы дарогі даўно патрабавалі ўвагі, але мы чакалі, калі завершыцца падвядзенне газу, каб не рабіць адну і тую ж справу двойчы. Хаця насельніцтва мне неаднаразова скардзілася на стан дарог, але я тлумачыла, што трэба пачакаць. Дарогі ў нас грунтовыя, упарадкаваць іх будзе прасцей, чым, скажам, асфальтавыя. Увогуле, асфальт непрактычны, гэта «бетонка» трывалая. Я ўжо ў гэтым добра разбіраюся, бо сутыкаюся з такімі пытаннямі не адзін год.

Асноўнае месца працы Веры Аляксандраўны — сельскі клуб-бібліятэка. Такая структура ўтварылася ў выніку аб'яднання дзвюх раней асобных установ, што было абумоўлена скарачэннем насельніцтва сельсавета. Па адукацыі яна бібліятэкар. У дэпутатах наша гераіня — трэці тэрмін. Цяпер з'яўляецца дэпутатам Папярнянскага сельскага і Мінскага раённага Саветаў 26-га склікання. Апошнія гадоў дзесяць Вера Аляксандраўна — старэйшына вёскі, дзе пражыла ўжо 32 гады. Сама родам з Магілёўшчыны, у свой час прыехала сюды па размеркаванні, выйшла замуж, нарадзіла дзяцей. Летась яе прызналі лепшым старэйшынам сельсавета, уручылі прэмію 100 тысяч рублёў.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

ПА СУТНАСЦІ

## Прафінансаваць і перадаць!

**У Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, намесніка старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Леаніда КРУПЦА са слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі — старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў.**

Сярод апошніх дастаткова было «навічкоў» — тых, каго абралі на пасады ўпершыню, таму Леанід Крупец кароткa пазнаёміў прысутных з асноўнымі кірункамі работы Савета Рэспублікі, дзякуючы якім кантактаванне з органамі мясцовай улады адбываецца пастаянна. Пры Савеце Рэспублікі тры гады таму створаны Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, які прадстаўляе інтарэсы выключна гэтых структур. А непасрэднае ўзаемадзеянне з мясцовай прадстаўнічай уладай адбываецца праз правядзенне сумесных «круглых сталоў», выязных пасяджэнняў, семінараў, якія праводзяцца на базе таго ці іншага раёна, «гарачых» тэлефонных ліній і г.д.

— Усе пытанні, якія ўзнімаюцца на месцах — на ўзроўні сельсавета ці раёна — мы сістэматызуем, вызначаем, ці суадносяцца яны з нашай кампетэнцыяй, як могуць дапамагчы тыя ці іншыя міністэрствы і што прапісана на гэты конт у Бюджэтным кодэксе, — сказаў Леанід Крупец. — І многія праблемы, дзякуючы такому ўзаемадзеянню, ужо вырашаюцца.

Сёння спецыфіка работы сельскіх Саветаў змянілася. Іх кіраўнікам не трэба ўжо, як раней, турбавацца пра фінансавае забеспячэнне той жа сацыяльнай сферы — паколькі гэтымі пытаннямі займаюцца ўжо спецыялізаваныя ўстановы на раённым узроўні. У хуткім часе да спецыялізаваных службаў павінны, нарэшце, адысці дарогі (вуліцы сельскіх населеных пунктаў) і аб'екты жыллёва-камунальнай гаспадаркі (сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення). Гэта дазволіць вызваліць кіраўнікоў мясцовых органаў улады ад неўласцівых ім гаспадарчых функцый.

— Вось таму я заўсёды цікаўлюся, як рэалізуецца на месцах Указ Прэзідэнта № 21, — патлумачыў Леанід Крупец. — Хацелася б, каб усе вы, асабліва тыя, хто абраны ўпершыню, звярнулі самую пільную ўвагу на гэты дакумент. Тэрміны яго выканання сёння парушаюцца, тармозяцца з-за нежадання спецыялізаваных арганізацый — я маю на ўвазе ў першую чаргу дарожныя і камунальныя службы — узяць на сябе пэўны цяжар... Калі мы перадаём дарожнікам і камунальнікам вызначаныя ўказам аб'екты, значыць, у бюджэты абласцей павінны быць закладзены і пэўныя сумы на рэальную падтрымку гэтых службаў. А аднымі заклікамі і лозунгамі праблему не вырашыць.

Пасля канчатковай перадачы дарожных і камунальных аб'ектаў іх рамонтам і добраўпарадкаваннем у сельскай мясцовасці будуць займацца, хутчэй за ўсё, спецыялізаваныя камунальныя прадпрыемствы ці падраздзяленні. Дарэчы, у адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця вёскі, такія камунальныя ўчасткі павінны быць створаныя ў кожным аграгарадку. Мяркуецца, што менавіта яны з цягам часу возьмуць на сябе ўсю адказнасць за вясковую «камуналку».

— Не павінен старшыня сельскага Савета сёння хадзіць з мотакасой — тым самым прыніжаецца яго роля, — лічыць Леанід Крупец. — Тым больш што на працягу апошніх гадоў шмат робіцца для падняцця гэтай ролі. Таму і абласным Саветам, і фінансістам, і дэпутатам усіх узроўняў трэба яшчэ раз звярнуць увагу на праблему перадачы азначаных аб'ектаў спецыялізаваным структурам — калі мы хочам выканаць указ так, як патрабуе кіраўнік дзяржавы.

Сёння маюць патрэбу ў канкрэтных гаспадарах і такія аб'екты, як грамадскія калодзежы і месцы грамадскіх пахаванняў, і гэта таксама праблема, якая ніяк не скранецца з мёртвага пункта. А таму вырашаць яе трэба на дзяржаўным узроўні.

— Як перадаць гэтыя аб'екты, каму? Практычна ні на адзін з іх сёння няма праектна-каштарыснай дакументацыі, а яе падрыхтоўка каштуе сродкаў, і вялікіх. Дык ці трэба перакладаць іх з адной дзяржаўнай кішэні ў другую? Ці не лепш прыняць пэўны заканадаўчы акт, каб адпаведныя службы спачатку прынялі гэтую «гаспадарку», і ўжо непасрэдна ім выдзеліць неабходную суму і на дакументацыю, і на абслугоўванне?.. Будзем абмяркоўваць пытанне з кіраўнікамі Саветаў дэпутатаў розных узроўняў, запросім юрыстаў, прадстаўнікоў Міністэрства камунальнай гаспадаркі... Думаю, вы на месцах таксама маглі б больш актыўна ўзнімаць гэтыя праблемы, у першую чаргу перад абласнымі Саветамі — звярнуўся да прысутных Леанід Крупец. — Тым больш што неўзабаве на месцах пачнуцца абмеркаванні бюджэту на наступны, 2011 год.Трэба дабівацца, каб туды былі закладзены сродкі, неабходныя для вырашэння самых вострых, самых надзённых вашых праблем.

Працягваючы тэму фарміравання мясцовых бюджэтаў, **начальнік галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ** паведаміў, што законам аб бюджэце на наступны год зменена схема размеркавання падатку на прыбытак. Калі сёння ён размяркоўваецца паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі, выходзячы з прапорцый «50 на 50», то з наступнага года прапорцыі будуць іншымі: 70 працэнтаў ад сумы гэтых падаткаў атрымаюць мясцовыя бюджэты. Сама сістэма размеркавання пабудавана такім чынам, што ў мясцовыя бюджэты будуць цалкам залічвацца падаткі на прыбытак ад мясцовых прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці, а таксама ад прадпрыемстваў камунальнай формы ўласнасці (створаных з удзелам мясцовай улады).

— Такім чынам, на **мясцовым узроўні застанецца ўвесь падатак на прыбытак ад прадпрыемстваў, створаных па ініцыятыве мясцовай улады**, — падкрэсліў Максім Ермаловіч. — Далей, пры фарміраванні бюджэту ўжо на 2012 год, мы плануем павялічыць — таксама на карысць мясцовых бюджэтаў — і нарматыў адлічэнняў ад падатку на дабаўленую вартасць, які з'яўляецца адной з самых стабільных даходных крыніц. Павялічыўшы яго долю ў мясцовых бюджэтах, мы зможам зменшыць узровень іх датацыйнасці.

Укараняючы новую сістэму размеркавання падатку на прыбытак, дзяржава такім чынам імкнецца падштурхнуць мясцовыя ўлады да стварэння прадпрыемстваў.

— Напрыклад, у Магілёўскай вобласці быў створаны завод па замарожванні сельгаспрадукцыі. Цяпер ён прыносіць мясцоваму бюджэту 1 мільярд рублёў у год. Стварыўшы ў кожным раёне па адным такім прадпрыемстве, можна істотна «падцягнуць» уласную рэсурсную базу, — заўважыў фінансіст. — Безумоўна, зрабіць гэта няпроста, асабліва ў рэгіёнах з мала развітай інфраструктурай. І тым не менш, адзіная рэальная магчымасць тэрыторый палепшыць фінансавае становішча — развіваць сваю вытворчасць.

І яшчэ пра навацыі, якія закрануць мясцовыя бюджэты. З новага года ў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню з'явіцца новая даходная крыніца, а менавіта **адлічэнні ад падаходнага падатку з фізічных асобаў**. Нарматыў такіх адлічэнняў для кожнага сельсавета будзе вызначаць раённы Савет дэпутатаў.

Вялікія змены датычацца і парадку выкарыстання бюджэтнымі арганізацыямі пазабюджэтных сродкаў, а таксама пазабюджэтных фондаў. Парадак выкарыстання такіх сродкаў, а таксама адказнасць за гэта будуць цалкам адпавядаць парадку і адказнасці, вызначаным для выкарыстання бюджэтных сродкаў.

— Калі раней за нямэтавае або неэфектыўнае выкарыстанне пазабюджэтных сродкаў фактычна ніхто не нёс адказнасць, то сёння за гэта трэба будзе адказваць. А з цягам часу мы ўвядзём улік пазабюджэтных сродкаў на рахунках органаў казначэйства. Гэта дазволіць своечасова кантраляваць іх выкарыстанне, — заявіў фінансіст.

Увогуле, паводле слоў Максіма Ермаловіча, з 2011 года падатковая сістэма нашай краіны будзе адпавядаць аналагічным сістэмам еўрапейскіх дзяржаў.

**Наталля КАРПЕНКА.**

## ТАЛАКОЙ!

**Па ініцыятыве і за сродкі жыхароў вёскі Бердаўка Лідскага раёна за некалькі месяцаў пабудавалі спартыўную пляцоўку для гульні ў футбол, валейбол, а зімой — у хакей.**

Гэтая ідэя з'явілася пасля таго, як хлопцы з Бердаўкі згулялі гасцявы хакейны матч на пляцоўцы ў пасёлку Першамайскім. «А чым мы горшыя?» — падумалі жыхары Бердаўкі Аляксандр Мітронь і Віктар Вайчаніца і звярнуліся ў сельвыканкам з просьбай пабудаваць спартыўную пляцоўку. Прапанову падтрымалі, падлічылі фінансавыя затраты і ў сярэдзіне мая ўсё талакой узяліся за справу. Сваё «плячо» ініцыятыве вяскоўцаў падставілі сельвыканкам, сельгаспрадпрыемства «Бердаўка-Агра», раённы Савет дэпутатаў, аддзел па фізічнай культуры, спорце і турызме райвыканкама, а таксама спецыялісты Лідскіх электрасетак, якія змантыравалі асвятленне пляцоўкі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## КУПЛЯЕМ БЕЛАРУСКАЕ

**У рознічным таваразвароце сталічнага гандлю пераважаюць беларускія харчовыя тавары.**

Як паведамілі ў галоўным статыстычным упраўленні горада Мінска, удзельная вага продажу каўбасных вырабаў і вяндліны беларускай вытворчасці за паўгоддзе склала 99,8% ад агульнага аб'ёму рэалізацыі, гарэлкі — 99,2, мяса і птушкі — 98,9, масла жывёльнага — 98,8, безалкагольных напіткаў — 90,9, маргарынавай прадукцыі — 90,9, мінеральнай вады — 90,8, кандытарскіх вырабаў — 78,9, піва — 66,4%.

**«Мінск-Навіны».**

## МАЙСТЭРСТВА «РАСКРУЦІЦЬ» СВАЮ ТЭРЫТОРЫЮ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Расонскім раёне ў рамках праекта Еўрасаюза і Праграмы развіцця ААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» адбылася зацікаўленая размова на тэму распаўсюджвання ў Беларусі замежнага досведу так званых Зялёных маршрутаў. У сустрэчы ўдзельнічалі гаспадары аграсядзіб, прадстаўнікі мясцовай улады, старшыні сельскіх Саветаў, спецыялісты ў сферы турызму.**

### Кролава хата

Мы зайшлі ў халодную камору і ахнулі. На лаве стаяла некалькі ёмістых кошыкаў, поўных грыбоў. Прычым, я сказаў бы, калібраваных баравікоў і падасінавікаў: усе пераважна сярэдняга памеру. Большыя і таксама чыстыя ляжалі побач. Гаспадар аграсядзібы «Кролава хата» Аляксандр Крол не хаваў задавальнення ад нашай бурнай рэакцыі на ўбачаныя некалькі сотняў прыгажуноў-баравікоў.

— Гэтыя грыбы мы сабралі сёння раніцай. Учора і пазаўчора прынеслі прыкладна столькі ж. Відаць, не менш збяром і заўтра. Будзе чым зімой і самім паласавацца, і пачаставаць замежных гасцей, — кажа гаспадар.

У Расонскім раёне «Кролава хата» — адна з самых паспяховых аграсядзіб. Тут рэгулярна гучыць замежная мова, сюды едуць адпачыць з розных еўрапейскіх краін, тут заўсёды шмат расіян, аднойчы нават завіталі з Таганрога. Напрыклад, зімой тут весела бавіла час група парыжскіх студэнтаў, якія вучыліся, па-простаму кажучы, на артыстаў кіно і тэатра. «Кролава хата» і яе маляўнічыя наваколлі неаднойчы станавіліся месцам правядзення тэматычных моладзевых лагераў, семінараў, сустрэч старых сяброў на беразе прыгожага возера, што побач з аграсядзібай. Карацей, мы на свае вочы ўбачылі ўдалы прыклад таго, як можна «раскруціць» сваю тэрыторыю.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння цяжка паверыць у тое, што яшчэ адносна нядаўна на месцы вялікай аднапавярховай пабудовы ў нацыянальным беларускім стылі стаяў дом без вокнаў, дзвярэй і без падлогі. Некалі тут была бальніца, потым дом пераабсталявалі пад часовы саўгасны склад. Але і яго паступова перасталі выкарыстоўваць. Неўзабаве ўсё, што можна было адтуль вынесці, было вынесена. Праўда, засталіся дзіравы дах і яшчэ вельмі моцныя сцены з сасны. Вось яны і прыцягнулі ўвагу перасяленцаў з Наваполацка — настаўніка фізкультуры Аляксандр Крола і яго жонкі Веры. На сямейнай нарадзе яны вырашылі выкупіць і адрамантаваць рэшткі дома. Пра будучую аграсядзібу тады гаворкі не было.

Рамантавалі як маглі. Апетыт, як гэта часта бывае, прыйшоў у час ежы. Аляксандр і Вера даволі хутка здолелі ператварыць закінутую хату, якую збіраліся разабраць на дровы, у прасторную, утульную і каларытную аграсядзібу. Сёння ў іх шмат планаў па яе добраўпарадкаванні і перабудове. Але вось задача: нельга знайсці кваліфікаваных цесляроў і сталяроў нават за добрыя грошы. Неяк Кролы нанялі складсці летнюю прыбудову да хаты прыезджых «майстроў» з Наваполацка, але потым самім прыйшлося амаль усе перарабляць.

На пытанне: чым ім у развіцці агратурызму магла б дапамагчы мясцовая ўлада, Кролы адказваюць, што добра было б стварыць невялікую мабільную міжраённую брыгаду будаўнікоў па рамонце і перабсталяванні (па прымальных цэнах) вясковых хат у сучасныя аграсядзібы — з адпаведным узроўнем камфорту, прывабным фасадам, месцамі для адпачынку турыстаў, сучаснымі душам і прыбіральняй. І каб брыгада працавала ў кантакце з архітэктарамі, у тым ліку і ландшафтнымі. Каб аграсядзібы не былі падобныя адна на адну, а мелі свой індывідуальны твар. Вось гэта была б адчувальная падтрымка для развіцця экалагічнага і аграрнага турызму ў Віцебскай вобласці. Па словах Аляксандра Крола, такія брыгады і нават дробныя фірмы, якія спецыялізуюцца на перабудове звычайных дамоў для прыёму адпачывальнікаў, ужо дзесяць гадоў існуюць ва Украіне. Чым не прыклад для нас?

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ПРАБЛЕМА

## «НУМАР АДЗІН»...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Аднак сама пераможца не лічыць сябе асаблівай, выключнай:

— У нас усе старэйшыны працуюць актыўна. Я не лічу сябе лепшай за іншых. Гэта цяжкая праца, прычым грамадская, бясплатная. Калі разам з Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, створаным пры Савеце Рэспублікі (членам якога з'яўляецца і Вера Аляксандраўна Шлойда. — **Аўт.**), мы ездзілі ў Жлобінскі раён Гомельскай вобласці, то даведаліся, што там старасты атрымліваюць невялікую штомесячную аплату. Адпаведнае рашэнне было прынята іх аблсаветам. У нас такога, на жаль, пакуль няма.

А старэйшыны патрэбныя на вёсцы, асабліва ў аддаленых населеных пунктах, у глыбінцы, дзе людзям не даехаць да ўлады. Дэпутат — адзін на некалькі вёсак сваёй акругі, ён можа не жыць у гэтай вёсцы і не ведаць усіх яе праблем так, як іх ведае мясцовы жыхар — старэйшына. Мяне як старэйшыну ведаюць усе аднавяскоўцы. Звяртаюцца да мяне па любым пытанні (даводзіцца і ўколы рабіць мясцовым бабулькам, і стрыгчы іх, калі трэба). Калі мы не прадугледзім аплату працы старэйшыны, новае пакаленне проста не захоча ўскладаць на сябе такую грамадскую нагрузку, бо гэта шмат клопатаў і ніякага матэрыяльнага заахвочвання.

Функцыя старэйшыны — не вырашаць пытанні, а даносіць інфармацыю да мясцовых уладаў. Гэта карысна і для сельвыканкама (бо сам ён не заўсёды ведае ўсе праблемы кожнай вёскі — іх жа на тэрыторыі шмат), і для людзей.

— Прыходзяць да мяне: дапамажы, прывязі даведку (старому нямогламу чалавеку выехаць у сельвыканкам цяжка, а з перасадкай яшчэ і нязручна). Па ўсіх пытаннях, нават юрыдычных, ідуць да старэйшыны: дзе, што, як можна зрабіць, пытаюцца. Старэйшына на вёсцы — як «адно акно». Давяраюць нават падаткі заплаціць. У прыватнасці, зямельны. Было б прасцей увесці аплату праз ашчадныя касы ці праз пошту, як за камунальныя паслугі, — унесла прапанову Вера Аляксандраўна. Бо для сельвыканкамаў, асабліва ў Мінскім раёне, дзе шмат насельніцтва (напрыклад, у нашым Папярнянскім амаль 11 тысяч прапісаных жыхароў), збор зямельнага падатку — гэта вельмі вялікая нагрузка.

Як і ўсюды, ёсць на вёсцы неўладкаваныя сем'і, неахайныя гаспадары, але і з імі ў старэйшыны атрымліваецца дамовіцца. Яна для іх — аўтарытэт, і адна яе прысутнасць прымушае людзей «падцягнуцца».

— Толькі падыходжу да агароджы, як яны, убачыўшы мяне, папярэджваюць усе маё нараканні: «Верачка, абяцаем, Верачка, усё зробім, толькі не хвалюйся». Я ніколі з імі не лаюся, — прызналася старэйшына. — Проста мяне ўсе ў вёсцы ведаюць, і такім людзям бывае перада мной соромна.

Нават сваіх уласных дачок яна выхоўвала не забаронамі і абмежаваннямі, а ўласным прыкладам.

— Я ім нічога не забараняла. «Калі хочаце курыць — курыце, гэта ваша жыццё — вы за яго адказваеце, але ведайце, што гэта дрэнна ўплывае на здароўе. Гляньце на сем'і, дзе п'юць і кураць. Хочаце такую ж?» У нас у сям'і ніхто не курыць і не п'е — ні я, ні муж, ні дочкі, ні нават зяці.

Вера Аляксандраўна выступае за тое, каб дзеці заставаліся ў біялагічнай сям'і. Намагаецца пагутарыць з «цяжкімі» бацькамі, пераканаць іх змяніць лад жыцця. Але аднойчы ўзнікла сітуацыя, калі адзіным правільным выйсцем была перадача дзіцяці ў сацыяльную ўстанову. Такая сям'я жыла ў вёсцы без прапіскі. Абодва — муж і жонка — выпівалі, нідзе не працавалі.

— Першых двух сваіх дзяцей жанчына здала ў дзіцячы дом, апошняга забіралі мы. Пакуль бацькі наведваліся на бліжэйшую звалку, гадавалае дзіця яны пакідалі на ўвесь дзень прывязаным да абсалютна сляпой ляжачай бабулі...

Транспартным забеспячэннем у вяскоўцаў праблем няма: ходзяць і аўтобусы, і маршруткі (не перагружаныя, нягледзячы на суседства з дачнікамі). Аднак з-за засілля прыватных аўто на цэнтральнай (скразной) вуліцы вёскі вельмі актыўны транспартны рух, асабліва ў выхадныя. Бывае, пешаходу даводзіцца чакаць па 15-20 хвілін, каб перайсці дарогу.

— Вельмі хацелася б, каб увесь гэты транспарт хадзіў у аб'езд вёскі, — прызналася старэйшына, — ці каб хаця паклалі ў пачатку і ў канцы вуліцы «ляжачых паліцэйскіх» для абмежавання хуткасці, бо аварый на гэтай цэнтральнай вясковай дарозе (вуліцы Школьнай) шмат, машыны рэгулярна збіваюць пешаходаў, у тым ліку і дзяцей.

Вясковы магазін, дзе прадаюцца і прадукты, і нехарчовыя тавары, паводле слоў Веры Аляксандраўны, працуе нармальна. Акрамя таго, побач, у вёсцы Сёмкава, ёсць прыватныя магазіны. Узнікаюць пытанні па медыцынскім абслугоўванні. Хуткая дапамога прыязджае аператыўна, нараканняў няма. А вось будынак амбулаторыі, што ў Сёмкаве, — вельмі стары. Праўда, сёлета ў гэтым населеным пункце распачаліся работы па ўладкаванні аграгарадка, ідзе гаворка пра будаўніцтва новай амбулаторыі. І яшчэ: у самім Сёмкавым Гарадку няма аптэчнага пункта, што для мясцовых жыхароў, асабліва для састарэлых, — сур'ёзная праблема.

Так што быць старэйшынам з 8.00 да 20.00 у Веры Аляксандраўны не атрымліваецца.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

...З дачкой Надзеяй і ўнучкай Соф'яй.

У старэйшын ненармаваная нагрузка.

— У мяне ў хаце дзверы не зачыняюцца — пастаянна ідуць людзі са сваімі праблемамі, — расказала Вера Аляксандраўна. — Таму вельмі важна, каб уласная сям'я ўсё гэта разумела. Мае хатнія проста вельмі мяне любяць, таму і церпяць усю маю грамадскую нагрузку. «Калі табе гэта трэба, значыць, рабі», — кажуць. Мне заўсёды прыемна, калі атрымліваецца дапамагчы чалавеку. Я сама па жыцці — шчаслівая жанчына, і мне хочацца зрабіць шчаслівымі навакольных.

Хочацца, каб вёска наша квітнела. Цяпер у нас актыўна вядзецца жыллёвае будаўніцтва, узводзяцца новыя прыгожыя дамы, прыязджае моладзь, нават вуліца з'явілася новая — Маладзёжная. Прыемна, што вёска адраджаецца. Мае дзеці таксама будуюцца ў нашай вёсцы, і хочацца, каб умовы пражывання ў нас сталі лепшымі. Каб унукі мае жылі добра.

Сёлета Вера Аляксандраўна стала бабуляй і лічыць гэта самым ганаровым і пачэсным званнем.

— У мяне пасля нараджэння ўнучкі адкрылася другое дыханне. Газ мы агульнымі сіламі ў вёску правялі, цяпер ушчыльную займуся электрычнасцю.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# МАЙСТЭРСТВА «РАСКРУЦІЦЬ» СВАЮ ТЭРЫТОРЫЮ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

### Экалагічная прыбіральня — першая ў раёне

Гісторыя стварэння ў вёсцы Забор'е экалагічна-інфармацыйнага цэнтра вельмі падобна на гісторыю ўзнікнення «Кролавай хаты». Некалькі гадоў таму тут была закінутая гасцініца мясцовага саўгаса, якая з часам прыйшла ў заняпад. У яе засталася адна перспектыва — на знос. Але па прапанове Алы Хорань (дарэчы, адной з першых у раёне жанчын, якая разам з мужам пераабсталявала сваю хату і тэрыторыю вакол яе ў аграсядзібу) мясцовыя ўлады захавалі гэты былы «гранд-гатэль» для будучых турыстычных мэтаў, на ўсякі выпадак. Праўда, як кажуць у раёне, без вялікай надзеі на тое, што нешта добрае атрымаецца. Некалькі гадоў ішоў марудны рамонт. А сёлета, дзякуючы ўдзелу раёна ў вышэйназваным праекце па ўстойлівым развіцці, удалося атрымаць фінансаванне на стварэнне ў Забор'і экалагічна-інфармацыйнага цэнтра. Дзякуючы гэтаму прывялі ў парадак будынак, набылі тоё-сёе з аргтэхнікі, мэблі. Яшчэ трохі папрацаваць — і тут ужо можна будзе праводзіць семінары, заняткі па экалогіі, іншыя мерапрыемствы. Але фінансаванне за кошт праекта прадугледжана толькі да студзеня наступнага года, а далей самім прыйдзецца зарабляць сродкі на яго ўтрыманне.

Пра тое, што ў Забор'і ідуць у нагу з часам, сведчыць і той факт, што на дварэ цэнтра будуецца... першая ў раёне экалагічная прыбіральня. Праўда, адмысловы нямецкі ўнітаз з пластыку не атрымалася завесці (дорага), а таму мясцовыя ўмельцы ўжо зрабілі свой — з бетону. Сохне цяпер. Сёлета экалагічная прыбіральня з цудоўным відам на возера Опціна будзе здадзена ў эксплуатацыю. Можа, камусьці гэта падасца дзівацтвам, але пры масавым турыстычным засваенні раёна такія «аб'екты» будуць вельмі запатрабаваныя.

### Парады і вопыт

Міжнародны эксперт па Зялёных маршрутах Чарльз Трэйсі прыехаў у Расоны за тысячы кіламетраў — з ЗША. Ён прызнаўся, што вельмі ўражаны прыгажосцю прыроды і гасціннасцю насельніцтва. У гаспадароў аграсядзібаў, натуральна, узнікла пытанне: што ім трэба зрабіць, каб сюды паехалі амерыканцы? Трэйсі даў даволі разгорнуты адказ. Калі ў некалькіх словах, то ён параіў зрабіць вялікі — комплексны і цікавы — турыстычны маршрут, частку якога можна было б прайсці пешшу, другі адрэзак пераадолець на конях, трэці — на веласіпедах, чацвёрты — на байдарках ці каноэ. Гэта б зацікавіла яго суайчыннікаў. Яшчэ Трэйсі паведаміў, што зараз у амерыканскіх турыстаў з'явіўся інтарэс да дэгустацыі страў кухні той краіны і мясцовасці, дзе яны адпачываюць. Ён упэўнены, што нацыянальная беларуская кухня ім спадабалася б. Яшчэ амерыканцы любяць камфортна і бяспечна адчуваць сябе на адпачынку: каб не было пагрозы тэрактаў, падману і аблічвання ў рэстаранах, крамах і таксі, каб побач быў гід, каб не ўзнікала пачуцця разгубленасці і збянтэжанасці ў незнаёмай краіне. Дык чаму тады заможныя амерыканскія турысты не едуць у Беларусь? Адказ просты: вельмі мала (не больш за 10 % жыхароў) ЗША ведаюць пра турыстычныя магчымасці Беларусі ды і пра саму краіну. Калі Трэйсі гаварыў сябрам, што едзе ў Беларусь, яны казалі: «Цудоўна! А дзе гэта?».

У сваю чаргу Вольга Маханенка, прадстаўнік Лепельскага раёна, дзе аграгурызм атрымаў значнае развіццё, паведаміла, што стымуляваць інтарэс да яго ў мясцовай улады ў пэўнай ступені дапамагла паездка групы старшынь сельскіх Саветаў і старастаў вёсак у Польшчу. Там яны пазнаёміліся з досведам работы органаў мясцовага самакіравання па ўзаемадзеянні з турыстычнымі фірмамі і гаспадарамі аграсядзібаў, убачылі, як іх агульнымі намаганнямі ўдаецца «раскручваць» сваю тэрыторыю. І па словах Вольгі Маханенка, беларускія госці пераканаліся, як многа ў гэтай справе залежыць ад своечасовай падтрымкі органамі мясцовай улады.

### Кадры для аграгурызму

Даўно заўважана, што лепшыя кадры для аграгурызму — мясцовыя людзі. У Клясціцкай сярэдняй школе гавораць, што выхаванне любові да роднага краю, знаёмства школьнікаў з яго гісторыяй, краявідамі істотна ўплывае на далейшы прафесійны выбар часткі выпускнікоў. У школе ёсць музей Айчыннай вайны 1812 года. Ён у пэўным сэнсе мясцовая славутасць. Яго наведвае шмат гасцей раёна і іншаземцы. Асабліва музейнай экспазіцыяй цікавяцца французы. Экскурсіі для замежных гасцей праводзяць вучні старэйшых класаў на англійскай мове.

Мясцовая ўлада імкнецца не перашкаджаць станаўленню гэтага сектара эканомікі і па магчымасці дапамагаць яго ўмацаванню. У раёне створана ініцыятыўная група па падтрымцы турызму. У яе складзе — кіраўнікі розных службаў і арганізацый, старшыні сельскіх Саветаў. Хоць аграгурызм як з'ява пусціў свае карані ў раёне яшчэ задоўга да з'яўлення ў шырокім ужытку гэтага слова. Яшчэ з сярэдзіны 70-х мінулага стагоддзя сюды пачалі прыязджаць на адпачынак у вёскі масквічы і ленінградцы. У асноўным — прадстаўнікі навуковатэхнічнай інтэлігенцыі, выкладчыкі ВНУ. Нават адзін піцерскі прафесар штогод па некалькі месяцаў жыў у адной з вёсак аж да 80-гадовага ўзросту.

Едуць з Расіі і цяпер. Людзей па-ранейшаму вабіць амаль некранутая чалавекам прырода. А вось мінчан пакуль мала, яны кажуць, што далёка ехаць, аж 300 кіламетраў. А для расіян 600—700 кіламетраў — не адлегласць. Затое колькі можна атрымаць станоўчых эмоцый! Дастаткова сказаць, што ў раёне 192 багатыя рыбай прыродныя вадаёмы, 70 працэнтаў тэрыторыі займае хваёвы лес. Чым не выдатныя ўмовы для актыўнага адпачынку на прыродзе?

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

*Расонскі раён.*

## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое использование земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | Район кладбища «Аульс» | 0,0146 | 440100000001005988 | 2 800 000 | 280 000 | 2 005 069 | Для установки павильона № 1 ритуальных услуг |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | Район кладбища «Аульс» | 0,0140 | 440100000001005989 | 2 700 000 | 270 000 | 1 927 030 | Для установки павильона № 2 ритуальных услуг |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | ул. Томина – ул. Победы | 1,1213 | 440100000001005990 | 687 800 000 | 68 000 000 | 3 483 281 | Строительство и обслуживание торгового центра |

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-214* | м-н «Зарица-5» | 0,1265 | 440100000002006369 | 697 751 | 16 000 000 | 1 600 000 |
| 2. | Земельный участок У-215* | м-н «Зарица-5» | 0,1286 | 440100000002006370 | 680 331 | 16 000 000 | 1 600 000 |
| 3. | Земельный участок У-216* | м-н «Зарица-5» | 0,1253 | 440100000002006371 | 667 456 | 16 000 000 | 1 600 000 |
| 4. | Земельный участок У-217* | м-н «Зарица-5» | 0,1223 | 440100000002006372 | 667 455 | 16 000 000 | 1 600 000 |
| 5. | Земельный участок У-218* | м-н «Зарица-5» | 0,1186 | 440100000002006373 | 700 288 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 6. | Земельный участок У-219* | м-н «Зарица-5» | 0,1194 | 440100000002006374 | 700 288 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 7. | Земельный участок У-220* | м-н «Зарица-5» | 0,1212 | 440100000002006375 | 677 547 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 8. | Земельный участок У-221* | м-н «Зарица-5» | 0,1233 | 440100000002006376 | 703 298 | 16 000 000 | 1 600 000 |

**Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на участках отсутствуют.*

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении задатка за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона обязан течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации в городской бюджет.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 25 октября 2010 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 23 сентября по 19 октября 2010 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**

## СНАРАДЫ ЗНАЙШЛІ НА ПОЛІ

**Падчас работы на полі ў Талачынскім раёне ля вёскі Коласава мясцовыя жыхары знайшлі ў зямлі боепрыпасы.**

Выклікалі сапёраў, якія адкапалі ажно пяць артылерыйскіх снарадаў калібру 75 міліметраў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Небяспечную знаходку вывезлі ў бяспечнае месца і знішчылі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

г. ВИТЕБСК 13.10.2010

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Не завершенное строительством здание склада заполнителей бетона, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, промзона Ксты | Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, степень готовности – 100 %, стены – нет, частично поперечные перегородки – 20 %, общая степень готовности – 8,8 %, общая площадь 2350 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000030 площадью 0,1237 га для обслуживания здания производственного назначения. | 35000 | 35000 |
| 2. | Не завершенное строительством здание бетоносмесительного цеха, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Экиманьский сельсовет, в 0,4 км к востоку от деревни Ксты | Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, стены, перекрытия, степень готовности – 100 %, лестничные марши, проемы – 85 %, общая площадь 1240 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000088 площадью 0,0307 га для обслуживания здания бетоносмесительного цеха. | 35000 | 35000 |
| 3. | Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи | Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу. Назначение – для использования под производственную базу. | 35000 | 35000 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ – по лотам № 1, № 2 – Строительное республиканское унитарное предприятие «Строительно-монтажный трест № 22», телефон в Полоцке: (0214) 417295; по лоту № 3 – Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», контактные телефоны: (02133) 31333, 37637.

Условия продажи объектов недвижимости по всем лотам:

- осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест;

- запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия предоставления земельных участков:**

**по лотам № 1, № 2** – заключение победителем аукциона с Полоцким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок,

**по лоту № 1** – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта производственного назначения в срок, не превышающий двух лет;

осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

**по лоту № 2** – в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставляемый земельный участок приступить к занятию данного участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**по лоту № 3:**

- заключение победителем аукциона с Чашникским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права аренды на земельный участок, получение право удостоверяющих документов в Чашникском бюро Лепельского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

- осуществление строительства объекта в сроки, определённые проектно-сметной документацией.

**Аукцион состоится 13 октября 2010 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 12.10.2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 13.10.2010 с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903000021,** в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, **код 150801307**. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», **УНП 300002495.**

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неисполъуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельных участков заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельных участков.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

НАРОДНАЯ АКЦЫЯ

## У ВІЦЕБСКУ — СУБОТНІК ЗА СУБОТНІКАМ

**У Віцебску правялі два суботнікі запар па добраўпарадкаванні тэрыторый. Што паказальна, кіраўнікі вобласці і горада, дэпутаты таксама папрацавалі з рыдлёўкай у руках.**

Спачатку добраўпарадкоўвалі набярэжную ракі Віцьба, дзе ствараецца зона адпачынку. Потым высаджвалі дрэвы ў адным з гарадскіх паркаў. І што цікава, на другі па ліку суботнік запрасілі папрацаваць журналістаў, у тым ліку і з рэспубліканскіх СМІ. А чаму б і не? Пасля завяршэння працы адказныя асобы вырашылі даць назву алеі, якую высадзілі мае калегі, — «Алея журналістаў».

Суботнікі праводзяцца ў межах месячніка па добраўпарадкаванні. Акрамя гэтага, у Віцебску запланавалі завяршыць асноўныя будаўнічыя работы ў гістарычным цэнтры горада: добраўпарадкаванне берагоў ракі Віцьба, будаўніцтва лесвіцы да Свята-Успенскага храма і гэтак далей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Зімаваць лепш удваіх...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Першае жытло для сумеснага пражывання размясцілі ў вёсцы Тарчылава. Тут шэсць гадоў таму ў будынку былога дзіцячага садка абсталявалі аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх састарэлых, дзе пражывае цяпер 27 чалавек. У параўнанні з інтэрнатам, дзе знаходзяць прытулак сотні людзей, гэта невялікая сядзіба з агародам, цяпліцамі, садам, гаспадарчымі пабудовамі, і выглядае яна больш прывабна. Непадалёку абсталяваны і першы дом сумеснага пражывання на дваіх жыхароў. Гэта зручна, бо пажылых людзей будуць апекаваць спецыялісты з аддзялення кругласутачнага знаходжання.

Каб абсталяваць такі дом, спатрэбіліся сродкі. З дзяржаўнага бюджэту дадаткова на гэтыя мэты ніхто не збіраўся іх выдаткоўваць. Таму звярнуліся да кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства «Вусце», на тэрыторыі якога знаходзіцца вёска Тарчылава. Такім чынам упарадкавалі першае жытло. Побач з ім стаяць яшчэ два нежылыя дамы, якія па меры неабходнасці таксама плануецца абсталяваць пад сумеснае пражыванне людзей. Праўда, пры ўмове, калі ўласнік дамоў — сельгаспрадпрыемства «Вусце» — перадасць іх раённаму ўпраўленню па працы і сацыяльнай абароне раёна.

Як падкрэсліла Вера Астапенка, новыя пачынанні сацыяльнай службы патрабуюць грошай. На дадатковае дзяржаўнае забеспячэнне спадзявацца не выпадае, бо ўсё, што можна, ужо размеркавалі. Таму ва ўпраўленні скарыстоўваюць любую магчымасць, каб знайсці спонсара на тэрыторыі свайго раёна. Актыўна працуюць і з рэспубліканскімі фондамі, якія маюць выхад на замежжа. Такім чынам наладзілі сувязі з галандцамі, італьянцамі, амерыканцамі. У выніку замежнікі ахвотна дзеляцца вопытам работы па ўладкаванні жыцця інвалідаў і пажылых адзінокіх людзей, час ад часу дапамагаюць і матэрыяльна. Італьянцы, напрыклад, далі грошы на будаўніцтва лазні. За кошт замежных спонсараў абсталявалі пакой псіхалагічнай разгрузкі ў пасёлку Бабінічы для інвалідаў. Галандцы дапамагаюць пасяўным матэрыялам. Дзякуючы ім ураджай цыбулі, буракоў, капусты ў Тарчылаве заўсёды багаты — для сталоўкі хапае агародніны на год.

Вось так па сваёй ініцыятыве супрацоўнікі сацыяльнай службы спасцігаюць перадавыя метады работы і ствараюць палепшаныя ўмовы жыцця для адзінокіх пажылых людзей.

**Вольга ШУТАВА, фота аўтара.**

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# «ЧЫТАЮ, ПЕРАКЛАДАЮ І СВАБОДНА РАЗМАЎЛЯЮ!»

**Не сакрэт, што з выпускнікоў савецкай школы больш-менш прымальным валоданнем замежнай мовы маглі пахваліцца толькі адзінкі, і гэта нягледзячы на выдатныя адзнакі па гэтай дысцыпліне ў школьных атэстатах. А ў анкетах, адказваючы на пытанне «Ваша веданне замежнай мовы» большасць нашых грамадзян пісалі прыкладна так: «Чытаю і перакладаю са слоўнікам». Аднак сёння перад беларускай сістэмай адукацыі пастаўлена канкрэтная задача — кожны выпускнік на выхадзе са школы павінен свабодна размаўляць на адной з замежных моў. А праз тры гады (у 2012-2013 навучальным годзе) у школах будзе ўведзены яшчэ адзін абавязковы выпускны экзамен — па замежнай мове ў вуснай форме.**

— Як гэта ні крыўдна канстатаваць, але зараз школа да вуснага экзамену па праверцы моўнай кампетэнцыі навучэнцаў яшчэ не падрыхтаваная, — **прызналася на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля БАРАНАВА.** — Навучыць свабодна размаўляць на замежнай мове выпускніка агульнаадукацыйнай школы, дзе замежная мова вывучаецца толькі дзве гадзіны ў тыдзень, немагчыма. Гэта пацвярджае не толькі беларуская, але і сусветная практыка. Каб пачаць размаўляць на замежнай мове, ёй трэба пастаянна карыстацца, неабходна пастаянна падтрымліваць і развіваць свае моўныя навыкі...

**Менавіта па гэтай прычыне з 1 верасня ва ўсіх тыпах агульнаадукацыйных устаноў з'явілася дадатковая гадзіна, прызначаная для вывучэння замежных моў. У звычайных школах замежная мова будзе цяпер вывучацца з 3-га па 11-ы класы 3 гадзіны ў тыдзень. У гімназіях — з 5-га па 9-ты класы — у аб'ёме 5 гадзін у тыдзень. У 10-х і 11-х філалагічных класах гімназій і ліцэяў для вывучэння замежных моў прадугледжана таксама 5 гадзін у тыдзень, а ў класах фізіка-матэматычнага, хімікабіялагічнага і грамадазнаўчага напрамкаў ліцэяў і гімназій — 4 вучэбныя гадзіны.**

— Такім чынам, на працягу школьнага жыцця вывучэнню замежнай мовы цяпер будуць прысвячацца 945 акадэмічных гадзін, — **паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО.** — Скажам, у Расіі вывучэнне замежных моў распачынаецца на год раней, з другога класа, але ў тыдзень на іх вывучэнне адводзяцца толькі 2 гадзіны. Такім чынам, за школьныя гады «набягаюць» толькі 933 акадэмічныя гадзіны, ва Украіне — 472 гадзіны, а ў Казахстане — 576 гадзін. Дабавіць яшчэ адну гадзіну было зусім няпроста, паколькі давялося павялічваць абавязковую нагрузку на школьнікаў і ўзгадняць гэта пытанне з медыкамі. Было прынята таксама рашэнне аб раздзяленні ўсіх класаў на ўроках замежнай мовы на тры падгрупы (ад 6 да 9 вучняў). Гэта мае прынцыповае значэнне для развіцця гутарковых навыкаў у школьнікаў: у настаўніка амаль удвая павялічваецца час для непасрэдных стасункаў з кожным вучнем у групе.

Па словах Наталлі Баранавай, раней галоўны акцэнт на ўроках замежнай мовы рабіўся на работу з тэкстамі: школьнікаў вучылі чытаць, перакладаць тэкст са слоўнікам, шмат часу адводзілася вывучэнню граматыкі. Але развіццё гутарковай мовы на першым месцы не стаяла. Цяпер падыходы да вывучэння замежных моў карэнным чынам змяніліся: дзейная сёння сістэма вывучэння замежных моў арыентаваная якраз на авалоданне камунікатыўнай кампетэнцыяй.

— Калі мы працавалі над новай канцэпцыяй вывучэння замежнай мовы, то паспрабавалі даказаць, што вывучэнне замежнай мовы патрабуе камунікатыўна-арыентаванага падыходу да яе выкладання, — патлумачыла Наталля Баранава. — На падставе гэтай канцэпцыі мы стварылі новыя адукацыйныя стандарты па замежных мовах і вынеслі іх на абмеркаванне нашых калег у Расіі, Украіне, Літве, Польшчы, Германіі і Вялікабрытаніі. І паўсюдна атрымалі высокую ацэнку нашай работы. Пасля гэтага мы прыступілі да распрацоўкі новага пакалення вучэбных праграм па замежных мовах і новага пакалення падручнікаў, якое пакуль не зусім звыклае для школы. Гэта значыць, што калі раней падручнікі арыентавалі і настаўніка, і вучня да работы на ўроку над тэкстам, над лексічнымі і граматычнымі правіламі і нормамі, то новы падручнік акцэнтуе ўвагу на працы вучня і настаўніка над маўленнем. Тэкст прачытваецца, але далей работа ідзе ўжо не з тэкстам, а вакол яго. Мы ўпэўненыя, што тры гадзіны ў тыдзень у школе і пяць гадзін у гімназіі дастатковыя для таго, каб забяспечыць пераход вучэбнай інфармацыі з аператыўнай памяці вучня ў доўгатэрміновую, чаго нам не ўдавалася дасягнуць, калі ў нас былі ўсяго два ўрокі ў тыдзень. Ад урока да ўрока вучань паспяваў усё забыцца, а настаўнік быў вымушаны хадзіць па замкнёным коле. Тым больш што нашы дзеці вымушаны навучацца замежнай мове ў штучным моўным асяроддзі: практычна нідзе за сценамі школы яны не чуюць замежную мову. Менавіта па гэтай прычыне **падчас работы над новай канцэпцыяй вывучэння замежных моў у школе вялася размова аб стварэнні адпаведнага моўнага асяроддзя: гэта можа быць нейкі вучэбны тэлеканал, выпуск дзіцячых фільмаў на замежных мовах, выданне арыгінальных, але адаптаваных да магчымасцяў школьнікаў дзіцячых кніжак і гэтак далей.**

Наталля Баранава расказала журналістам, што спецыялістамі лінгвістычнага ўніверсітэта ўжо падрыхтаваныя сцэнарыі камунікатыўных урокаў для настаўнікаў замежнай мовы. Не сакрэт, што поспех у вывучэнні школьнікамі замежнай мовы ў немалой ступені залежыць ад прафесійнага майстэрства настаўніка, бо, акрамя стасункаў з настаўнікам, у дзіцяці больш няма магчымасці пачуць замежную мову. Для таго, каб дзіця пачало размаўляць, настаўнік сам павінен валодаць сучаснымі гутарковымі нормамі. Зараз завяршаецца распрацоўка электронных дыдактычных матэрыялаў, прысвечаных лексіка-граматычнаму практыкуму, якімі змогуць карыстацца самастойна ўсе старшакласнікі пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Па даручэнні Міністэрства адукацыі вядзецца работа над фарматам абавязковага экзамену па замежнай мове.

— Аднак хачу звярнуць вашу ўвагу на тую акалічнасць, што вучэбная праграма па замежнай мове, якая пачала вывучацца з 1 верасня гэтага года, тая ж, што была і год назад, — дадала Наталля Баранава. — Мы не ўкаранілі 1 верасня новую вучэбную праграму. Новая канцэпцыя выкладання замежнай мовы дзейнічае ўжо не першы год. З дабаўленнем яшчэ адной гадзіны і дзяленнем класаў на тры падгрупы змяніліся толькі ўмовы для глыбіні засваення вучэбнай праграмы. Укараненне камунікатыўнага метаду відазмяняе ўрок. Нават адзнака тут павінна выстаўляцца інакш. **На камунікатыўным уроку вучань можа дапускаць памылкі. Галоўнае — каб ён не маўчаў, а размаўляў, дзіця трэба ацэньваць па яго актыўным удзеле ва ўроку. І дамашнія заданні павінны мець трэніровачны, а не творчы характар, замацоўваць тое, што было зроблена на школьным уроку. Але ў некаторых школах настаўнікі ўмудраюцца нават у 4-м класе даваць дзецям творчыя заданні, напрыклад, даручаюць вучням напісаць дома маленькае сачыненне на замежнай мове. Хачу папярэдзіць, што гэта — вялікая памылка.** Увогуле менавіта ад школьных настаўнікаў і метадыстаў на месцах у многім будзе залежыць эфект ад укаранення новай канцэпцыі выкладання замежнай мовы, заснаванай на развіцці камунікатыўнай кампетэнцыі.

Дарэчы, з 1 кастрычніка на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта пачне працаваць кансультацыйны пункт для настаўнікаў замежных моў, куды яны змогуць звярнуцца па любыя тлумачэнні і дапамогу. З мінулага года ва ўніверсітэце практыкуюцца і каротказрміновыя курсы па заяўках адной асобна ўзятай школы. «На жаль, у нашых настаўнікаў не заўсёды ёсць магчымасць падтрымліваць уласны ўзровень валодання замежнай моваў, і мова школьнага настаўніка «псуецца», калі ён размаўляе на ёй толькі ў сценах школы са сваімі вучнямі. Таму ўсім настаўнікам неабходна рэгулярна павышаць сваю кваліфікацыю — і метадычную, і моўную. Паверце, што моўная практыка мае для педагогаў выключнае значэнне», — падкрэсліла Наталля Баранава.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Наталля МАРЧАНКА:

# «МЯРКУЮ, ШТО ПАРАДУЕМ БАЛЕЛЬШЧЫКА»

*Сёння на чэмпіянаце свету па баскетболе ў Чэхіі беларускі правядуць першы матч*

**УЧОРА ў чэшскім Остраве стартаваў чэмпіянат свету-2010, дзе выступіць і наша нацыянальная каманда. Пра тое, што ў нас ёсць жаночы баскетбол, мы даведаліся ў 2007-м, калі нашы дзяўчаты сталі бронзавымі прызёрамі чэмпіянату Еўропы. Праз год, на Алімпіядзе-2008, куды беларускія баскетбалісткі трапілі ўпершыню, яны дайшлі да чвэрцьфіналу. У 2009 годзе на Еўропе падапечныя Анатоля Буяльскага дабраліся да паўфіналу і занялі ў выніку чацвёртае месца. Вось так нашы баскетбалісткі сталі адной з самых паспяховых камандаў. Праўда, трэба дадаць, яшчэ прыгожых і скандальных. Яны былі першымі, хто ўсёй камандай распранууся для календара адной з кандытарскіх фабрык. На гэтым чэмпіянаце свету нашы прыгажуні абяцаюць вызначыцца сапраўднай рэвалюцыяй у галіне стылю. Літоўская кампанія TUTA распрацавала для беларускай каманды новую форму. На пляцоўку нашы дзяўчаты выйдуць у сукенках, якія заменяць звыклыя шорты і майкі. Наша нацыянальная каманда стане першай, хто выступіць у сукенках на чэмпіянаце свету. Хочацца, вядома, спадзявацца, што не толькі формай запомняцца на гэтым турніры беларускі. Чаго чакаць ад беларускай каманды на чэмпіянаце свету, мы спыталі ў нашага нязменнага лідара Наталлі Марчанкі.**

***— Наталля, сур'ёзных турнірных задач перад вамі быццам бы і не стаіць, бо толькі адна пуцёўка на Алімпіяду разыгрываецца на гэтым турніры, і атрымае яе пераможца...***

— Як заўсёды, мы едзем толькі перамагаць, паказваць дастойную гульню. Перш за ўсё, хочацца атрымаць асалоду ад атмасферы — гэта топ-турнір, на якім мы раней не выступалі. На жаль, толькі пераможца трапляе на Алімпіяду, таму будзем старацца проста добра выступіць. Усё-такі мы робім баскетбольную гісторыю нашай краіны. Ужо не першы год нясём на сваіх плячах гэтую адказнасць. Мяркую, што парадуем балельшчыка.

***— Перад чэмпіянатам свету ў вас з'явіўся генеральны спонсар — кампанія «Мілавіца», нядаўна адбылася ўрачыстая прэзентацыя новай формы каманды... Адчуваецца, што да баскетбола расце ўвага...***

— Хочацца верыць, што не толькі формай мы прыцягнем увагу да сябе. Увагі многа не бывае, мы ўсё яшчэ ёй абдзеленыя. Так, ёсць «Мілавіца», з'явіліся яшчэ спонсары, але гэта міззер у параўнанні з відамі спорту, больш любімымі не толькі народам, але і дзяржавай. У нас усё роўна дзе-небудзь абавязкова ўзнікаюць праблемы — то фармакалогія, то транспарт, то яшчэ штосьці. І гэта вельмі крыўдна: не першы год мы гуляем на такім узроўні, і горка робіцца ад таго, што даводзіцца хадзіць і выпрошваць штосьці.

***— Тым не менш вельмі карысна мець у генеральных спонсарах вытворцу жаночай бялізны.***

— Бялізну нам не дарылі. Самы прыемны падарунак — матэрыяльная дапамога, якую пералічылі на рахунак федэрацыі. І біг-борды з Таццянай Троінай, якія ўпрыгожваюць Мінск. Будзем спадзявацца, што такія акцыі таксама папулярызуюць наш від спорту.

***— Вы таксама ўдзельнічалі ў рэкламных здымках...***

— А ім больш падышла Таццяна. Мы адна каманда, і галоўнае, каб быў вынік. Мы не пасварыліся з-за гэтага.

***— Фотаздымкі атрымаліся больш мадэльнымі, чым спартыўнымі. Чаму «Мілавіца» не захацела выкарыстаць вашы баскетбольныя дадзеныя і зняць, напрыклад, у зале з мячом, падчас кідка ў кальцо?***

— Ёсць пэўныя нюансы ў рэкламе бялізны, там, здаецца, нельга дэманстраваць усё цела, толькі плечы. Здымалі тое, што яны маглі сабе дазволіць у рэкламе. А ўвогуле ў нас ужо быў вопыт здымак — мы фатаграфаваліся для календара «Спартака». Я кожнай жанчыне парэкамендавала б патраціць грошы на добрага фатографа, візажыста — гэта моцна падымае самаацэнку і разняволвае.

***— Пасля здымак для гэтага календара зусім не складана рашыцца выходзіць на пляцоўку ў сукенках...***

— Мы цэлы год гуляем у сукенках — у нас быў трэніровачны камплект. Форма вельмі зручная — не занявольвае рухі, прыцягвае ўвагу балельшчыкаў. Чаму б і не? Ёсць каманды, якія гуляюць у сукенках у сваіх рэгулярных чэмпіянатах. Так што мы не першыя. Мы першаадкрывальнікі толькі на ўзроўні зборных. Каманды Аўстраліі і Бразіліі, праўда, выступаюць у камбінезонах, але гэта іншая гісторыя. Мы заўсёды былі першаадкрывальнікамі. У нас і спадніцы ў першых з'явіліся замест брыджаў і шортаў. Мы ж жаночая зборная — чаму б і не прыцягнуць мужчынскую ўвагу?

***— На леташнім чэмпіянаце Еўропы вам давялося выходзіць на пляцоўку ў масцы. Зараз бачна, што праблемы з носам прайшлі бясследна. Звярталіся да пластычных хірургаў?***

— Мне проста пашанцавала. Пералом аказаўся не такі сур'ёзны, бывае і горш. Так што, за гэта я ўдзячная дзяўчыне з літоўскай каманды — яна зламала мне нос ювелірна. Але давайце не будзем пра траўмы перад чэмпіянатам — не вельмі добрая прыкмета...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Наша каманда згуляе ў кварцэце А разам з кітаянкамі, канадкамі і аўстралійкамі. У наступны этап выйдуць тры каманды з кожнай групы. Усяго ў чэмпіянаце свету возьмуць удзел 16 зборных: Чэхія, ЗША, Францыя, Расія, Іспанія, Беларусь, Грэцыя, Аўстралія, Кітай, Японія, Паўднёвая Карэя, Аргенціна, Бразілія, Сенегал, Малі. Расклад гульняў у кварцэце А па беларускім часе:

23.09.14.00. Беларусь—Кітай
24.09.16.15. Беларусь—Аўстралія
25.09.19.00. Беларусь—Канада.

Вось які склад абраў для турніру Анатоль Буяльскі. Абаронцы: Наталля Марчанка («Дынама», Масква), Наталля Ануфрыенка («Гарызонт», Мінск), Аляксандра Тарасава («Ружомберак», Славакія), Святлана Валько («Гарызонт», Гродна); нападаючыя: Таццяна Троіна («Надзея», Расія), Наталля Трафімава («Пулкавіца», Польшча), Юлія Дурэйка («Гарызонт», Мінск), Таццяна Ліхтаровіч («Гарызонт», Мінск); цэнтравыя: Марына Крэс («Афінакас», Грэцыя), Алена Леўчанка («Атланта», ЗША), Вікторыя Гаспер («Гарызонт», Мінск), Настасся Верамеенка («Надзея», Расія).

Даслоўна

# «ПУЦІН І МЯДЗВЕДЗЕЎ НЕ ПАГАДЗІЛІСЯ Б НА АБ'ЯДНАННЕ ГЕРМАНІІ»

**ПРОЗВІШЧЫ тандэма, які кіруе Расіяй, усплылі нечакана — у час дыскусіі пасля змястоўнай прамовы ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры віцэ-прэзідэнта бундэстага ФРГ Вольфганга Цірээ.**

Гэты вядомы нямецкі палітык знарок прыехаў да нас, каб паўдзельнічаць у пятым дыспуце памяці былога прэзідэнта Германіі Іаханэса Рау. Вольфганг Цірээ выступіў у якасці асноўнага дакладчыка аб ролі грамадскіх арганізацый у працэсе аб'яднання Германіі. Нагадаем, праз дзесяць дзён наш стратэгічны партнёр у Еўропе будзе адзначаць 20-годдзе з дня аб'яднання нямецкага народа ў адну дзяржаву. Гэта юбілейная дата і абумовіла тэму даклада Вольфганга Цірээ. Такія штогадовыя дыспуты ўжо сталі традыцыйнымі. На кожным з іх заўсёды выступае нехта з ліку вядомых нямецкіх палітыкаў з дакладам на актуальную тэму з мэтай інфармавання беларускай грамадскасці аб ініцыятывах у знешняй і ўнутранай палітыцы краіны з улікам спецыфікі нямецкай гісторыі. У гэтым сэнсе выступленне Вольфганга Цірээ цалкам адпавядала духу і літары дыспуту.

На працягу ўсяго свайго выступлення ён трымаў аўдыторыю ў напружанні. І не дзіўна. Дакладчык выдатна валодаў матэрыялам, бо сам быў непасрэдным удзельнікам тых падзей, якія прывялі да разбурэння сумнавядомай Берлінскай сцяны, мірнага і добраахвотнага ўваходжання ГДР у склад ФРГ. Таму, натуральна, да прамоўцы ўзнікла шмат пытанняў. У прыватнасці, эксперт «Звязды» па палітычных і фінансава-эканамічных праблемах прафесар Белдзяржуніверсітэта Міхаіл Кавалёў спытаў: калі б уявіць, што 20 гадоў таму ў Крамлі гаспадарылі Пуцін і Мядзведзеў, то далі б яны згоду, як Гарбачоў, на аб'яднанне Германіі?

Вольфганг Цірээ задумаўся і адказаў: «Падвяргаю сумненню. Наўрад ці гэта было б магчымым». Потым ён шчыра патлумачыў, што аб'яднанне адбылося ў многім дзякуючы правалу гарбачоўскай перабудовы ў СССР. Калі б яна аказалася паспяховай, то ў Міхаіла Сяргеевіча не было б матывацыі на згоду адносна лёсу ГДР. Эксперт «Звязды» таксама спытаў пра тое, ці былі дапушчаныя істотныя пралікі ў працэсе аб'яднання. Напрыклад, на думку Міхаіла Кавалёва, памылкай стала выгнанне з універсітэтаў ГДР вядучых прафесараў, сусветна вядомых навукоўцаў толькі за тое, што яны былі членамі кіруючай камуністычнай партыі. Іх месца занялі выхадцы з Заходняй Германіі, аднак яны не сталі паўнацэннай заменай тых бліскучых вучоных. У выніку пацярпелі ўніверсітэты і іх студэнты.

На гэта Вольфганг Цірээ сумна сказаў, што ён мог бы доўга гаварыць пра пралікі і памылкі тых часоў, але няма рэвалюцый без замены элітаў. Ды і тады было цяжка прадбачыць усе наступствы рашэнняў, якія прымаліся часам аператыўна. Таму былі дапушчаныя перагібы, якія цяпер хваравіта ўспрымаюцца. Увогуле факт аб'яднання Германіі ён назваў вялікім цудам, але не падарункам, які зваліўся з неба. Гэта мірная рэвалюцыя, па словах Вольфганга Цірээ, таксама стала вынікам уздзеяння дэмакратычных працэсаў у Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Савецкім Саюзе.

Спыталі ў Вольфганга Цірээ і пра тое, ці ўдалося за 20 гадоў пераадолець адрозненні, часам істотныя, у жыцці і ментальнасці паміж усходнімі і заходнімі немцамі? Дакладчык быў шчырым: многія ўсходнія немцы вельмі расчараваныя жыццём пасля аб'яднання, у іх моцнае пачуццё настальгіі па былых часах, калі практычна ў ГДР не было беспрацоўя. Гэтыя настроі Вольфганг Цірээ патлумачыў тым, што ў іх, немцаў з Усходу, няма такога дэмакратычнага ўспрыняцця рэчаіснасці, як у заходніх немцаў. Акрамя гэтага, сёння ў апошніх больш высокія заробкі і пенсіі. Магчыма, не выключае Вольфганг Цірээ, працэс яднання немцаў працягнецца яшчэ доўга. Карацей, адбылася цікавая і насычаная абменам думкамі і поглядамі размова.

**НАША ДАВЕДКА**

Вольфганг Цірээ нарадзіўся і вырас у ГДР. Сваю палітычную кар'еру пачаў у перыяд аб'яднання Германіі, тады Цірээ стаў актыўным удзельнікам руху «Новы форум», членам Народнай палаты ГДР і старшынёй фракцыі партыі СДПГ. З кастрычніка 1990-га з'яўляецца дэпутатам бундэстага, дзе з 1998 па 2005 год займаў пост прэзідэнта. З кастрычніка 2005 года ён працуе віцэ-прэзідэнтам бундэстага.

Думаецца, невыпадкова намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валерый Варанецкі адзначыў, што вывучэнне досведу рэфармавання Германіі пасля 1990 года ўяўляе вялікую цікавасць для нашай краіны. Бо павышэнне эканамічнай канкурэнтаздольнасці Беларусі ва ўмовах глабалізацыі аб'ектыўна патрабуе ўкаранення новых механізмаў рэгулявання эканомікі. Намеснік міністра таксама даў адказ тым апанентам, якія лічаць, што грамадзянская супольнасць у нас развіваецца марудным тэмпамі. На яго погляд, гэта не адпавядае рэчаіснасці. «Прагрэс у гэтай сферы відавочны», — сказаў Валерый Варанецкі. Ён прывёў некалькі прыкладаў на карысць сваёй думкі. На дзяржаўным узроўні адбываецца паступовая эвалюцыя агульнага ўспрыняцця няўрадавых арганізацый як паўнапраўных партнёраў у рашэнні актуальных праблем і задач.

Напрыканцы свайго выступлення Вольфганг Цірээ сказаў, што яго радуе накіраванасць Беларусі на паляпшэнне супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам. Але пры гэтым папярэдзіў: ЕС не з'яўляецца эканамічнай супольнасцю, гэта, хутчэй, грамадства каштоўнасцяў, дзе няма агульнага пераканання. Таму з ЕС нельга весці перамовы накшталт камерцыйных.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## КУПЭЙНЫ КРАДЗЕЖ

**У купэйным вагоне цягніка Віцебск — Брэст у 48-гадовага пасажыра — жыхара Кобрына — зніклі 200 долараў, столькі ж украінскай валюты, пашпарт і банкаўская пластыкавая картка.**

Высветлілася, што, калі поезд ехаў паміж Оршай і Талачыном, усё гэта скраў другі пасажыр. Злодзей скарыстаўся тым, што ягоны спадарожнік мірна спіць, і скраў кашалёк з кішэні чужой курткі. Міліцыянеры затрымалі злодзея ўжо на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Канфіскавалі ў яго 150 чужых долараў. Куды падзявай астатнія грошы і іншае —устанаўліваюць. У дачыненні да 31-гадовага крымінальнага пасажыра — беспрацоўнага жыхара Полацка — заведзена крымінальная справа.

## З'ЕХАЎ НА ЧУЖЫМ АЎТО Ў КЮВЕТ

Жыхар Шумілінскага раёна паведаміў у міліцыю пра тое, што нехта ноччу без дазволу паехаў на ягоным аўто «ГАЗ — 4301», які стаяў ля дома. Гадзін праз шэсць аўтамабіль знайшлі ў кювеце. Зразумела, пашкоджаны. Супрацоўнікі дзяржаўтаінспекцыі высветлілі, што 25-гадовы беспрацоўны спакойна адчыніў дзверы аўто, якія чамусьці былі не зачыненыя, падабраў ключы да замка запальвання машыны і паехаў. Заведзена крымінальная справа. Аўто яго ўладальніку вярнулі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПАЧУЦЬ ГОЛАС ГВАРНЭРЫ

**Скрыпка, якую ў 1673 годзе вырабіў італьянскі майстар Андрэа Гварнэры, цяпер будзе жыць у Мінску.**

Яе набыла Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі ў адной лонданскай фірмы. Пра суму дамовы не паведамляюць. Цана на такія ўнікальныя інструменты зусім не маленькая. Аднак яны таго каштуюць!!!

Унікальны музычны інструмент цяпер загучыць у руках беларускіх талентаў. Але гэтае права трэба заслужыць.

Вялікімі скрыпачамі не нараджаюцца — імі становяцца. Іх робяць выкладчыкі, такія, як Эдуард Кучынскі, прафесар кафедры скрыпкі Беларускай акадэміі музыкі. Іх выхоўваюць доўгія і самаахвярныя заняткі. Іх загартоўваюць міжнародныя конкурсы... Іх робіць любімы інструмент, які здольны перадаць усе пачуцці самога музыканта. У Беларусі апошнім часам з'явіліся цудоўныя скрыпачы. Яны нават засведчылі пра сябе на конкурсах — з тымі інструментамі, да якіх прывыклі, у якіх ужо ведалі моцныя і слабыя бакі. Але для сапраўднага бляску ім можа трошкі не хапала... Выдатнай скрыпкі. Былі моманты, калі нашым маладым музыкантам Арцёму Шышкову і Уладзе Беражной выпадала іграць на цудоўных скрыпках славутых майстроў, якія спецыяльна дастаўляліся ў Мінск на адзін канцэрт, аднак пасля выступлення іх даводзілася вяртаць уладальніку.

І вось скрыпка Гварнэры прыехала ў Мінск! І што самае прыемнае — тут і застанецца. Славуты італьянскі майстар зрабіў яе больш за 300 гадоў таму. Так, скрыпкі столькі жывуць. А выдатныя інструменты ў такім узросце ўсё гэтак жа цудоўна гучаць. Да скрыпкі Гварнэры набылі смык, выраблены ў другой палове XIX стагоддзя майстрам Генры. Сапраўднасць інструмента і смыка пацверджана сертыфікатамі. Стан інструмента, яго захаванасць, якасць рэстаўрацыі, гукавыя якасці вывучаў расійскі эксперт Міхаіл Гаранок, які з'яўляецца дырэктарам Дзяржаўнай калекцыі ўнікальных музычных інструментаў, і прафесар Эдуард Кучынскі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Цяжкаатлет Арамнаў у трэці раз аказаўся за рулём нецвярозым

*А ў допінг-пробе алімпійскага чэмпіёна знайшлі сляды марыхуаны?*

**Пераможца Алімпіяды ў Пекіне па цяжкай атлетыцы Андрэй Арамнаў у трэці раз затрыманы за рулём у нецвярозым стане.**

Год таму спартсмен быў пазбаўлены правоў за два папярэднія выпадкі, калі ён кіраваў сваім БМВ у стане алкагольнагаап'янення. Тады алімпійскага чэмпіёна ў выхаваўчых мэтах пазбавілі прэзідэнцкай стыпендыі (атлет нават скардзіўся на адсутнасць фінансаў на тое, каб наведаць цырульню), спартсмен быў выключаны з унутраных войскаў. Андрэй, здавалася б, усё зразумеў і раскаяўся... Але, як паведамляе «Прессбол», 2 жніўня Андрэй Арамнаў кіраваў аўтамабілем Audi-TT (машына належыць сяброўцы спартсмена) зноў нецвярозым. Ад медыцынскага агляду цяжкаатлет адмовіўся. 9 жніўня справа была перададзеная пракурору для накіравання ў суд.

Акрамя таго, як паведамляе «Прессбол» са спасылкай на сайт «Польская штанга», у допінг-пробе Арамнава, якую ўзялі пасля красавіцкага чэмпіянату Еўропы, які праходзіў у Мінску (там Андрэй заваяваў залаты медаль), былі знойдзеныя сляды марыхуаны.

Але марыхуана забароненая толькі ў перыяд спаборніцтваў, так што за гэта алімпійскага чэмпіёна наўрад ці пакараюць. А вось за паўторнае кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане яму можа пагражаць арышт тэрмінам да 6 месяцаў або папраўчыя работы тэрмінам да 2 гадоў. У гэтым выпадку Арамнаў прапусціць Алімпійскія гульні-2012 у Лондане.

Зараз Андрэй не прымае ўдзел у чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы, бо адбывае паўгадавую дыскваліфікацыю за допінг усё ў той жа красавіцкай пробе. Сам атлет ужыванне марыхуаны адмаўляе: «Нічога сабе! Першы раз чую, марыхуану ніколі ў жыцці не каштаваў, калі шчыра». Пакуль спартсмен трэніруецца самастойна, тэрмін дыскваліфікацыі заканчваецца 6 снежня.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества состоится 26 октября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**
**Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, конт. тел. (8017) 200 20 89, каб 227.**

**На открытый аукцион выставляется:**

| № лота | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| Предмет открытого аукциона | Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Здание специализированное для общественного питания (инвентарный номер 500/С-15244) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| Место нахождения недвижимого имущества | г. Минск, промузел «Шабаны», ул. Инженерная, 3 | г. Минск, пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50, корп. 2 |
| Начальная цена предмета открытого аукциона, руб. | 8 666 610 004 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 8 148 289 410 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля) | 321 753 860 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 138 350 000 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 183 403 860 белорусских рублей) |
| Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 866 661 000 белорусских рублей, до подачи заявления на проведение аукциона, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества | 32 175 400 белорусских рублей, до подачи заявления на проведение аукциона, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества |
| Продавец недвижимого имущества | Государственное производственное объединение «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», 220037, г. Минск, ул. Червякова, 25, тел. (8017) 233 26 64, 233 10 59 (осмотр) | Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220 037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80 (осмотр) |
| Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества | Общая площадь – 2,5432 га. Кадастровый номер земельного участка – 500000000002006709. Срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,2180 га (из них 0,2180 га с ограничениями в использовании – водоохранная зона Слепянской водной системы), кадастровый номер земельного участка – 500000000001004107, срок аренды – 5 лет |
| Арендодатель земельного участка | Минский городской исполнительный комитет | |
| Характеристика недвижимого имущества | Начало строительства – 1988 год; размеры в осях – 162,5 м х 54 м; отдельностоящее, одноэтажное здание включающее в себя отделение барабанных сеток, отделение фильтров и галерею трубопроводов, служащих для подачи, распределения и отвода сточных вод на дополнительную доочистку, насосную станцию, административно-бытовой корпус, помещения трансформаторной подстанции | Общая площадь – 811,5 кв.м., год постройки – 1960. Отдельностоящее, одноэтажное здание в неудовлетворительном техническом состоянии, нет оконных и дверных блоков; стены кирпичные; разрушены системы отопления, холодного и горячего водоснабжения. Длительное время не использовалось |
| Условия использования недвижимого имущества | Победителю аукциона получить в установленном порядке разрешение на разработку (корректировку) проектно-сметной документации по строительству | Для дальнейшего использования в соответствии с градостроительными регламентами здания под общественную функцию (общественное питание, объект торговли, культурно-бытовое назначение, административно-хозяйственное назначение) |
| Условия использования земельного участка | Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества с условием освоения данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией. Беспрепятственный доступ к земельному участку победителю аукциона обеспечивает КУП «Минскводоканал» | Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества |

Порядок проведения открытого аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**К участию в открытом аукционе допускаются:** граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в открытом аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в открытом аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

**Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 22 октября 2010 года включительно.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только од

# Калектыў ПУП «Палескія сыры»

# ПРАЦУЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ РАДАВАЦЬ ПАКУПНІКОЎ СМАЧНАЙ І ЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫЯЙ

Прыгожы сімвал прадпрыемства — сямейка кароў — з'явіўся нядаўна і адразу стаў месцам, дзе з задавальненнем фатаграфуюцца.

У сталоўцы прадпрыемства.

## КРЫХУ ГІСТОРЫІ

Сёлета прадпрыемству споўнілася 26 гадоў, і было яно пабудавана паводле пастановы Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці Беларускай ССР менавіта ў Хойніках, як у найбольш спрыяльнай для сыраробства зоне.

Праектам прадугледжвалася, што пасля ўводу і асваення магутнасцяў сыраробнага камбіната, масласыраробны завод у Брагіне і стары завод у Хойніках перастануць існаваць. Такім чынам, Хойніцкі сыраробны камбінат пачаў сваю біяграфію ў 1984 годзе, і быў ён пабудаваны па тыпавым праекце магутнасцю 494 тоны перапрацоўкі малака ў суткі. На поўную магутнасць прадпрыемства пачало працаваць з 1985 года. У Савецкім Саюзе на той час было ўсяго некалькі аналагічных заводаў такой магутнасці. Устаноўлена было ў асноўным імпартнае абсталяванне (Чэхаславакія, Венгрыя).

Менавіта ў тым жа 1985 годзе адбывалася фарміраванне працоўнага калектыву, які ўзначаліла Валянціна Паўлаўна Алёшына, і прадпрыемства выйшла на праектную магутнасць па выпрацоўцы цэльнамалочнай прадукцыі, масла і сухога абястлушчанага малака. Выхад на праектную магутнасць па вытворчасці сыроў планаваўся на трэцюю дэкаду красавіка 1986 года. Да гэтай знамянальнай для калектыву падзеі заставалася чатыры дні. Але грымнуў выбух на Чарнобыльскай АЭС, і гэтая катастрофа ўнесла істотныя карэктывы ў работу камбіната.

Ужо ў наступныя месяцы выпрацоўка сыроў з-за радыеактыўнай забруджанасці малака была спынена, і рэалізацыя яго рэшткаў (каля пяцісот тон) праходзіла ў даволі складаных умовах. У 1987 годзе колькасць работнікаў прадпрыемства скарацілася на 35 %, а паступленне малака, наадварот, павялічылася, і калектыву давялося працаваць у тры змены. На парадак дня паўстала пытанне аб перапрафіляванні вытворчых магутнасцяў, і па гэтай прычыне пачалася рэканструкцыя плошчаў сыраробнага цэха ў цэх па вытворчасці казеіну (ён уступіў у строй у канцы 1989 года) і па выпрацоўцы тварагу.

Не будзем падрабязна расказваць пра цяжкасці тых часоў, якія характарызаваліся нестабільнасцю эканомікі ў гады сумна вядомай перабудовы, зніжэннем пакупніцкага попыту, стратай саюзных рынкаў збыту, іншымі негатыўнымі фактарамі. А падкрэслім, што калектыў не спасаваў перад тымі цяжкасцямі, а настойліва шукаў новыя магчымасці паляпшэння працы: пашыраў асартымент тавараў, наладжваў выпуск новых відаў прадукцыі, працаваў над павышэннем яе якасці. У выніку гэта прывяло да таго, што калектыў пачаў працаваць без страт.

Дырэктар прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Палескія сыры» Таццяна ГРАМОВІЧ.

Зараз штодня прадпрыемства вырабляе каля шасці тон масла васьмі найменняў, 3,2 тоны казеіна, 2,7 тоны цэльнамалочнай прадукцыі дваццаці найменняў, 2,8 тоны сыру цвёрдага і плаўленага. Прыблізна 80 % прадукцыі экспартуецца, і гэта яскрава сведчыць аб тым, што калектыў упэўнена ідзе наперад, бярэ новыя вышыні.

## ДУХ — НАВАТАРСКІ

— Я працую дырэктарам ПУП «Палескія сыры» усяго тры месяцы, — **расказвае сённяшні кіраўнік прадпрыемства Таццяна Дмітрыеўна Грамовіч,** — і не магу не сказаць цёплыя словы ў адрас папярэдняга дырэктара Галіны Віктараўны Бондар, якая адпрацавала на прадпрыемстве звыш дваццаці гадоў, а цяпер з'яўляецца старшынёй Хойніцкага раённага Савета дэпутатаў. Пры ёй калектыў прытрымліваўся стратэгіі дзелавога ўдасканалення, якую складалі тры ўзаемазвязаныя паняцці: задавальненне патрэб спажыўца, паляпшэнне ўмоў для персаналу і выкананне патрэб пастаўшчыка. Такая стратэгія знайшла поўнае адлюстраванне ў палітыцы і мэтах кіраўніцтва ў галіне якасці, што мы і будзе развіваць далей.

У размову ўключаецца **вядучы інжынер па якасці, яна ж і старшыня прафсаюзнага камітэта, Ганна Алегаўна Вяргейчык.**

— Добрая рэклама, — гаворыць яна, — стымулюе толькі першую пакупку, а потым спажывец ацэньвае смак. Калі прадукт яму не спадабаўся, ніякая рэклама не прымусіць яго набыць тавар у другі раз. І безумоўна, што адным з галоўных крытэрыяў поспеху ПУП «Палескія сыры» з'яўляецца высокая якасць выпускаемай прадукцыі.

Сёння на прадпрыемстве з гонарам кажуць: для вытворчасці прадукцыі выкарыстоўваюцца толькі натуральная сыравіна і ўпаковачныя матэрыялы, якія адпавядаюць сучасным экалагічным патрабаванням. Сістэма кіравання экалагічнага сертыфіката. Высокую якасць прадукцыі прадпрыемства пацвярджаюць шматлікія ўзнагароды, атрыманыя на рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках і конкурсах.

Працуючы над асартыментам і якасцю прадукцыі, калектыў не забывае і пра гандлёвыя арганізацыі, стараючыся забяспечыць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Прадпрыемства накіроўвае ў магазіны раёна і вобласці свайго прадстаўніка, які вывучае попыт пакупніка тварог 5-працэнтнай тлустасці.

Апошняя распрацоўка — сыр «Канталі» 30-працэнтнай тлустасці, які мае сметанковы смак з лёгкай кіслінкай і мяккай пластычнай кансістэнцыяй.

Валодаючы наватарскім духам, калектыў прадпрыемства не стаіць на месцы і пастаянна развіваецца. Так, у 2005 годзе ён укараніў сістэму менеджменту якасці на адпаведнасць патрабаванням міжнародных стандартаў ІСО 2001- 2009 на казеін кіслотны і масла салодкасметанковае (сёння яна дзейнічае і на вытворчасць сыроў паўцвёрдых і тварагу). Атрыманыя таксама сертыфікаты на адпаведнасць сістэме НААСР (бяспека харчовых прадуктаў) і на адпаведнасць патрабаванням аховы працы СТБ — 18001. Увогуле ўся прадукцыя прадпрыемства сертыфікавана ў поўным аб'ёме. На парадку дня — пытанне атрымання экалагічнага сертыфіката.

Інжынер па якасці Ганна ВЕРГЕЙЧЫК: «Палескія сыры» — у нас смачна ўсё!». На здымку: у музеі.

## Россып узнагарод

**г. Санкт-Пецярбург, Міжнародная выстаўка «Агра-Русь — 2007»,** сыр «Эмілорд» удастоены сярэбранага медаля;

**г. Санкт-Пецярбург, Міжнародная выстаўка «Агра-Русь — 2007»,** масла салодкасметанковае ўдастоенае залатога медаля;

**г. Санкт-Пецярбург, Міжнародная выстаўка «Агра-Русь — 2008»,** масла «Сялянскае» ўдастоенае залатога медаля;

**г. Масква, 2009 год, Міжнародная выстаўка-кірмаш «Расія— Беларусь на ВВЦ»,** сыр «Эмілорд» удастоены залатога медаля.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ

За апошнія гады прадпрыемства некалькі разоў змяняла сваю назву. У 2003-м, напрыклад, яно было пераўтворана ў ААТ «Хойніцкі сыраробны камбінат», праз год — у ААТ «Рэчыцкія малочныя прадукты», а яшчэ праз год — у ПУП «Палескія сыры» шляхам далучэння да ААТ «Малочныя прадукты» па вытворчасці цэльнамалочнай прадукцыі: былі ўстаноўлены аўтаматы па разліве малака і смятаны ў плёнку, аўтамат плаўленых сыроў і г.д. Летась, згодна з праграмай тэхнічнага пераўзбраення, якая распрацавана да 2015 года, была праведзена мадэрнізацыя аміачна-халадзільнага ўчастка. У выніку была зэканомленая вялікая колькасць электраэнергіі, бо на запраўку сістэм старога абсталявання патрабавалася шэсць тон аміяку, а на новае — толькі 140 кілаграмаў. Да таго ж мадэрнізацыя праводзілася ўласнымі сіламі, падрадных арганізацый не давялося наймаць, што сведчыць аб высокай кваліфікацыі калектыву. Зэканомленыя грошы былі пушчаныя на закупку двух нямецкіх чылераў ахаладжальнікаў.

Указанае абсталяванне працуе цяпер у аўтаматычным рэжыме, увесь працэс выведзены на камп'ютар, і нярэдка на прадпрыемства прыязджаюць прадстаўнікі іншых арганізацый Гомельшчыны, каб пераняць гэты вопыт.

Значны эканамічны эфект быў атрыманы і ад мадэрнізацыі маслакамеры, дзе, як і ў сыраробным цэху, для падтрымання тэмпературных рэжымаў і вільготнасці змянціравалі фрэонавыя ўстаноўкі. Такую ж закупілі сёлета і для ахаладжэння цэльнамалочнай прадукцыі, бо рэфрыжэратары не вытрымлівалі саракаградусную летнюю спякоту.

Рэканструкцыя закранула і казеінавую лінію — у тым ліку вузел каагуляцыі, пульт кіравання, варушыцель, вытрымлівацель, аддзяляльнік сыроваткі з гасіцелем хуткасці, гранулятар. У выніку праведзенай работы вытворчыя магутнасці лініі павялічыліся на чатыры працэнты. Была набыта таксама для апаратнага цэха такая дарагая па цане і вельмі неабходная для вытворчасці рэч, як бактафуга. Гэта — сепаратар для ачышчэння малака, устаноўлены таксама пнеўматычны прэс для прасавання сыроў і г.д.

Усё ўказанае і іншае мы бачылі непасрэдна ў цэхах. Дарэчы, у кацельні зараз ажыццяўляецца яшчэ адзін праект мадэрнізацыі вытворчасці: ідуць мантажныя работы па замене катлоў ДКВР на новыя, якія будуць спажываць намнога менш газу і забяспечваць неабходныя тэхнічныя параметры.

Праграмай тэхнічнага пераўзбраення прадугледжана таксама набыццё абсталявання для маслацэха ў 2011 годзе, якое будзе працаваць у аўтаматычным рэжыме, а ў далейшым — ажыццяўленне праекта па выпрацоўцы пяці тон сыру ў суткі. На 2011—2013 гады прадугледжана набыць абсталяванне для перапрацоўкі, згушчэння і сушкі казеінавай сыроваткі 500 тон у суткі.

На «Палескіх сырах» не прынята працаваць дрэнна. Добрая работа — гэта норма, якая стала магчымай дзякуючы дакладным і прафесійным адносінам персаналу да справы, захаванню правілаў на кожным этапе вытворчага цыклу. Тут кожны чалавек «хварэе» за агульны вынік.

А падтрыманне парадку і чысціні пачынаецца ўжо з уваходу ў вытворчыя памяшканні і атрымлівае працяг па ўсім тэхналагічным працэсе да таго часу, пакуль людзі не заканчваюць свой працоўны дзень. Заўсёды на мяжы «чыстай» і «брудной» зоны ўстаноўлены санпрапускнікі, якія забяспечваюць прымусовую санітарна-гігіенічную апрацоўку — мыйку і дэзінфекцыю рук і ачыстку падэшваў рабочага абутку перад тым, як рабочыя ўваходзяць у цэх.



Намеснік дырэктара па вытворчасці Аляксандр ХАРОШКА.

Прыблізна тое ж самае і з транспартам, які дастаўляе малако на прадпрыемства. Гэта сыравіна праходзіць кантроль на забруджанасць цэзіем-137 і стронцыем.

Па апошнім паказчыку, дарэчы, у 2004 годзе атрымана ліцэнзія на правядзенне праверак па ўтрыманні стронцыю. Таксама адбылася акрэдытацыя радыелагічнай лабараторыі — першай у Гомельскай вобласці. Вялікая заслуга ў гэтым начальніка лабараторыі Маі Якімаўны Феданчук, якая працуе на прадпрыемстве з 1986, пачаўшы лабарантам хіміка-бактэрыялагічнага аналізу і якая ўсю душу аддае вытворчасці. Работнікі яе — 5 чалавек — прайшлі падрыхтоўку па лініі МАГАТЭ ў Славеніі і 2 — ва Украіне. Апаратура для радыяцыйнага кантролю паступіла на прадпрыемства з актыўным удзелам гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі.

Работнікі лабараторыі расказалі, што на прадпрыемстве дзейнічае трохступенчаты кантроль, спачатку малака, якое вязуць з 17 гаспадарак Хойніцкага, Брагінскага і Рэчыцкага раёнаў, затым — па ўсім тэхналагічным працэсе і гатовай прадукцыі. Усё ў норме — у адпаведнасці са стандартамі. Рэкламацыі на якасць няма не толькі з Расіі, але з Германіі, Польшчы, Сінгапура, Амерыкі і іншых краін, куды экспартуецца прадукцыя.

## КАЛЕКТЫЎ

Казаць пра яго можна толькі добрыя словы. Гэта — сплаў вопыту старэйшых і энтузіязм моладзі.

Больш за 25 гадоў працуюць на прадпрыемстве (пра Аляксандра Іванавіча Харошку мы ўжо гаварылі) старшы майстар прыёмна-апаратнага і маслацэха Святлана Міхайлаўна Казак, бухгалтар-фінансіст Святлана Віктараўна Кушнір, апаратчык пастэрызацыі Паліна Аляксандраўна Кошмар, слесар-электрык па рамонце і наладцы электраабсталявання Аляксей Паўлавіч Говар, вадзіцель рэфрыжэратара Анатоль Аляксандравіч Сарнацкі, лабарант хіміка-бактэрыялагічнага аналізу Галіна Мікалаеўна Лявоненка, намеснік галоўнага бухгалтара Любоў Іванаўна Чэркас, сыраробмайстар даспявання сыру Людміла Пятроўна Юрчанка.

Ёсць і сямейныя пары. Бухгалтар Алена і начальнік кампрэсарнага ўчастка Анатоль Белашы, галоўны бухгалтар Ала Хацітоўская і вадзіцель малакавоза Уладзімір Цішкевіч, старшы майстар Святлана Бойка і вадзіцель малакавоза Генадзь Бордак, галоўны механік Аляксандр Жук і майстар Таццяна Паўловіч, начальнік сыраробнага цэха Таццяна Мелюх і машыніст кампрэсарнага цэха Дзмітрый Тужыкаў, юрыст Андрэй Кардаш і майстар Інга Жданко, старшы майстар маслацэха Святлана і вадзіцель рэфрыжэратара Алег Казакі.

Толькі летась прыбыло на прадпрыемства 15 маладых спецыялістаў пасля заканчэння вышэйшых і сярэдне-спецыяльных устаноў і прафтэхвучылішчаў, аб якіх паклапаціліся, выдзяліўшы ім інтэрнат і стварыўшы належныя бытавыя ўмовы.

Наогул трэба сказаць, што калектыў, у якім сёння 220 чалавек, жыве паўнакроўным жыццём. Ён умее і працаваць, і адпачываць. На прадпрыемстве дзейнічае сталовая, дзе харчаванне даволі танное, ёсць масажны кабінет, паслугі якога для персаналу бясплатныя, трэнажоры, більярд, бегавая дарожка, тэнісны стол, фітабар. Два разы ў тыдзень жанчын прымае ўрач. А колькі спартыўных кубкаў і дыпломаў, заваяваных у розных спаборніцтвах!

Адным словам, тут і цяжкасці ўмеюць пераадольваць разам, і поспехам радавацца — таксама разам. У гэтым і сіла калектыву.

**Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, В. БОЙКА, Марына БЕГУНКОВА (фота).**

**ПУП «ПАЛЕСКІЯ СЫРЫ»**
247618, Гомельская вобласць, г. Хойнікі, вул. Жукава, 1,
тэл. 8 (02346) 3-36-62, 3-04-32
тэл./факс: 3-04-30
e-mail: rmp@tut.by
УНН 490420252

Абсушка сыроў у халадзільным памяшканні. На здымку: начальнік цэха Таццяна МЕЛЮХ.

У СЫРАРОБНЫМ ЦЭХУ
Далей сыр упакоўваецца. На здымку: сырароб Алена ПЛЮШКО.

На здымку: вядучы тэхнолаг Святлана АТРОШЧАНКА.

Хойніцкае масла — незвычайна смачнае. І дзякуючы сакрэтам тэхналогіі і працавітасці такіх людзей, як зменны майстар-масларобДзіна ЦЕЙКО (на здымку), выпускаецца масла на любы густ.

«Палескія сыры» — прадпрыемства шматпрофільнае. На лініі выпускаецца мука вышэйшага гатунку. На здымку: начальнік мукамольнага цэха Надзея УЛЬЯНІЦКАЯ і старшы майстар змены Аляксей ЯСЬКОЎ на фасоўцы пшанічнай мукі.

## Кароткая характарыстыка прыватнага ўнітарнага прадпрыемства

Знаходзіцца яно ў горадзе Хойнікі і з'яўляецца адным з буйнейшых сучасных малочных прадпрыемстваў Гомельской вобласці, якое дынамічна развіваецца і вырабляе канкурэнтаздольную прадукцыю.

**Асноўнымі відамі дзейнасці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Палескія сыры» з'яўляюцца:**

- перапрацоўка малочнай сыравіны;
- вытворчасць цвёрдых сычужных сыроў, масла жывёльнага і сметанкова-раслінnага, цэльнамалочнай прадукцыі, казеіну, мукі вышэйшага гатунку;
- рэалізацыя вырабленай прадукцыі ў адпаведнасці з планам і заключанымі дагаворамі.

Хойніцкая прадукцыя не толькі самая смачная, але і самая экалагічная. Уся сыравіна і гатовая прадукцыя правяраецца ў радыелагічнай лабараторыі. На здымку: в.а. інжынера-радыёлага Галіна НАЗАРАНКА.

Пад заслону «Белай вежы»

# КАЛЕКА, ЯКІ НАВУЧЫЎ НАС ЖЫЦЬ

**ПЯТНАЦЦАТЫ брэсцкі тэатральны фестываль «Белая вежа» прайшоў пад знакам драматургіі Антона Чэхава, з дня нараджэння якога ў гэтым годзе спаўняецца 150 гадоў. І пачатак фэсту, і яго закрыццё сталі данінай павагі вялікаму пісьменніку. У дзень адкрыцця форуму Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы падараваў радасць ад прагляду «Вяселля» па аднайменнай п'есе А.П. Чэхава. Жанр пастаноўкі Уладзіміра Панкова вызначаны як саўндрама, што азначае спалучэнне драматычнага мастацтва, музыкі, харэаграфіі і пластыкі. Класічны вадэвіль Чэхава ператварыўся ў яркае сучаснае відовішча, аздобленае цудоўнай музыкай Стравінскага. Амаль двухгадзінны спектакль глядзеўся на адным дыханні і пакінуў светлыя пачуцці. Апошняе можна сказаць і пра фінальны акорд фестывалю — камічную оперу «Мядзведзь» па матывах п'есы Чэхава Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета разам з аркестрам Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы.**

На здымку: вулічны спектакль Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы «Мара пра Дон Кіхота».

Сюжэт твора просты, але цікавы. Да маладой удавы, якая восьмы месяц смуткуе аб страце мужа, прыязджае адстаўны паручнік, а цяпер сусед-памешчык, патрабаваць доўг нябожчыка. Прыгажуні ён падаецца занадта грубым і нявыхаваным. Яна абзывае нязванага госця мядзведзем і адмаўляецца аддаваць грошы. Тады крэдытор выклікае жанчыну на дуэль, і яна... прымае выклік. Але пакуль ідзе падрыхтоўка пісталетаў ды месца паядынку, «дуэлянт» разумее, што закахаўся. Ён нават бянтэжыцца спачатку: не да месца каханне, бо касавіца на носе. Ды толькі ўсёпераможнае каханне здольнае вырашыць і праблемы, і непаразуменні. І чароўная музыка Картэса — таму пацвярджэнне. Хто ж не любіць глядзець і слухаць пра каханне? Гледачы, шчаслівыя добрым фіналам, не шкадавалі апладысментаў. А калі на сцэне закружыліся ў вальсе выканаўца галоўнай партыі — Удавы — Алена Бундзялеева і кампазітар Сяргей Картэс, зала ўзарвалася авацыяй.

Да Чэхава звярнуліся і гаспадары фестывалю — брэсцкі калектыў. Яны праявілі пэўную смеласць і рашучасць, калі выйшлі на фестываль з прэм'ерай. «Тры сястры» рэжысёра Цімафея Ільеўскага да гэтага ні разу не ставіліся. І адразу пасля прагляду стала ясна, што дэбют удаўся. Спектакль атрымаўся інтэлігентным, удумлівым і надзіва сучасным. А адной з актрыс, занятых у спектаклі (Вользе Жук — за ролю Ірыны), журы прысудзіла дыплом «За лепшую жаночую ролю».

Пра нашага падрыхтаванага, выхаванага за паўтара дзесяцігоддзя гледача зноў шмат гаварылі на фестывалі. Асабліва многа добрых слоў прагучала ў адрас публікі падчас закрыцця. І гэта вельмі прыемна. Падумалася, можа, хтосьці з рэжысёраў паставіць некалі спектакль пра гледача. А што? Здаецца, такой тэмы тэатральнай дзеі яшчэ не было ў афішы фэсту. Але як бы не пазіцыянавалі свае работы тэатральныя трупы, наш глядач валам валіць на спектакль, калі яго прывезлі з Масквы. Так было і з «Новымі гульнямі». Поўнасцю спектакль называецца незразумела, загадкава і шматабяцальна: «Top dogs, або Новыя гульні для дарослых». У праграме было сказана: «сеанс экстрэмальнай псіхатэрапіі», а таксама «антыкрызісны спектакль». Рэкламны ход, трэба аддаць належнае, прыдуманы ўдала, наш тэатрал не пашкадаваў па паўсотні тысяч рублёў на квіткі. Яны разышліся ў першы дзень. Але, забягаючы наперад, скажу: многія нават дзеля патрачанай сумы не сталі сядзець да канца і дэманстратыўна пакінулі залу.

Усё здавалася ёсць: актуальнасць тэмы (душэўныя пакуты бізнэсменаў і дзелавых людзей, якія засталіся без працы), добрая ігра акцёраў, адносна новы прыём спалучэння тэатральнага дзеяння з тэлевізійшчынай, — але ж не хапіла нечага галоўнага... Дзея пастаноўкі адбываецца ў рэабілітацыйным цэнтры, куды трапляюць усе героі, якія былі выкінуты «за борт» сваіх офісаў у выніку праклятага крызісу. Псіхатэрапія заключаецца ў тым, што кожнага з іх просяць расказваць сваю гісторыю. І перад гледачом вымалёўваюцца сапраўдныя жыццёвыя драмы. У нейкі момант спектакль падаецца вельмі цяжкім — людзям, што засталіся без працы, пачынаеш спачуваць. Але цяжкімі бываюць і тэлеперадачы, страшна робіцца ад многіх газетных паведамленняў... А ў тэатры хочацца тэатра. Асабіста мне на працягу спектакля часта ўспаміналася знакамітае «Не веру!» Станіслаўскага.

Пасля спектакля крытыкі выказвалі меркаванне, што нармальнаму ўспрыняццю, магчыма, пашкодзіла стэнаграфія, вырашаная ў выглядзе замкнёнай прасторы: усе дзеючыя асобы сядзелі ў крэслах, пастаўленых кругам, такім чынам яны не «упусцілі» гледача ў сваё «кола». Можа, гэта, можа іншае паспрыяла таму, што спектакль атрымаўся чужым і няўтульным. Хоць цалкам верагодна, што нехта з дзелавых людзей жалезнай хваткі, для якіх «бізнэс — гэта вайна, кроў і слёзы», мог бы пазнаць сябе. Але такія, як правіла, у тэатр не ходзяць: для іх квіткі занадта дарагія. У глядзельнай зале заўважана было нямала настаўніц, выхавацеляў дзіцячых садкоў, работнікаў культуры...

На сёлетняй «Вежы» было толькі два маскоўскія калектывы. Пра адзін сказана вышэй. А пастаноўку другога — Цэнтра драматургіі і рэжысуры Рошчына і Казанцава пад назвай «Экспанаты» — чамусьці вырашылі праводзіць у малой зале. Вядома, там і блізка не змясціліся ўсе ахвотныя паглядзець. Дайшло да таго, што намеснік дырэктара брэсцкага тэатра стала ў дзвярным праёме і, трымаючыся рукамі за сцены, не пусціла ў залу нават акрэдытаваных журналістаў. Так што камічнае магчыма бывае ўбачыць не толькі на сцэне.

Камедыяй названы і абсалютны фаварыт сёлетняй «Вежы» — спектакль Пермскага тэатра «Каля моста» «Калека з Інішмана». Прыезд гэтага аўтарскага тэатра з няблізкай Пярмі ў горад над Бугам стаў падзеяй для нас. Для іх, што прыемна было пачуць, — таксама. Мастацкі кіраўнік тэатра, заслужаны артыст Расіі Сяргей Фядотаў сказаў перад пачаткам прагляду, што горад, у якім яны звычайна праводзілі чатыры гадзіны ў вагонах, калі мянялі колы цягніка на еўрапейскую каляіну, ім надзвычай спадабаўся. А калі рэжысёр наведаў Брэсцкую крэпасць, то паводле яго слоў, нібы пабываў на радзіме — у Савецкім Саюзе. А яшчэ заўважыў мэтр: «У горадзе сёння пачалося ірландскае надвор'е». І сапраўды, у пяты фестывальны дзень над горадам павіс дробны навязлівы дождж у суправаджэнні халоднага ветру. А да гэтага ўсе дні было сонца. Аказалася, гэта ён пра містыку. Бо іх тэатр спецыялізуецца на містычных пастаноўках. І цяпер дождж пайшоў, бо прывезлі містычную ірландскую, так і хочацца сказаць, драму «Калека з Інішмана» па п'есе невядомага нам раней ірландца Марціна МакДонаха. У яго надзвычай своеасаблівы, парадаксальны гумар. Яго персанажы паміраюць, забіваюць адзін аднаго, але ўсё роўна — камедыя. Бо жыццё — не трагедыя, а нешта іншае, сцвярджае аўтар.

Гэта ўступная рэжысёрская гутарка заінтрыгавала гледача, а калі ў канцы ён папрасіў прабачэння за ненарматыўную лексіку, якая сустракаецца ў спектаклі, зрабілася боязна. Каб не здарылася пошласці, чарнухі, вулічнага бруду, або таго, што старшыня журы Алег Півавараў любіць называць тэатральным пустаселлем, якія, бывала, падсоўвалі гледачу за гісторыю «Вежы». Але апасенні аказаліся марнымі. Пермякі паказалі сапраўдны тэатр. Паказалі надзвычай шчымлівую гісторыю з жыцця вострава Інішман — аднаго з самых загадкавых месцаў Ірландыі. На маленькім востраве з суровым кліматам жывуць людзі. Іхняе жыццё такое ж беднае на падзеі, як мясцовая прырода. І самы незайздросны лёс у хлопца Білі, які з дзяцінства пакутуе ад ДЦП, з цяжкасцю ходзіць. Ён шмат чытае, мае добрае сэрца, чулую душу. Але ўсе завуць яго толькі калекай, што прычыняе яму дадатковыя пакуты. Цёткі калекі Білі заняты сваёй невялікай крамай. Разносчык навін, а прасцей, пляткар Джоніпацінмайк, займаецца сваёй справай, мясцовая хуліганістая прыгажуня Хелен крыўдзіць брата і сваіх паклоннікаў. І вось гэта існаванне, якое, не мяняецца, здаецца, вякамі, літаральна выбухае, калі на востраў прыязджае здымачная група з Галівуда. Усе хочуць трапіць у будучы фільм, але атрымліваецца гэта толькі ў калекі Білі. Ён дабіваецца сваёй мэты неверагоднымі высілкамі, ён марыць вырвацца ў вялікі, іншы, прыгожы свет. Але праз некаторы час, — о дзіва! — Білі вяртаецца дадому.

Бо там, у Галівудзе, пасля здымак ён аказаўся нікому не патрэбны. І пасля вяртання Білі высветліў галоўнае пытанне свайго жыцця: хто былі яго бацькі і чаму яны памерлі. Адны казалі яму, што бацькі трапілі ў шторм і патанулі па дарозе ў Амерыку. Іншыя выдумлялі, што бацькі ўтапіліся з гора, бо ў іх нарадзіўся калека-сын, а яго на выхаванне ўзялі цёткі. Была яшчэ і рамантычная версія: бацькі застрахавалі жыцці і кінуліся ў мора, каб потым стала магчыма аплаціць лячэнне, бо жыццё хлопчыка было пад пагрозай. Аказалася, што бяспутныя бацькі, вырашылі ўтапіцца і дзіця ўзялі з сабою. Каб выратаваць малога, Джоніпацінмайк кінуўся ў мора і выцягнуў яго. Потым украў грошы ў сваёй нябеднай алкагалічкі маці і аплаціў лячэнне сіраты. А яго цёткі, што выхавалі, зусім чужыя людзі, яны падабралі і палюбілі няшчаснага калеку. Праўда выглядае суровай. У нейкі момант Білі ўсклікае ў роспачы «У рай, мусіць, не бяруць калек, каб яны там усю прыгажосць не сапсавалі». І ў гэтым воклічы ўся існасць жыцця і нашых сацыяльных праблем, у тым ліку адносінаў да інвалідаў у грамадстве наогул. Чамусьці ў перакошаным ад болю, ад несправядлівасці твары Білі, чыталася пра пандусы і спецыяльныя лесвіцы, якімі не абсталяваныя многія будынкі. Яго трапныя заўвагі навявалі на думку пра тое, як мала мы адно аднаго любім і спачуваем адно аднаму. Яго разважанні пра рай раптам ажывілі ўспаміны пра персанаж спектакля «На дне» пі-церскага тэатра Льва Эрэнбурга — Татарку-карліцу, паказаны на «Вежы-2006». Яна ўвесь час расказвала пра загадкавы горад, дзе нікога не падзяляюць на багатых і бедных, шчаслівых і няўдачнікаў, дзе ўсіх любяць проста так.

Пермякі прывезлі спектакль, які прымусіў плакаць і смяяцца, перажываць і думаць. Таму цалкам лагічна выглядае рашэнне журы прысудзіць Гран-пры гэтаму твору. Спектакль створаны ў 2009 годзе, ужо мае шэраг узнагародаў, і сярод іх выдатнейшая «Залатая маска».

Як сказаў на цырымоніі ўзнагароджання знакаміты Альгердас Латэнас, некаторыя сучасныя тэатры за дваццаць гадоў памяраюць (менавіта столькі пражыў «Ля моста»), а пермякі ўпэўнена заяўляюць пра сябе як цікавую з'яву ў сусветным тэатральным жыцці. Іх брэсцкі фестываль — ужо 85-ы.

Яшчэ прадстаўнік журы спадар Латэнас пад заслону фестывалю адзначыў яго вялікую геаграфію: «Увесь свет прайшоў перад намі за восем дзён: Індыя, Іран, Аўстралія, Заходняя Еўропа, постсавецкія краіны. Гэта так прыгожа і так здорава. Хай так і будзе!» Хочацца з ім пагадзіцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Калі ўпакоўка мае значэнне

**ЧЫТАЧЫ сталага веку памятаюць своеасаблівыя сімвалы савецкіх часоў: сетку-авоську і шэрую абгортачную паперу. А яшчэ тое, якім дэфіцытам былі першыя поліэтыленавая пакеты. Сённяшняга ж пакупніка мала завабіць адным толькі якасным і недарагім таварам — яго яшчэ трэба добра «падаць». Пагадзіцеся, часам мы спакушаемся не на сам нейкі прадукт, а на яго яркую абгортку, ці аддаём перавагу той прадукцыі — сярод іншых аналагаў — якая вылучаецца афармленнем.**

— Так, упакоўка павінна прыцягваць увагу, на ёй, напрыклад, павінен выразна чытацца тэрмін захоўвання прадукту. А яшчэ ўпакоўка павінна лёгка адкрывацца, але не настолькі, каб гэта здарылася ў руках пакупніка проста ў краме, — гаворыць менеджар мінскага выдавецтва «Друк-С», якое прапаноўвае ўвесь спектр паліграфічных паслуг, у тым ліку і выраб упакоўкі, Элеанора Лявонава. — А яшчэ трэба ведаць: танная ўпакоўка не можа быць добрай, таму аднаведнай якасці павінна быць і сыравіна. Мы працуем і з айчыннымі пастаўшчыкамі, і з замежнымі.

Фота Паўла БЕРАСНЕВА.

Крысціна ВЯРШКОВА дэманструе ўзоры прадукцыі.

Гэта, так бы мовіць, адзін бок медаля: выразнасць, дастатковая інфармацыйнасць упакоўкі. Аднак для многіх пакупнікоў гэты аспект не з'яўляецца вызначальным. Як вядома, поліэтылен не гніе, ён, выкінуты пасля выкарыстання, забруджвае прыроду. Таму тыя, хто заклапочаны экалагічным аспектам, аддаюць перавагу або тары з матэрыялаў, якія лёгка перапрацоўваюцца, або не наносяць шкоды навакольнаму асяроддзю: паперы, кардону. Менавіта пра такую ўпакоўку мы і гаварылі з Элеанорай на форуме «Свет упакоўкі», які распачаў сваю працу ў сталічным выставачным павільёне па праспекце Пераможцаў, 14.

Гэта ўжо 11-я па ліку міжнародная спецыялізаваная выстава. Сёлета ўдзел у ёй бяруць больш за 80 кампаній з Беларусі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Польшчы, Расіі і Украіны. На сваіх стэндах яны дэманструюць упаковачныя матэрыялы, сыравіну і абсталяванне для вытворчасці ўпакоўкі, гатовыя ўпаковачныя вырабы для прадуктаў харчавання, тавараў шырокага спажывання, матэрыялы для вырабу этыкетак і іншае.

Але, як бы большасць з нас ні была заклапочаная экалагічнымі праблемамі, і без сучасных матэрыялаў сёння абысціся нельга. Тым больш, калі...

— Нашы латкі пад запайку — герметычная пластыкавая ўпакоўка — для мясной прадукцыі, паўфабрыкатаў, свежай садавіны і гародніны, кулінарных, кандытарскіх вырабаў дазваляюць у пяць разоў павялічыць тэрмін захоўвання гэтых тавараў, — тлумачыць перавагі выстаўленых узораў спецыяліст аддзела маркетынгу айчыннай кампаніі «МаксіПак» Крысціна Вяршкова. — Гэты працэс адбываецца пад вакуумам. Сярод кліентаў нашай кампаніі мясакамбінаты, хлебазаводы, малаказаводы. У такога кшталту выставах мы ўдзельнічаем пастаянна, імкнёмся кожны раз прадставіць самы шырокі спектр упаковачных матэрыялаў.

Напрыклад, апошнім часам і сярод вытворцаў харчовых прадуктаў, і сярод цэхаў па вытворчасці паўфабрыкатаў, буйных крамаў набыла папулярнасць харчовая стрэйч-плёнка. Яе зручнасць ацанілі і пакупнікі: яна надзейна абараняе тавар, мае прэзентабельны выгляд і, што таксама мае значэнне, выкарыстанне такой плёнкі не адбіваецца істотна на цане ўпакаванай прадукцыі. А хто можа прыгадаць, як мы раней абыходзіліся без гэтых ужо звыклых латкоў з успененага палісіролу? Зараз у іх фасуюць і мяса, і субпрадукты, і сухафрукты, і кандытарскія вырабы і шмат яшчэ чаго іншага.

...Гісторыя выкарыстання гафрыраванага кардону налічвае больш за сто гадоў. Яго з'яўленне было звязана з неабходнасцю стварэння не проста ўпаковачнага матэрыялу, а матэрыялу, які б забяспечыў абарону тавару ад механічных уздзеянняў. Дарэчы, гэта адзін з самых эканамічных у вытворчасці відаў упакоўкі і вельмі кампактны пры захоўванні яго запасаў.

З 2001 года вытворчасцю трох- і пяціслойнага гафрыраванага кардону займаецца і вытворча-гандлёвае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства з Фаніпаля «Эдон-92». За гэты час па ўсёй краіне ў яго з'явілася больш за сто пастаянных кліентаў: вытворцаў і пастаўшчыкоў мэблі, бытавой тэхнікі, газавага абсталявання. Чым атрымалася прывабіць іх? У першую чаргу — якасцю. Да слова трэба сказаць, што звярнуцца на прадпрыемства можа не толькі які-небудзь вытворца, але нават любая фізічная асоба. Прыгадайце: кожны з нас хоць бы аднойчы пераязджаў з месца на месца, так? І як мы ўпакоўвалі рэчы? У тару, па прынцыпе, хто што знайшоў? Дык вось: гэта адзіная фірма, як распавялі нам намеснік дырэктара па вытворчасці Аксана Навета і начальнік вытворчасці Віталь Забора, што можа прыняць заказ нават ад прыватніка на выраб аднаго экзэмпляра ўпакоўкі. Вырабіць яе могуць прыкладна на працягу гадзіны. І даставіць туды, куды патрэбна. Бо, як мы зазначылі напачатку, без упакоўкі часам — не абысціся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Фокус

# «Укаранім беларускую мову...»

**Мая пляменніца Сафія навучаецца ў другім класе добрай гімназіі. Як пачаўся навучальны год, прыйшоў да маленькай дзяўчынкі з інспекцыяй: як жыццё, што ў школе?**

На сцяне ў дзіцячым пакоі вісіць расклад урокаў. Пільна праглядаю яго і бачу: урокаў рускай мовы за тыдзень — тры, беларускай — два. Пытаюся ў сястры, што гэта азначае? Адказвае, што нейкім чынам памянялі навучальную праграму, і беларускай мовы стала менш...

У 1993 годзе бацькі аддалі мяне ў беларускамоўны клас звычайнай сярэдняй школы. Усе ўрокі — у тым ліку і матэматыка, і выяўленчае мастацтва, і фізкультура — выкладаліся па-беларуску. Пры гэтым настаўніца, Людміла Міхайлаўна, была вельмі таленавітым і адказным чалавекам. Вучыла яна добра, а не як Бог на душу пакладзе. Закладзеныя ў дзіцячую псіхіку патрыятычныя асновы раскрыліся пазней, калі я навучаўся ўжо ў рускамоўных класах, але цвёрда ведаў — што важнае ў гэтым жыцці, а што другараднае. У выніку тыя чатыры пачатковыя класы ў самай звычайнай пачатковай школе зрабілі з мяне чалавека — я скончыў ліцэй Белдзяржуніверсітэта і потым аднайменны ўніверсітэт.

І вось я сёння спрыяю развіццю роднай мовы, сам ёй карыстаюся, пішу ў газету, а на гімназічным раскладзе маёй пляменніцы ў гэты ж час бачу тры ўрокі рускай мовы і два — беларускай.

Калісьці з майго пачатковага беларускамоўнага класа зрабілі звычайны рускамоўны клас. І памятаю, як я, рамантычны падлетак, пісаў у 2000 годзе пісульку ў адну з газет: «Чаму ў Беларусі закрываюць беларускія ж класы?» На гэтае падлеткавае пытанне адрэагаваў дзядзечка з Міністэрства адукацыі: «Прынята дзяржаўная праграма па ўкараненні беларускай мовы ў навучальных установах...» Наступствы гэтага ўкаранення яскрава бачныя на раскладзе маёй маленькай пляменніцы.

Да чаго прыводзіць такое «ўкараненне»? Неяк на факультэце журналістыкі здавалі іспыты па беларускай літаратуры. І адна дзяўчына — адказвала перада мной — ну ўвогуле не мела паняцця пра творчасць пісьменніка Максіма Гарэцкага, якога бальшавікі забілі за тое, што любіў Беларусь. Выкладчыца, вельмі добрая, прафесар, падумала: «А ну як. Пастаўлю самую нізкую адзнаку, але экзамен залічу». І пытаецца ў дзяўчыны: «А калі пачалася Першая сусветная вайна?» Дзяўчына пачырванела і выціснула з сябе, што ў 1917 годзе (на тры гады прамахнулася). А дзеўка, дарэчы, скончыла бюджэтнае аддзяленне ўніверсітэта і сёння ў сябе ў раёне займае высокую пасаду. І таксама, відаць, будзе «ўкараняць» мову.

Чаму наша моладзь, будзем шчырымі, не вызначаецца патрыятызмам і веданнем гісторыі? Усё проста. Таму што ў школе іх не навучылі паважаць сваю мову. А мова — гэта маяк, без якога пачынаецца дэзарыентацыя.

І калі ў маім горадзе адзначаюць нейкае масавае свята, і наша моладзь збіраецца ў кучкі, я не магу знаходзіцца на такіх мерапрыемствах. Мацюк-перамацюк, натоўпы п'яных... І спытайцеся ў іх: «А што тут адзначаюць і чаму адзначаюць менавіта сёння?»

Гэта моўная, а значыць, і патрыятычная дэзарыентацыя прыводзіць да таго, што пры выпадку кожны малады чалавек ператвараецца ў патэнцыйнага юду. Духоўнага стрыжня няма, а значыцца — няма матывацыі адстойваць нейкія ідэалы, кіравацца імі.

Калі я гляджу на тое, як людзі, якія — кожны на сваім месцы — павінны несці адказнасць за развіццё нацыянальнай мовы, няўважліва да яе ставяцца, я не магу за гэтым спакойна назіраць.

Хацелася б звярнуцца да тых, хто займаецца выхаваннем дзяцей. Калі вы хочаце пакінуць у гісторыі станоўчы след і не быць статыстамі, павярніцеся тварам да нацыянальнай мовы.

І паверце: гэта ў многім умацуе вас і вашых вучняў. На выхадзе куды больш людзей будзе вас паважаць, а выхаванцы скажуць: «Дзякуй, што вы зрабілі нас больш моцнымі і паказалі, дзе знаходзіцца маяк...»

**Яўген ВАЛОШЫН.**

Нічога асабістага!

# Ключык разладу



Нешта мне ў апошні час з прадпрымальнікамі не шанцуе. То па рынку ходзіш, а яны ў нарды гуляюць і ўвагі на цябе не звяртаюць, то ключык для дамафона цэлы тыдзень не можаш зрабіць. Дарэчы, пра гэты злашчасны ключык. Пайшоў у майстэрню і кажу дзядзечку — маўляў, так і так, трэба пару «таблетак» ад дамафона зрабіць. Ён мне кажа: «Табе тэрмінова?». Паколькі абрыдла пад дзвярамі пад'езда ў чаканні суседзяў стаяць, то я папрасіў зрабіць як мага хутчэй.

— О'кей, — сказаў майстра, — прыходзь у пятніцу, — і забраў грошы ўперад.

У пятніцу дык у пятніцу, што зробіш — хоць да гэтай пятніцы яшчэ дні тры было, а я дык тэрміновасць у гадзінах мераў. Ну ды ладна, раёначык новы, мо ў гэтага майстра тысячы заказаў ляжаць, прыйдзецца патрываць.

Дачакаўся запаветнай пятніцы, прыходжу — зачынена акенца майстэрні. Павывучаў шыльдачку з распарадкам працы — здаецца, павінна працаваць. Ладна, прыйду заўтра. Прыйшоў. Зачынена. Пачакаў да панядзелка. Зноў зачынена! Пытаю ў суседніх акенцы, дзе цётачка прымае нейкія заказы ў атэльне, пра майго майстра-прапажу:

— О, дык яго з чацвярга няма, — кажа яна. — А дзе падзеўся — не ведаю...

Карацей, каб вам доўга не расказваць, скажу, што пра лёс майстра я даведаўся праз аддзел гандлю і паслуг Фрунзенскага райвыканкама Мінска: яны ўважліва мяне выслухалі, звязаліся, як я зразумеў, з жонкай гэтага індывідуальнага прадпрымальніка і ператэлефанавалі мне — аказваецца, майстар проста захварэў. У выніку ключыкі для дамафона я забраў яшчэ праз тыдзень, але мне хочацца зараз паразважаць не пра тое, які я бедны і няшчасны быў без ключыкаў — гэта ўсё дробязі жыцця. Мяне больш цікавяць адносіны бізнэсменаў, прыватнікаў, індывідуальных прадпрымальнікаў да крыніцы сваіх даходаў — да кліентаў, заказчыкаў, пакупнікоў і гэтак далей.

Ну вось скажыце, што замінала павесіць на акенца майстэрні паперку а-ля «Прабачце, захварэў. Буду прыкладна ў сераду»? Ці, напрыклад, «Як папраўлюся, усім пазваню і запрашу забраць заказы»? Жонка, сябры, сыны, тая ж цётачка-суседка з атэльне маглі павесіць такую інфармацыю, і ўсё — у мяне ніякіх бы пытанняў не ўзнікла, бо ніхто не застрахаваны ад раптоўнай хваробы ці яшчэ чаго.

Хаця, каб быць шчырым да канца, трохі пазней на акенцы майстэрні з'явілася паперка з надпісам «Майстэрня не працуе» (ага, прывітанне — а то я сам не бачу), а яшчэ пазней прыпіска «Майстар хварэе». Але самае цікавае, што нават калі індывідуальны прадпрымальнік выйшаў на працу, ён не палічыў патрэбным патэлефанаваць сваім кліентам і паведаміць пра тое, што заказы можна забіраць. Нашто тады было запісваць нумар майго мабільнага ў бланк заказу?

У прынцыпе, кожны сам выбірае, як весці свой бізнэс і як кантактаваць са сваімі кліентамі. Напрыклад, літаральна насупраць знаходзіцца тэлерадыёмайстэрня. Таксама была зачыненая, але ў дзвярах паперка з нумарам тэлефона: можна пазваніць і ўсе пытанні высветліць, а не вартаваць дзверы. Ці вунь нядаўна бачыў аб'яву ў невялічкай прадуктовай краме: «Наш магазін перайшоў на самаабслугоўванне пакупнікоў з мэтай наблізіць Вас да тавараў... Прапановы па пашырэнні асартыменту тавараў і якасці абслугоўвання гатовыя выслухаць па тэлефонах...» І далей прыводзяцца мабільныя дырэктара і намесніка дырэктара па камерцыйнай частцы. Ото ж згадзіцеся, зусім іншая справа — прыемна туды завітаць яшчэ не раз, бо бачна, што ты там як мінімум кліент.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Экслібрыс «Звязды»

# Разгледзець сучаснасць

*Галубовіч, Л. М.*
*Сыс і кулуары: літаратурна-крытычныя эсэ\ Л.М. Галубовіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 176 с.: іл.*

**За плячыма ў Леаніда Галубовіча — лічы, два літаратурныя жыцці. Таленавіты паэт, вядомасць якому прынесла ўжо першая кніга вершаў — «Таемнасць агню» (1984), ён даўно прадэкларавaў, што пакінуў паэзію. І доўгія гады займаецца выключна літаратурна-мастацкай крытыкай. Нават яго празаічная кніга «Зацемкі з левай кішэні», складзеная з эсэ і мініяцюр, бліжэй да крытыкі, літаратуры пра літаратуру, чым да мастацкай прозы.**

Чым прываблівае новы зборнік «Сыс і кулуары», складзены з літаратурна-крытычных эсэ? Найперш — гранічнай шчырасцю ў размове пра здзейсненні і страты сучаснай беларускай літаратуры, чаго якраз не хапае сённяшняй крытыцы. Так, у Леаніда Галубовіча (і гэта было відавочным найперш для чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва», у якой ён аглядаў беларускую паэзію і прозу) — свае дакладна акрэсленыя прыхільнасці. Ён — настойлівы шукальнік сапраўднасці ў творчасці пісьменнікаў, даследчык самой прыроды літаратурных талентаў. У цэнтры ўвагі Л. Галубовіча — Янка Брыль, Васіль Быкаў, Янка Сіпакоў, Данута Бічэль, Алесь Разанаў, Алег Мінкін, Адам Глобус, Андрэй Федарэнка, Янка Сіпакоў, Яўгенія Янішчыц, Людка Сільнова, Людміла Рублеўская, Галіна Дубянецкая, Марына Наталіч, Мікола Федзюковіч, Веніямін Блажэнны... Персанажы далёка не выпадковыя, больш за тое — аснова, трывалы фундамент для развіцця і руху айчыннай літаратуры ў заўтра. І калі нехта крытыкам Леанідам Галубовічам яшчэ не адзначаны, не ўгледжаны ў гэтым бясконцым працэсе, то, мусіць, прыйдзе і да яго ўвага таленавітага і сумленнага аналітыка. Галоўнае — мець цярпенне ў адольванні ўсіх жыццёвых таямніц, валодаць нястрымным жаданнем да іх праўдзівага мастацкага адлюстравання.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

## БРАКАНЬЕРА ЗНАЙШЛІ ПА... ФОТА

На возеры Плесце (Столінскі раён) супрацоўнікі міжрайінспекцыі выйшлі на двух браканьераў, якія лавілі рыбу сеткай. Адзін з іх выскачыў з лодкі ў ваду і знік у хмызняку. Але браканьеру не пашанцавала. Участковы міліцыянер паспеў яго сфатаграфаваць, і асобу ўцекача ўстанавілі па здымках.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## І НА ЎЛАСНЫМ ПАДВОРКУ НЕ ЛІШНІ

Аказаўся дамок паляўнічага для жыхара Іванава. Ен працуе дырэктарам таварыства паляўнічых і рыбаловаў раёна. Сёлета ад СВК «Агра-Моталь» ён атрымаў дамок-вагон коштам 4437000 рублёў для патрэб паляўнічай гаспадаркі. Але, відаць, пабудова спадабалася дырэктару, і ён прывёз яе на ўласны прысядзібны ўчастак...

**Яна СВЕТАВА.**

## ДРОБЯЗЬ, АДНАК НЕПРЫЕМНА

У цэнтры Гомеля адразу шэсць аўтамашын розных марак, якія стаялі разам у двары, былі пазбаўленыя сваіх лагатыпаў. Ноччу фірменныя эмблемкі сарваў невядомы злодзей — дзе змог, і пярэднюю і заднюю, дзе не змог — толькі адну.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## СЕРЭНАДУ ЗАСПЯВАЦЬ НЕ ПАСПЕЎ

Двое брастаўчан 28-гадоў гасцявалі ў кватэры дома па вуліцы Арлоўскай. Калі добра напіліся, то адзін, раней судзімы, адабраў гвалтам у другога дзве гітары. Але зламыснік хутка быў затрыманы нарадам міліцыі, музычныя інструменты ў яго забралі.

**Яна СВЕТАВА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**строительства панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутская – Хабаровская**

**Информация о Застройщике**

**Частное строительное унитарное предприятие «Витасанплюс» (Частное предприятие «Витасанплюс»).**

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, помещение 9.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация Застройщика:** Частное предприятие «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 24 января 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, Частное предприятие «Витасанплюс» участие не принимало.

**Информация о проекте**

**Цель проекта:** строительство панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутская – Хабаровская.

**Срок реализации проекта:** 3 квартал 2010 г. – 4 квартал 2011 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 460–15/10, выданное 15.06.2010 г. Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома:** г. Минск, район пересечения улиц Иркутская – Хабаровская.

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:** 19-этажный крупнопанельный односекционный жилой дом из конструкций серии М 111-90 ОАО «МАПИД». Количество квартир в доме – 132, в том числе: однокомнатных – 57 ед., двухкомнатных – 57 ед., трехкомнатных – 18 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется. Наружная отделка – покрытие бетонных панелей защитно-полимерным составом ЗДПС, покраска акриловыми фасадными красками по грунтовке. Высота этажа – 2,8 м. В каждой квартире есть летние помещения – остекленные лоджии. В квартирах первого этажа запроектированы погреба под лоджиями, используемые в хозяйственных целях. В доме предусмотрен мусоропровод и два лифта грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Сети водопровода запроектированы из полиэтиленовых напорных труб, бытовой канализации – из канализационных поливинилхлоридных труб. Проектом предусматривается прокладка волоконно-оптического кабеля (ВОЛС) от оптического узла, расположенного по ул. Байкальской, 37 до жилого дома и установка приемника прямого канала «ГАММА – 11» и передатчика обратного канала. Въезд на территорию жилого дома принят с переулка Томского.

**Цены на объекты долевого строительства (первый этап продаж):**

однокомнатные квартиры – **2 900 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

двухкомнатные квартиры – **2 800 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

трехкомнатные квартиры – **2 700 000 рублей** за 1 кв.м общей площади.

**Условия оплаты:** единовременная выплата всей стоимости строящейся квартиры не позднее 3 (трех) календарных дней с момента подписания дольщиком договора создания объекта долевого строительства. Исключительно по соглашению сторон, дольщику, в индивидуальном порядке, может быть предоставлена рассрочка платежей и скидка от общей стоимости квартиры.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства** – 30 единиц.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 02 сентября 2010 г. № 1997 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение горисполкома».

Свидетельство (удостоверение) № 500/727–4427 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007417, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,3848 га, назначение – земельный участок для строительства панельного многоэтажного жилого дома, составленного Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 сентября 2010 г.

Свидетельство (удостоверение) № 500/727–4426 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007416, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,0588 га, назначение – земельный участок для строительства повысительной насосной станции № 2 (по генплану), составленного Республ

Падарожныя нататкі

# НЕКАЛЬКІ ПАРАД ПЕРАД ВАШАЙ ПАЕЗДКАЙ У БАРСЕЛОНУ

Спецыяльны карэспандэнт Глеб ЛАБАДЗЕНКА даведаўся, як чытачам «Звязды» не даць падмануць сябе ў Барселоне

**У Полацку, у славутай келлі святой Еўфрасінні, калі добра прыгледзецца, можна ўбачыць на сценах сапраўднае графіці XVII стагоддзя — так у свой час пазабавіліся навучэнцы Полацкага езуіцкага калегіюма. Кшталту «Тут быў Вася» тысяча шэсцьсот нейкага там года. Калі я прыехаў у Барселону, мне страшна хацелася надрапаць дзе-небудзь нешта падобнае — так доўга я марыў патрапіць сюды. Падумаўшы, я выбраў газетную старонку.**

## Дзве парады перад тым, як вы пойдзеце есці паэлью

Вы ведаеце, што такое паэлья? Калі не, то, напэўна, захочаце даведацца ў першы ж вечар у Барселоне. Будзьце асцярожныя па дзвюх прычынах.

Калі вы ганарыцеся сваім веданнем англійскай мовы, вас лёгка абламаюць барселонскія афіцыянты, якія ў пераважнай большасці размаўляюць толькі па-каталонску (сям-там у Барселоне можна ўбачыць графіці «Каталонія — не Іспанія!»). Калі мы ў першы ж вечар адправіліся каштаваць паэлью, то зрабілі некалькі фатальных памылак. У трэцім ці чацвертым ра ліку бары, стаміўшыся шукаць і не паглядзеўшы меню, мы спыталіся, ці падаюць яны паэлью. Афіцыянткі лыпалі вачыма і катэгарычна не разумелі, што менавіта мы хочам (як высветлілася пасля, гэта быў цырк, бо паэлья так і будзе па-мясцоваму — паэлья). Аднак потым з'явілася старшая афіцыянтка, якая патлумачыла, што паэлі ў меню няма, але яны спецыяльна для нас згатуюць. Расчуленыя такой увагай, мы ўселіся за столік. Першая памылка — мы не спыталіся, колькі гэта будзе каштаваць.

Забягаючы наперад, скажу, што каштавала гэта 60 еўра. Што праўда, паэлья была такога памеру, што 4 чалавекі наеліся ад пуза і яшчэ засталося. Такі вялікі кошт падаўся нам проста абуральным, але, не ведаючы цэнаў, скандал не падымеш. Назаўтра высветлілася, што ў самым цэнтры Барселоны паэлья каштуе ў раёне 12 еўра (яе хопіць на дваіх не вельмі галодных). Гэта першая прычына быць асцярожным.

Другая прычына: згадайце, ці рэагаваў незвычайна калі-небудзь ваш страўнік на ўсялякага роду морапрадукты, якія мы штодзённа практычна не спажываем? Калі сумнівы ёсць — падмацуйце іх мясцовым выразам «паабдымацца з сіньёрам Рока». Roca — гэта вядомая фірма па вытворчасці сантэхнікі, у прыватнасці ўнітазаў.

«Дык што ж такое паэлья?» — нецярпліва спытаеце вы. Гэта патэльня (беларускае вуха адразу разумее, адкуль пайшла назва «паэлья») абсалютна рознага дыяметра (ад памеру талеркі да метра), на якой непасрэдна падаюць страву. Страва не мае пэўнага рэцэпту: гэта асабліва прыгатаваны рыс з морапрадуктамі: крэветкамі, мідыямі, яшчэ нейкімі невядомымі нам жывёлкамі.

А самы танны спосаб паспытаць паэлью я ўжо згадваў у папярэдніх нататках. У некаторых «буфетах» (кавярня, дзе за фіксаваную плату можна браць колькі хочаш і чаго хочаш па прынцыпе «шведскага стала») паэлья стаіць сярод іншых страваў. Каб атрымаць уяўленне, гэтага будзе дастаткова.

Калі вы стаміліся, можна доўга не выбіраць месца для адпачынку.

У кавярнях і рэстарацыях будзьце ўважлівыя і яшчэ з аднае прычыны. На ўваходзе вы пабачыце напісанае крэйдай на спецыяльнай дошцы меню. Там можа быць і паста (макароны па-нашаму), і салацік, і амлет, і нават кавалак мяса. А кошт — вы здзівіцеся — складзе ўсяго 6 еўра (гэта вельмі мала па барселонскіх мерках). Заходзіце, замаўляеце. І вам сапраўды прыносяць і пасту, і амлет, і салацік, і кавалачак курыцы. Але ўсё гэта змяшчаецца на зусім невялікай талерцы. Надоўга такім не наясіся. Плюс да ўсяго ў чэку вы пабачыце не 6 еўра, а ці не ў два разы больш — высвятлюецца, што тут абавязкова замаўляць напой (1,5-2 еўра), з вас узялі 1 еўра за хлеб на стале і ўключылі 1 еўра афіцыянту «на гарбату». Вось вам і танны абед.

Для самых эканомных варта адзначыць, што на ўсіх станцыях метро і ў многіх грамадскіх месцах Барселоны стаяць апараты па продажы ўсялякіх вафелек, напояў і шакаладачак. Некаторыя з іх прадаюць і бутэрброды. Гэта адзін з самых танных спосабаў перахапіць чаго на хаду. Ну вось і ўсё пра ежу, бо не яна галоўная ў Барселоне.

## З турфірмай ці дзікуном?

Многія беларусы лепш пераплацяць у два разы, аднак каб ужо ні пра што не думаць — прывязуць, пакормяць і ўсё пакажуць. Калі такі варыянт для вас — прапускайце гэтую частку.

Смялейшым скажу: не бойцеся ехаць дзікуном. У любым правадніку будуць пазначаныя адрасы ўсіх асноўных помнікаў архітэктуры і цікавостак, часта — разам са станцыяй метро. Калі вы не набылі праваднік у Беларусі — вы набудзеце яго на любой мове проста ў Барселоне, у кожнай турыстычнай краме. Кошты прыкладна як і ў нас — да 8-9 еўра. Бярыце абавязкова такі праваднік, дзе ўжо ёсць гатовыя пяць-сем пешаходных маршрутаў. Усе яны складаюцца па простым прынцыпе: выходзіце на станцыі метро — і наперад, глядзець усялякую прыгажосць.

Барселонскае метро мае 9 ліній і 209 станцый. Пры тым, што Барселона — не сталіца Іспаніі, у жыве тут 1,6 мільёна чалавек. Барселонскае метро пачало працаваць у год нараджэння Васіля Быкава — 1924. Ты з сумам узгадваеш, што ў тваім родным Мінску метро адчынена толькі ў 1984, мае ўсяго дзве лініі і 25 станцый. Затое мінскае метро, скажам, большае за варшаўскае — хоць у польскай сталіцы жыве таксама 2 мільёны чалавек.

Аднак разабрацца ў 209 станцыях барселонскага метро вельмі лёгка — знаходзіце на схеме, на якой лініі патрэбная станцыя, глядзіце, дзе лепш перасесці — астатняе падкажуць указальнікі, якія развешаныя вельмі зручна і ўдала.

Калі вы выбіраеце такі спосаб, лепш за ўсё набываць квіток на метро, які называецца «T-10». Ён каштуе 7,85 еўра і ўключае ў сябе 10 паездак (кожная з іх працягласцю 1 гадзіну 15 хвілін, падчас якіх можна перасаджвацца на іншы транспарт без даплаты). Квіткі трэба набываць у аўтамаце, якія стаяць на ўваходзе ў кожную станцыю. Тыцкаеце на экране пальцам у патрэбны квіток, засоўваеце грошы (бярэ як манеты, так і купюры 5, 10, 20 еўра) — і атрымліваеце квіток. Рэшту апарат выдае, праўда, часам вельмі дробнымі манетамі. Аднаразавыя квіткі каштуюць вельмі дорага — здаецца, 1,30 еўра. Набываць іх варта толькі ў крайнім выпадку. Майце на ўвазе, што штраф за беззбілетны праезд — 50 еўра.

## Гусакі і Пікасо

У Барселоне жылі і працавалі такія вядомыя людзі, як Пабла Пікасо, Жаан Міро, Сальвадор Далі, Антоніа Гаўдзі... Тут і цяпер жывуць Мантсерат Кабалье і Хасэ Карэрас. Аднак нават калі вы не сустрэнеце іх на вуліцы, то таксама знойдзеце, чым заняцца ў Барселоне.

Месцаў, якія варта пабачыць, тут больш чым дастаткова. Такое адчуванне, што каталонцы будавалі ўсё гэта з разлікам, каб кожны турыст прыехаў да іх мінімум двойчы ці тройчы — а там, глядзіш, і прызвычаіцца. Я б падзяліў умоўна ўсе каштоўнасці на дзве групы — Саграда Фаміліа і ўсё астатняе. Пра храм Саграда Фаміліа вы ўжо падрабязна ведаеце з мінулых публікацыяў, пра ўсё астатняе даведаецеся зараз.

Адзін з вашых маршрутаў абавязкова пачнецца са станцыі метро Jaume I. Спачатку вы спытаецеся ў добразычлівых мясцовых гандляроў, як прайсці да музея Пікасо. Пасля наведвання музея вы вернецеся да метро і пойдзеце ў супрацьлеглым ад мора кірунку. Праз якіх метраў 500 па левы бок перад вамі паўстане вялікая плошча, а на ёй — Катэдральны сабор Барселоны.

Катэдра будавалася і перабудоўвалася ажно з XIII стагоддзя, больш-менш была скончаная да XV стагоддзя, але штоніште дараблялася і ў XIX. Нават сёння сабор часткова стаіць у рыштаваннях, што замінае прыгожа яго сфатаграфаваць. Уваход каштуе 5 еўра, але, наколькі я зразумеў, іх можна ахвяроўваць добраахвотна — напрыклад, у мяне ніхто нічога не спытаў на ўваходзе. Кінулася ў вочы драбяза — свечкі перад абразамі і выявамі святых... электронныя. Кідаеш грошы ў апарат (гэта ўвогуле фішка ўсякіх турысцкіх аб'ектаў Барселоны) — і лямпачка, падобная да агню, пачынае «палаць». Мне такая мадэрнізацыя старадаўняга рытуалу прыйшлася недаспадобы. І, відаць, не аднаму мне — бо з паўтары сотні «свечак» гарыць мо чвэрць — хоць людзей тут за дзень бываюць тысячы.

Апроч уласна залы касцёла, не забудзьцеся наведаць славуты ўнутраны дворык, выхад у які знаходзіцца ў правай сцяне. Тут вы пабачыце... 13 жывых гусакоў. Прычым такіх белых-белых, што складаецца адчуванне, што іх старанна мыюць штодня. Гусакі — гэта не свойская птушка святароў, яны знаходзяцца тут як напамін пра патронку Барселоны Святую Яўлапію. Іх белы колер сімвалізуе яе чысціню, колькасць 13 таксама не выпадковая — у столькі год Святую Яўлапію забілі паганцы.

Калі вы выйдзеце з Катэдры і пройдзеце ўлева, у самы кут плошчы, то ўбачыце будынак, фасад якога размаляваны смешнымі чалавечкамі — прыкладна такімі, якіх мы бачылі ў падручніках па гісторыі як узор наскальнага жывапісу першабытных людзей. Такім арыгінальным чынам Пабла Пікасо афарміў мясцовую Калегію архітэктараў.

Далей варыянтаў маршрутаў можа быць некалькі. Паглядзеўшы праваднік, я вырашыў абысці ўсё цікавае, што ёсць у наваколлі. Дык вось, калі вы станеце тварам да роспісаў Пікасо, то за вашаю спінаю пачнецца вузенькая вулачка, якая вядзе ў Гатычны квартал.

Такую назву гэты раён атрымаў у пачатку XX стагоддзя, у часы дыктатара Прыма дэ Рэверы. Пазней назва замацавалася афіцыйна. Гэта — некалькі вуліц і плошчаў, большасць дамоў на якіх збудаваныя ў стылі готыкі і разам уяўляюць каштоўны цэльны ансамбль.

Тут можна пабачыць рэшткі старажытнарымскіх сценаў, Палац Япіскапа, славуты масточак на Япіскапскай вуліцы, якая прывядзе вас на Плаца дэ Сан Жаўмэ. Усяго шмат — гэта вы падрабязна вывучыце ў правадніку. Не прапусціце толькі Плошчу Караля — паводле апокрыфа, менавіта тут каралеўская пара Фердынанд ды Ізабэла сустракалі Хрыстафора Калумба пасля яго вяртання з адкрыцця Амерыкі. Так-так, Калумб таксама быў тутэйшы!..

Жывая скульптура на Рамбле.

## Што такое Рамбла?

На гэтым дадзены пешаходны маршрут можа быць скончаны. Але, ацаніўшы адлегласць да іншых значных цікавостак, я вярнуўся да Калегіі архітэктараў.

За квартал налева ад яе можна выйсці на славутую Рамблу. Пачынаецца яна Плошчай Калумба з высачэзнай калонай-помнікам адкрывальніку Амерыкі. У сярэдзіне калоны ўсталяваны ліфт, на якім можна падняцца, каб пабачыць наваколле. Мая парада — не марнуйце грошы, такая магчымасць будзе ў вас і задарма.

Рамбла — гэта галоўны бульвар Барселоны (адпаведна называецца і галоўны бульвар кожнага тутэйшага горада). На ёй засяроджаны кавярні і рэстараны (цэны ў іх вышэйшыя, чым у іншых месцах), гандляры сувенірамі. Галоўная фішка Рамблы — «жывыя скульптуры», калі самадзейныя акторы намазваюцца грымам і заміраюць у выглядзе якога-небудзь персанажа. Кідаеш ім манетку — і яны адразу «ажываюць», нават могуць прыабняць цябе для фотаздымка. Абапал Рамблы не прапусціце некалькі турыстычных аб'ектаў: Палац Гуэля працы Антоніа Гаўдзі (зараз ён зачынены на рэстаўрацыю), Плошчу Каралёў (не блытайце з Плошчай Караля), славуты рынак Бакерыя. На рынку будзьце асабліва пільныя — многія пішуць, што ў ягоным натоўпе не адзін дзясятак турыстаў развіталіся са змесцівам сваіх кішэняў. Ды і цэны тут значна вышэйшыя, чым па горадзе — што казаць, рынак з'яўляецца турыстычным аб'ектам, а як не зарабіць на турыстах?

Упіраецца Рамбла ў Плошчу Каталоніі, якая займае ажно 50 тысяч квадратных метраў. Ад Плошчы Каталоніі злева ўверх пойдзе Рамбла дэ Каталонія, з якой, арыентуючыся па мапе, вы праз пару кварталаў павернеце направа, на Пасэч дэ Грацыя, каб пабачыць некаторыя дамы Гаўдзі.

Адзін з іх, Дом Батло (ці Батльё), знаходзіцца непасрэдна ля ўваходу ў метро Пасэч дэ Грацыя. Гэты дом яшчэ называюць «домам з костак» — пабачыўшы яго, няцяжка зразумець чаму. Дом Міла — таксама аўтарства Гаўдзі — знаходзіцца вышэй па гэтай вуліцы, на супрацьлеглым баку. Барселонцы неўзабаве пасля пабудовы назвалі дом La Pedrera — каменаломня, за ягоныя масіўныя каменныя сцены, нібыта ён проста высечаны са скалы. На той час дом быў звышсучасны. Гаудзі нават хацеў зрабіць магчымасць пад'езду да кожнай кватэры на аўтамабілі, але фінансавая і гістарычная сітуацыя склалася інакш.

Увогуле, калі глядзець на дамы Антоніа Гаўдзі і трымаць у галаве, што створаныя яны 100 гадоў таму, — дзіву даешся, наколькі прасунутым быў гэты чалавек, наколькі геніяльным і дальнабачным! Гаўдзі ці не першы распрацаваў праект дома з «вольнай планіроўкай» — калі сцены ў сярэдзіне не нясуць нагрузкі, і іх можна перасоўваць і перароблівать на свой капыл. Гэта і зараз звышмодна!.. Сакрэт такой мадэрновасці Гаўдзі знайсці няцяжка: сам архітэктар не хаваў, што большасць ідэяў, формаў і рашэнняў ён «падглядае» ў прыроды. І сапраўды, ягоныя дамы выглядаюць як трапічныя дрэвы з агромністымі лістамі, як зборышча слімакоў і чарапах, як горы і скалы. Адзін з біёграфаў Гаўдзі знайшоў цікавую дэталь: калі Антоніа быў малы, ён меў хворыя ногі, таму большасць часу бавіў ці на прыродзе, ці на пляжы. Так і выйшла: ягоныя пабудовы бы выраблены з пяску, упрыгожаныя алюзіямі самых цікавых раслінаў і жывёл.

Варта адзначыць, што ўсе пабудовы Антоніа Гаўдзі ў Барселоне ўключаныя ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Я не знайшоў на сайце ЮНЕСКА іншага такога выпадку — каб у спіс патрапіў не проста комплекс аднатыпных будынкаў, а менавіта як творы аднаго архітэктара.

## Парк Гуэля і гара Манжуік

Эўсэбі Гуэль быў заможным чалавекам і фундатарам многіх праектаў Антоніа Гаўдзі. Бадай, каб не грошы Гуэля, мы б не мелі многіх шэдэўраў гэтага вялікага майстра. Хоць аканом Гуэля і любіў гаварыць, што «Я напаўняю кішэні Гуэля, а Гаўдзі іх спусташае!»

У 1901 годзе Гуэль вырашыў здзейсніць камерцыйны праект — набыў 15 гектараў зямлі ў зялёнай зоне, каб стварыць там горад-сад і прадаць участкі. Праектаваць аб'ект Гуэль даручыў Антоніа Гаўдзі. Праект праваліўся: з 62 участкаў набылі толькі два. Адзін — адвакат Трыяс-і-Даменек, сябар Гаўдзі, а другі — сам Гаўдзі. Трэці тыповы дом, які мусіў быць узорам для пакупнікоў, сам Гуэль перарабіў пад сваю рэзідэнцыю. На той час парк знаходзіўся занадта далёка ад цэнтра горада, таму барселонцы не спакусіліся на прапанову. Аднак Барселона ўсё адно займела ўнікальны помнік, які сёння вабіць сотні тысяч турыстаў штогод. У дамочку Гаўдзі, дарэчы, цяпер месціцца ягоны музей. Уваход каштуе няшмат, але была такая чарга, што ў сярэдзіну я не патрапіў.

Парк, скажу вам шчыра, перакульвае свядомасць. Вы і не ўяўлялі раней, што з каменю можна рабіць такое — нахіленыя калоны, павільёны з адсутнасцю простых ліній... Пры ўваходзе ў парк вы пабачыце навес, які завецца Залаю ста калонаў. Насамрэч калонаў «усяго» 86. Цікава, што ў сярэдзіне іх знаходзяцца... трубы каналізацыі. А над залай можна пасядзець на славутай звілістай лаўцы. Кажуць, калі Гаўдзі рабіў яе, ён пасадзіў аголеных будаўнікоў на яшчэ сырую гліну, каб спінка прыняла форму чалавечага цела. Лаўка, і праўда, вельмі зручная. Адзначу таксама, што адна з частак парку мае назву, блізкую беларускаму вуху, — «Лысая гара». Сам парк спадкаемцы Гуэля прадалі гарадскім уладам — а тыя арганізавалі тут грамадскі парк.

...Абавязкова падыміцеся на гару Манжуік. Я зрабіў гэта перад самым ад'ездам з Барселоны. І гэта стала такім падсумаваннем: калі ты раптам бачыш перад сабой усё разам, што бачыў спачатку паасобку цягам тыдня. На вяршыні гары знаходзіцца цытадэль. Паводле легенды, яна была збудаваная ўсяго за некалькі тыдняў, перад нападам ворагаў. Гара Манжуік мае 173 метры вышыні. А храм Саграда Фаміліа, паводле схемы Гаўдзі, мусіць у выніку мець 170 метраў. Майстар казаў — «Дзеля таго, каб твор чалавека не ўзвышаўся над творам Бога — гарой Манжуік»

Фунікулёр на гару адпраўляецца са станцыі Paralel. У адзін бок каштуе 6,3 еўра, туды-назад 9 еўра. Калі вы сядзеце на сцяне цытадэлі Манжуік і акінеце вокам Барселону, то не пашкадуеце, што аддалі такія грошы.

І ўвогуле не пашкадуеце, калі дазволіце сабе такую прыемную авантуру як вандроўка ў Барселону. На гэта неабавязкова мець казачныя грошы. Дастаткова разумець, што існуюць рэчы, дзеля якіх варта ехаць за 3000 кіламетраў ад Мінска.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.**

### ШТО ЯШЧЭ ПАГЛЯДЗЕЦЬ У БАРСЕЛОНЕ?

- **Акварыум Барселоны.** Вы апынаецеся ў сярэдзіне 80-метровай трубы, абапал вас будуць плаваць розныя акулы ды іншыя дзівосныя рыбіны. Усяго ў акварыуме 11 тысяч відаў жыхароў, агульны аб'ём акварыумаў — 6 мільёнаў літраў. Уваход каштуе 17 еўра.
- **Парк Лабірынт.** Знаходзіцца на станцыі метро Mundet. Арыенцір — за велаарэнай. З выстрыжаных кустоў двухметровай вышыні там створаны вялікі лабірынт, з якога з першага разу можна і не выйсці...
- **Гара Цібідаба.** На ёй знаходзіцца Храм Святога Сэрца Хрыста з фігурай Збаўцы наверсе, якую бачна з усяе Барселоны.
- **Іспанская вёска.** Знаходзіцца непадалёк ад плошчы Іспаніі. Тут сабрана 116 хат, палацаў і храмаў з рознай эпохі. Гэта скансэн, музей пад адкрытым небам, як у Строчыцах пад Мінскам. Тут знаходзіцца таксама горад майстроў з процьмай арыгінальных сувеніраў.
- **Музычна-светлавыя фантаны на гары Манжуік.** Працуюць яны некалькі разоў на тыдзень з 20 да 24 гадзінаў. Відовішча вельмі прыгожае!


Дом Батло.

### МАЙ НА ЎВАЗЕ

- Самы просты спосаб пабачыць усе каштоўнасці Барселоны за дзень-два — турыстычны аўтобус. Квіток каштуе, здаецца, 24 еўра на адзін дзень і 29 еўра на два дні. Тры аўтобусныя лініі спланаваныя так, каб ахапіць усе папулярныя турыстычныя месцы Барселоны. Аўтобус пачынае працаваць у 9 гадзін раніцы, заканчвае ў 20 гадзін. Ён робіць прыпынкі каля кожнага цікавага месца. Можна праехаць усё адразу, а можна выйсці і праз паўгадзіны сесці на наступны. Квіток дае права выходзіць і заходзіць колькі заўгодна разоў за час яго дзеяння.
- Памятайце, што ў іспанцаў ёсць сіеста. Гэта значыцца, што крамы і кавярні працуюць зранку да 13 ці 14 гадзінаў, а пасля робяць перапынак на сіесту («пасляабедзенны кароткі адпачынак») да 16-17 гадзін.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.56 | 19.06 | 12.10 |
| Віцебск — | 6.46 | 18.56 | 12.10 |
| Магілёў — | 6.46 | 18.56 | 12.10 |
| Гомель — | 6.43 | 18.53 | 12.10 |
| Гродна — | 7.12 | 19.22 | 12.10 |
| Брэст — | 7.13 | 19.22 | 12.09 |

### Месяц

*Поўня ў 12.18.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Андрэя, Васіля, Глеба, Івана, Канстанціна, Мікалая, Паўла, Пятра, Яўгена.*

***К.*** *Тэклі, Багуслава.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

**Па гарызанталі:** 1. Марка сусветнавядомага айчыннага трактара. 4. «З каласкоў ...-\\ Маладосці сведка». З верша Янкі Купалы «Жняя». 7.... не мясная, а восень не малочная (прык.). 8. У час жніва вельмі паважаная асоба на палявым стане. 10. Ніткападобныя атожылкі на сцёблах збожжавых. 11. Сухі марац, мокры май — будзе каша й ... (прык.). 12. Прыйшоў трэці ... — бяры рукавіцы ў запас (прык.). 15. Не заўсёды карова тым бокам чэшацца, дзе яе ... кусае (прык.). 16. Воцат не гарэлка, а кум не ...(прык.). 17. Красна поле снапамі, а ...— умалотам (прык.).19. Прысвятак беларускага народнага календара, які адзначаўся 3-га кастрычніка. 22. ... збірае, а зіма паядае (прык.). 23. Невялікі стракаты матыль. 26. Горад на Беларусі, дзе Дажынкі святкавалі ў 2008 годзе. 29. Баран стаіць, воўна дрыжыць (заг.). 30. Няма хлеба і сала — і ...стала (прык.). 31. «Тым часам Спас святы мінуўся, \\ І лес у ... апрануўся». З паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». 32. Вышэйшая ступень задавальнення (ад завяршэння жніва і інш.).

**Па вертыкалі:** 1.«Вось і паляна, \\ і сам ...». З верша Анатоля Вялюгіна «Грыбы». 2. Каню... лепш ад аўса (прык.). 3. Каўбаса — ..., а капуста — страва (прык.). 4. Рэчыва белага колеру, якое ўносіцца ў кіслую глебу. 5. Засеянае поле. 6. «Наспяліўся шнурок, \\ Б'е паклон ... ». З верша Янкі Купалы «Зажынкі». 7. Увосень — работ ... (прык.). 9. Невялічкі караняплод. 13. Свабода, раздолле. 14. Рэшта. 17. Рыба сямейства карпавых з тоўстай галавой. 18. Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне ...(прык.). 20. Вялікая сцірта снапоў, саломы, сена. 21. Жыта і ... — то богава пашніца (прык.). 24. «Вецер хмары так і гоніць , \\ Дождж, і ..., і галалёд». З верша Якуба Коласа «Асенні вечар». 25. Снапочак к снапочку, дык цэлая ... (прык.). 27. Па восені і ў кошкі ляпёшкі, і ў вераб'я ... (прык.). 28. Крупяная ... Абрадавая страва на дажынкі ,каб на наступны год урадзіла жыта.

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (14 верасня). Па гарызанталі:** Абцугі. Аперацыя. Гэбель. Траса. Марка. Хор. Рабро. Узор. Малаток. Ван. Апала. Офіс. Тарзан. Алі. Даярка. Мус. Мат. Ева. Бурун. Ціскі. Лён. Арэх. Альпака. Удава. Упор. Ліра. Крызіс. Палонка. **Па вертыкалі:** Сантыметр. Ацэтылен. Муляр. Засека. Рытуал. Вір. Гага. Ніша. Тарка. Хадулі. Збор. Апіс. Амбра. Твор. Полюс. Арап. Ахова. Бал. Баку. Руно. Формула. Гоні. Канёк. Сват. Нажоўка.

**Сканворд (15 верасня). Па гарызанталі:** Зніч. Бэз. Меса. Бунт. Адзежа. Нара. Люлька. Одум. Мазь. Карачы. Самадур. Лаза. Дума. Нюк. Алабама. «Атас». Сляб. Кабатаж. Анапест. Рагу. Лада. Камар. Асака. Радавод. Лена. Хурултай. Нікель. **Па вертыкалі:** Герб. Узда. Аналы. Зязюля. Толь. Акаба. Турку. Авал. Лебедзь. Парад. Абед. Сала. Змена. Салавей. Ежа. Такт. Кон. Сарока. Ладан. Чага. Адам. Паб. Урад. Тара. Амаду. Атам. Чум. Сага. Вырай. Журавель.

## Усміхнемся!

**Сёння споўнілася 10 гадоў, як з Маскоўскага заапарка пачала ўцякаць чарапаха...**

☺

Экскурсавод:

— А вось, таварышы, стаянка старажытных людзей!

— А дзе іх старажытныя машыны?

☺

**Сіноптыкам, якія навучыліся ўмела маніпуляваць словам «месцамі», атрымалася дасягнуць практычна стапрацэнтнай дакладнасці прагнозаў надвор'я.**

☺

— Туры ў Амерыку ад 3 тысяч да 100 долараў.

— А чаму такая розніца?

— У першым выпадку леціце самалётам, у другім — плывяце караблём.

— Усё адно розніца завялікая.

— Грэбці будзеце самі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4648 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12